Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ВЕРАСНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 168
(26281)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Віншаванне Прэзідэнта з Днём беларускага пісьменства

УДЗЕЛЬНІКАМ І ГАСЦЯМ УРАЧЫСТАСЦЯЎ ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з Днём беларускага пісьменства.

Гэта святочная дата трывала ўвайшла ў наша жыццё, атрымала дзяржаўны статус і прызнанне народа, таму што плённа спрыяе духоўнаму, культурнаму, сацыяльнаму развіццю Беларусі. Нагадваючы пра годнае мінулае, дазваляе з надзеяй глядзець у будучыню.

Невыпадкова сёлета эстафету ўрачыстасцяў прымае заснаваны яшчэ напачатку XII стагоддзя Барысаў — адзін са старажытных культурных цэнтраў нашай краіны, горад, з якім звязаны многія значныя падзеі беларускай гісторыі.

Упэўнены, што Дзень беларускага пісьменства з'явіцца важнай падзеяй у культурным жыцці Беларусі, паспрыяе далейшай кансалідацыі насельніцтва рэспублікі на трывалым падмурку высокіх духоўных каштоўнасцяў, закладзеным славутымі продкамі.

Шчыра жадаю ўсім арганізатарам, удзельнікам і гасцям свята моцнага здароўя, дабрабыту, шчасця, аптымізму і новых здзяйсненняў на карысць Радзімы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ПА СКАРЫНАВЫМ БАЛЬШАКУ

Францыск СКАРЫНА — беларускі першадрукар. г. Полацк.

Помнік Пятру МСЦІСЛАЎЦУ ў Мсціславе.

Помнік Кірылу ТУРАЎСКАМУ ў Тураве.

Помнік Сімяону ПОЛАЦКАМУ ў Полацку.

Помнік князю Барысу ў Барысаве.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КРАІНЫ — ЧЛЕНЫ АДКБ ЗАКЛІКАЮЦЬ ДА АБ'ЕКТЫЎНАЙ АЦЭНКІ СІТУАЦЫІ Ў КАЎКАЗСКІМ РЭГІЁНЕ

Дзяржавы — члены АДКБ глыбока занепакоены зробленай Грузіяй спробай сілавога рашэння канфлікту ў Паўднёвай Асеціі, якая прывяла да шматлікіх ахвяраў сярод мірнага насельніцтва і міратворцаў, а таксама пацягнула за сабой цяжкія гуманітарныя наступствы.

Фота БЕЛТА.

Аб гэтым гаворыцца ў дэкларацыі, прынятай на Маскоўскай сесіі Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

У дакуменце адзначаецца, што краіны — удзельніцы АДКБ занепакоены нарошчваннем ваеннага патэнцыялу і эскалацыяй напружанасці ў Каўказскім рэгіёне і заклікаюць усе дзяржавы ўважана і аб'ектыўна, без двайных стандартаў, падысці да ацэнкі сітуацыі, не прымаць дзеянняў, здольных справакаваць яе далейшае абвастрэнне.

«Удзельнікі Арганізацыі, якія паслядоўна выступаюць за забеспячэнне міру і бяспекі, вяршэнства міжнароднага права ў міждзяржаўных адносінах, вітаюць выпрацаваныя Прэзідэнтам Расіі і Прэзідэнтам Францыі прынцыпы ўрэгулявання, а таксама заклікаюць бакі да іх няўхільнага выканання ў мэтах недапушчэння новых спробаў сілавога вырашэння канфлікту, забеспячэння стабільнасці ў дадзеным рэгіёне», — гаворыцца ў дэкларацыі.

У дакуменце таксама падкрэсліваецца, што дзяржавы — члены АДКБ падтрымліваюць актыўную ролю Расіі ў садзейнічанні міру і супрацоўніцтву ў рэгіёне і выступаюць за забеспячонне трывалай бяспекі для Паўднёвай Асеціі і Абхазіі.

Марта АСТРЭЙКА, БЕЛТА.

Беларускія прадпрыемствы на працягу 2-3 гадоў павінны поўнасцю перайсці на энергаэфектыўныя тэхналогіі

Такую задачу паставіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на нарадзе ў Смаргонскім райвыканкаме.

Кіраўнік урада падкрэсліў, што рост сусветных цэнаў на энергарэсурсы патрабуе правядзення ў рэспубліцы пастаяннай работы па энергазберажэнні і павышэнні эфектыўнасці вытворчасці.

Да 2010 года энергаёмістасць ВУП у рэспубліцы плануецца знізіць не менш як на 31 працэнт (адносна 2005 года), да 2015 года — на 50 працэнтаў, да 2020 — на 60 працэнтаў. «Задача каласальная, і яе неабходна вырашыць, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Неабходна ў кароткія тэрміны дасягнуць максімальных паказчыкаў па энергазберажэнні». Паводле слоў Сяргея Сідорскага, у гэтым годзе зніжэнне энергаёмістасці ВУП складае 7,2 працэнта, аднак пакуль што энергазатраты на беларускіх прадпрыемствах застаюцца ў паўтара-два разы вышэйшыя ў параўнанні з еўрапейскімі вытворцамі.

Асаблівую ўвагу на нарадзе Сяргей Сідорскі ўдзяліў пытанням уключэння ў гаспадарчы абарот дзяржмаёмасці, якая не выкарыстоўваецца, — такіх аб'ектаў у рэспубліцы налічваецца амаль 12,5 тыс. Гэта праблема павінна вырашацца, зыходзячы з двух асноўных аспектаў — прыцягнення дадатковых інвестыцый на прадпрыемствы і навядзення поўнага парадку на зямлі. Сяргей Сідорскі падкрэсліў, што для патэнцыяльных інвестараў павінны быць створаны максімальна спрыяльныя ўмовы.

БЕЛТА.

Мінфін ЗША на паўгода змякчыў санкцыі адносна прадпрыемстваў «Лакафарба» і «Полацк-Шкловалакно»

Міністэрства фінансаў ЗША на паўгода змякчыла эканамічныя санкцыі адносна двух беларускіх прадпрыемстваў — «Лакафарба» і «Полацк-Шкловалакно», паведамляецца на афіцыйным сайце Мінфіна ЗША. «Пачынаючы з 4 верасня 2008 года, усе камерцыйныя аперацыі паміж рэзідэнтамі ЗША і ААТ «Лакафарба» і (або) ААТ «Полацк-Шкловалакно» дазволены на перыяд 180 дзён да 2 сакавіка 2009 года», — гаворыцца ў паведамленні. 13 лістапада 2007 года Мінфін ЗША ўвёў санкцыі эканамічнага характару адносна канцэрна «Белнафтахім». У сакавіку 2008 года былі апублікаваны ўдакладненні, згодна з якімі пад дзеянне санкцый падпадалі прадпрыемствы, доля «Белнафтахіма» ў якіх складае 50 працэнтаў і больш.

БЕЛТА.

Жыхарам горада Наваполацка

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас са святам — 50-годдзем горада.

За кароткі гістарычны перыяд на старажытнай полацкай зямлі вырас сучасны прамысловы і культурна-адукацыйны цэнтр, які ўвабраў у сябе лепшыя традыцыі гэтага ўнікальнага рэгіёна Беларусі.

Выкарыстоўваючы накоплены патэнцыял, энтузіязм і працавітасць гараджан, Наваполацк працягвае інтэнсіўна расці і развівацца, ствараць камфортныя ўмовы пражывання для насельніцтва, радаваць поспехамі ў розных сферах дзейнасці, умацоўваць дзелавыя і сяброўскія сувязі з гарадамі-пабратымамі ў Расіі і далёкім замежжы.

Няхай і ў далейшым вашы дасягненні будуць яркім прыкладам плённай працы на карысць любімай Айчыны.

Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, радасці і шчасця.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

НА ВЫХАДНЫЯ — МАЛАДОЕ БАБІНА ЛЕТА, А З АЎТОРКА ІСТОТНА ПАХАЛАДАЕ

У апошнія дні тыдня тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца ў зоне павышанага ціску, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў. Таму ў суботу невялікія кароткачасовыя дажджы і навальніцы чакаюцца месцамі толькі па поўначы краіны. Вецер паўднёва-заходні 4—9 м/с, пры навальніцах да 14 м/с. Тэмпература паветра 23—28, па поўдні да 30 градусаў.

У нядзелю ападкаў не прадбачыцца, толькі ўдзень па паўночным усходзе магчымыя кароткачасовыя дажджы. Тэмпература ўначы 13—19, удзень 26—32 градусы. У панядзелак захаваецца цёплае і сонечнае надвор'е.

А вось з аўторка надвор'е радыкальна зменіцца. Тады праз тэрыторыю Беларусі пачне рухацца даволі халодны актыўны атмасферны фронт з боку Балтыкі. Істотна пахаладае, стане дажджліва і воблачна. Тэмпература паветра ўначы 4—11, удзень 11—18 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, прыкладна праз 10 дзён у нашу краіну завітае антыцыклон з боку поўдня Еўропы, які прынясе да нас другое сапраўды бабіна лета.

Сіноптыкі падлічылі, што ў верасні сярэднясутачная тэмпература будзе на 1—2 градусы вышэй за норму (норма — 11—13 градусаў). Ападкаў будзе каля 90 працэнтаў ад нормы, якая складае 50—71 міліметр.

Сяргей КУРКАЧ.

КОШТ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ МОЖА ПАВЯЛІЧЫЦЦА НА 10—12 ПРАЦЭНТАЎ?

Версіі

Як паведамлялася раней, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў № 1245 з 1 верасня па 30 лістапада гэтага года ўводзіцца павышаючы каэфіцыент 1,44 да тарыфных ставак работнікаў падрадных будаўнічых арганізацый, занятых на аб'ектах жыллёвага будаўніцтва. Паведамлялася, што затраты будуць уключацца ў акты выкананых работ, што пацягне за сабой падаражанне жылля на пярвічным рынку.

Спецыялісты Мінбудархітэктуры адзначылі карэспандэнту «Звязды», што наўскідку новы механізм аплаты працы будаўнікам можа выклікаць падаражанне будаўніцтва жылля ў Беларусі прыкладна на 10—12 працэнтаў. Суразмоўца газеты паведаміў, што канкрэтныя лічбы падаражання стануць вядомыя не раней чым праз месяц, калі будзе дакладна падлічаны сабекошт будаўніцтва жылля, улічваючы павышаючы каэфіцыент да тарыфных ставак.

Эксперт упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі ўдакладніў, што дадзеная норма прынята Саветам Міністраў на 3 месяцы ў якасці эксперыменту. На думку распрацоўшчыкаў новаўвядзення, такое рашэнне павінна паспрыяць прытоку кваліфікаваных кадраў, павялічыць якасць і прадукцыйнасць працы ў сферы жыллёвага будаўніцтва. Разам з тым, калі плюсы ад увядзення новай формы аплаты працы будаўнікоў будуць мінімальнымі, то эксперымент прызнаюць адмоўным і павышаючы каэфіцыент будзе перагледжаны ці ўвогуле адменены.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯНУКОВІЧ ВЫСТУПІЎ ЗА РЭФОРМУ, ЯКАЯ АБМЯЖУЕ ЎЛАДУ ПРЭЗІДЭНТА

Напярэдадні з падобнымі заявамі выступіла прэм'ер-міністр Юлія Цімашэнка. Лідар Партыі рэгіёнаў Віктар Януковіч пацвердзіў сваю гатоўнасць узяць удзел у чарговай прэзідэнцкай кампаніі і заявіў, што готовы супрацоўнічаць з усімі адказнымі палітычнымі сіламі. Ён паўтарыў, што Украіна павінна прызнаць Паўднёвую Асецію і Абхазію, а спробы сілком загнаць краіну ў НАТА асуджаныя на правал.

АЗЕРБАЙДЖАН НЕ ПАДТРЫМАЎ ПРАЕКТ ГАЗАПРАВОДА NABUCCO У АБЫХОД РФ

Віцэ-прэзідэнт ЗША Дзік Чэйні завяршыў турнэ па Закаўказзі, якое было заклікана ўмацаваць пазіцыі Вашынгтона ў барацьбе за каспійскія энерганосьбіты. Але калі ў Тбілісі ўсё прайшло гладка, то ў Баку перамовы скончыліся правалам.

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў даў зразумець Чэйні, што Азербайджан не будзе падтрымліваць ідэю перанакіраваць плыні энерганосьбітаў у абыход Расіі. Чэйні, які ўпершыню апынуўся ў Баку, не сустракалі ні прэзідэнт, ні нават прэм'ер. Аліеў не спяшаўся прыняць Чэйні, у рэзідэнцыю прэзідэнта Азербайджана віцэ-прэзідэнт ЗША патрапіў ужо бліжэй да вечара.

Як паведамілі крыніцы ў апараце азербайджанскага прэзідэнта, перамовы аказаліся даволі цяжкімі, хоць Чэйні і Аліева звязваюць даверлівыя адносіны яшчэ з таго часу, калі першы працаваў у Halliburton, а другі быў віцэ-прэзідэнтам дзяржнафтакампаніі Азербайджана. Гаворка ішла аб вайне ў Грузіі і перспектывах будаўніцтва газапровада Nabucco. Паводле некаторай інфармацыі, Дзік Чэйні паведаміў Ільхаму Аліеву, што ЗША будуць цвёрда падтрымліваць сваіх саюзнікаў у рэгіёне і маюць намер і далей прасоўваць транскаспійскі газапровад у абыход Расіі. Аднак Аліеў даў зразумець, што, хоць і цэніць адносіны з Вашынгтонам, сварыцца з Масквой не збіраецца. Баку не будзе фарсіраваць рэалізацыю праекта Nabucco. Як паведамілі ў апараце прэзідэнта Азербайджана, Чэйні быў так раздражнёны вынікамі гутаркі, што нават адмовіўся наведаць урачыстую вячэру ў свой гонар.

У РАСІІ ЗАБАРОНЕНЫ ПРОДАЖ 92-ГА БЕНЗІНУ

У пятніцу ўступіў у сілу тэхнічны рэгламент, які забараняе з 1 студзеня 2009 года вытворчасць у Расіі бензіну з актанавым лікам меней за 95.

Таксама ўводзіцца графік пераходу на стандарты «Еўра-3», «Еўра-4» і «Еўра-5». Аднак, нафтавікі не гатовыя да новых стандартаў, і, магчыма, забарона будзе адкладзена.

ISSN 1990 - 763X

СМАГА ДАНЯЛА

Жыхар в. Семенча Пружанскага раёна, якому ўжо даводзілася красці, зайшоў у палове шостай раніцы ў магазін па вул. Шырмы, што ў райцэнтры, і адкрыта ўзяў 6 бутэлек піва. Праўда, выпіць не паспеў, бо міліцыя была побач.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Лілія АНАНІЧ: Да Дня беларускага пісьменства

«Размова ідзе пра своеасаблівы агляд дасягненняў кнігавыдавецтва, нацыянальнай культуры, пра нашу сувязь з багатым духоўным гістарычным мінулым...»

Заўтра, у нядзелю, Барысаў запрашае гасцей на пятнаццатае па ліку агульнанацыянальнае свята — Дзень беларускага пісьменства. Сур'ёзны сучасны прамысловы цэнтр з больш як 900-гадовай гісторыяй, Барысаў пераймае эстафету ў такіх слаўных гарадоў Беларусі, як Полацк, Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаў, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў.

Дзень беларускага пісьменства — адна з вялікіх культурных, гістарычных, духоўных падзей у жыцці не толькі творчай, пісьменніцкай ці навуковай эліты, але ў цэлым нацыі. Ва ўсякім разе, характар і разнастайнасць запланаваных у гонар Дня мерапрыемстваў, гаворыць за тое, што апошні смела можна назваць свянам кожнай беларускай сям'і, звычайных татаў-мамаў і іх дзяцей. Што датычыцца апошніх, то ўжо сёння, напрыклад, у барысаўскай гімназіі № 1 і СШ № 15 адбываецца дзіцячае свята «Свет — у тваіх руках!»...

Падрабязней аб падзеях, дзеля якіх у цудоўнае, як абяцаюць сіноптыкі, надвор'е, варта было б здзейсніць падарожжа на барысаўскую зямлю, расказвае першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ.

— Лілія Станіслававна, скажыце, калі ласка, дзеля чаго таму ж мінчаніну варта было б пакінуць сталіцу і прыехаць заўтра ў Барысаў, што знаходзіцца ў непасрэднай бліскасці ад Мінска?

— Я думаю, мінчане ці жыхары іншых гарадоў прыедуць у Барысаў не таму, што ён блізкі да сталіцы, а таму, што ў беларускім грамадстве ёсць, з аднаго боку, цікавасць да сваёй гісторыі і культуры, а з іншага, — неабходнасць дэманстрацыі сваёй далучанасці да значных падзей у жыцці краіны. Акрамя таго, беларускае грамадства, на мой погляд, з'яўляецца ўжо ў пэўнай ступені матэрыяльна трывалым, і патрэбы сучаснага беларуса значна больш высокія, чым проста добра паесці... Імкненне браць удзел у такіх мерапрыемствах сімвалізуе кансалідацыю беларускага грамадства.

Размова ідзе пра своеасаблівы агляд дасягненняў кнігавыдавецтва, нацыянальнай культуры, пра нашу сувязь з багатым духоўным гістарычным мінулым. Думаю, такое свята — важкі ўклад у стварэнне моцнай і квітнеючай дзяржавы. Нагадаю, што праводзіцца яно ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.03.1998 «Аб дзяржаўных святах і святочных днях у Рэспубліцы Беларусь» штогод у першую нядзелю верасня.

Свята пісьменства не абмяжоўваецца, дарэчы, адным днём, — яно ўжо крочыць па краіне. У сераду ў Кафедральным саборы з праслаўлення Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Мінскага і Слуцкага Філарэта рушыла навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з нязгаснай лампадай духоўнасці, дабратворным агнём ад Гроба Гасподняга. Экспедыцыя пройдзе па маршруце Баранавіцкага, Шчучынскага, Дзятлаўскага і Барысаўскага раёнаў. Пісьменнікі, дзеячы культуры і мастацтва сустрэнуцца ў школах, клубах Міншчыны і Гродзеншчыны з творчай інтэлігенцыяй і моладдзю.

На сёння запланавана правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі «Барысаўскія чытанні», арганізатарам якой выступае Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Прысвечаная барысаўскаму рэгіёну канферэнцыя аб'яднае вакол сябе не толькі масцітых навукоўцаў, але і старшакласнікаў мясцовых школ — моладзь, якая актыўна цікавіцца гістарычнымі пытаннямі, мінулым роднага краю...

На Барысаўшчыне, дарэчы, шмат цікавых мясцін, ёсць свае загадкі і адметнасці, аб якіх можна даведацца з найноўшых выданняў. Так, выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла акурат да Дня пісьменства кнігу «Барысаўшчына літаратурная»...

— А якія відовішчы павінны запомніцца не толькі беларусам, але і расійскім гасцям — удзельнікам прэс-тура, што наведаюць у гэты дзень Барысаў?

— Упершыню сёлета ў нагоды своеасаблівага юбілею адбудзецца фестываль сталіц-гарадоў — усіх дванаццаці, якія мелі гонар прымаць дні беларускага пісьменства. Кожны горад прыедзе са сваімі творчымі набыткамі, цікавай канцэртнай праграмай, якая разгорнецца каля Палаца культуры на ўвесь дзень.

Адбудзецца адкрыццё знака-сімвала «Да 15-годдзя святкання Дня беларускага пісьменства». Размешчаны ў абноўленым градскім парку, сімвал будзе нагадваць мясцовым жыхарам і гасцям аб важкім укладзе гэтага горада ў развіццё свята беларускага пісьменства.

Парадуюць наведвальнікаў і шматлікія выставы, прысвечаныя сучаснай беларускай кнізе, гісторыі беларускага кнігадрукавання. Думаю, што сёння наогул грамадства дэманструе вялікую цікавасць да кнігі. І таму Міністэрства інфармацыі з задавальненнем дае магчымасць не толькі ўбачыць выставачныя экзэмпляры, але і набыць тое, што будзе прапанавана для шырокага гандлю.

Нарэшце, па традыцыі ва ўрачыстых абставінах будуць уручаны ўзнагароды пераможцам рэспубліканскага конкурсу на лепшы твор у гатліне паэзіі, прозы, драматургіі, літаратурнай крытыкі, дзіцячай літаратуры, публіцыстыкі, перакладу, сатыры і гумару, дэтэктыўнага і песеннага жанраў «Залаты фаліянт», а таксама за лепшы літаратурны твор па лініі Саюза пісьменнікаў «Залаты купідон».

Цікавую і насычаную канцэртную праграму забяспечаць лепшыя творчыя калектывы не толькі Міншчыны і Барысаўшчыны, але і ўсіх рэгіёнаў рэспублікі. Ад імя арганізатараў магу запэўніць, што той, хто прыедзе на свята, — не пашкадуе.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ОАО «Нерудпром» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже транспортных средств:

№ лота	Наименование и технические характеристики	Начальные цены с НДС, бел. руб.
1	Полуприцеп «ОДАЗ 9370» (1991 г.в., бортовой, 2-осный, 2-скатный	3 120 000
2	Погрузчик ПК- 6 (1992 г.в., г/п 6 т)	64 730 400
3	Бульдозер ДЭТ-250 (в экспл. с 1988 г.)	134 134 400
4	Экскаваторы МТП-71б (в экспл. с 1990 г.)	50 743 200
5	Экскаваторы Э-2503 (в экспл. с 1970 г.)	197 916 800
6	Экскаваторы Э-2503 (в экспл. с 1970 г.)	197 916 800

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.07.2008 г. Аукцион состоится **23.09.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

Парламенцкі дзённік

«НУЛЯВОЕ» ЧЫТАННЕ

Дэпутаты ўжо аналізуюць праект бюджэту краіны на наступны год і змены ў падаткаабкладанні

Парламентарыі атрымалі адпаведныя законапраекты і прыступілі да іх разгляду. Чакаецца, што выпрабаванне першым чытаннем у Авальнай зале гэтыя нарматыўна-прававыя акты пройдуць ужо на адкрыцці восеньскай сесіі — 2 кастрычніка. Пакуль жа адбылося імправізаванае «нулявое» чытанне. Так кіраўнік ніжняй палаты парламента Вадзім Папоў назваў абмеркаванне гэтых дакументаў на сумесным пасяджэнні ўсіх пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў.

Налета 170 млрд рублёў з бюджэту плануецца выдзеліць на будаўніцтва АЭС

Выступаючы перад дэпутатамі, намеснік міністра фінансаў Беларусі Уладзімір Амарын запэўніў, што ў краіне распрацаваны шэраг мераў па зніжэнні падатковай нагрузкі. У прыватнасці ў 2009 годзе чакаецца «палёгка» ў памеры прыблізна двух трыльёнаў рублёў. Гэтыя сродкі застануцца ў распараджэнні падаткаплацельшчыкаў і, паводле слоў Уладзіміра Амарына, стануць дадатковым фактарам павышэння канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў на знешніх рынках, крыніцай уласных абаротных сродкаў прадпрыемстваў і інвестыцый. Тэндэнцыя да зніжэння падатковай нагрузкі захаваецца і ў 2010 годзе:

— Плануецца поўнасцю адмовіцца ад збораў у рэспубліканскі фонд падтрымкі сельгасвытворцаў, мэтавых збораў з прыбытку — маецца на ўвазе мясцовыя мэтавыя зборы, падатку на набыццё аўтатранспартных сродкаў, — прааінфармаваў намеснік міністра.

Ён таксама агучыў прагнозы, паводле якіх да канца 2010 года ў Беларусі застанецца 27 падатковых плацяжоў. Уладзімір Амарын зрабіў акцэнт на тым, што рэгулярна аплачваемых сярод іх толькі восем. Астатнія ж будуць аплачвацца ў залежнасці ад сумарнага даходу грамадзяніна) увесці лінейную адзіную стаўку ў памеры 12 працэнтаў. І, як удакладніў Уладзімір Амарын, стаўка гэта будзе прымяняцца і да даходаў, атрыманых не па месцы асноўнай працы (на сёння яна складае 15 працэнтаў). Яшчэ адна прыемная навіна: даходы ў памеры бюджэту пражыткавага мінімуму (мяркуецца, у 2009 годзе ён складзе 250 тыс. беларускіх рублёў) наогул не будуць абкладацца падаходным падаткам. Аналагічнай палёгкай змогуць карыстацца і тыя грамадзяне, чый сярэднямесячны даход не перавышае 1,5 млн рублёў.

Што да бюджэту краіны на 2009 год, то чаканы дэфіцыт складзе 2,8 трлн рублёў (1,8 працэнта да ВУП). Намеснік міністра дадаткова адзначыў «высокую сацыяльную скіраванасць бюджэту». Сярод прырытэтаў расходаў краіны ён назваў рост заробкаў у бюджэтнай сферы (да 550 долараў ЗША да канца наступнага года), сацыяльную падтрымку грамадзян. Істотна павялічыцца фінансаванне дзейнасці па ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай аварыі, запланаваныя траты на газіфікацыю, водазабеспячэнне, стварэнне транспартнай інфраструктуры на забруджаных тэрыторыях.

Расходная частка ўлічвае таксама рост цэнаў на тыя энерганосьбіты, што імпартуюцца ў краіну. «У 2009 годзе будзе працягнутая бюджэтная падтрымка прадпрыемстваў па стрымліванні тарыфаў на аплату электрычнай і цеплавой энергіі ва ўмовах росту цэнаў на энерганосьбіты», — паведаміў Уладзімір Амарын. І ўдакладніў, што на гэтыя мэты будзе выдаткавана 750 млрд рублёў. Закладзеныя ў бюджэце і выдаткі на будаўніцтва АЭС — у памеры 170 млрд рублёў.

Ала МАЧАЛАВА.

Нафтавікам – ад музыкантаў

Заслужаны калектыў «Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі» віншуе нафтавікоў з Днём работнікаў нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці.

6 верасня Заслужаны калектыў «Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі» пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга падорыць сваю творчасць працаўнікам Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. Выступленне будзе прысвечана Дню работнікаў нафтавай, газавай і паліўнай прамысловасці.

Вось ужо больш як 20 гадоў Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі і калектыў Мазырскага НПЗ звязваюць цесныя шэфскія ўзаемаадносіны.

«Нашы сустрэчы – гэта знак павагі чалавека працы, яркі прыклад багатага творчага патэнцыялу Беларусі, яны садзейнічаюць наладжванню ўзаемаразумення ў грамадстве і прапагандзе нацыянальнага мастацтва», — адзначае мастацкі кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіл Фінберг.

Крымінал, здарэнні

ФІКТЫЎНАЯ БУХГАЛТЭРЫЯ

Зламыснікі кралі грошы, выдзеленыя з дзяржбюджэту для выплаты зарплаты работнікам дзіцячых садкоў, сярэдніх і спартыўных школ

Размова — пра 8 былых супрацоўнікаў цэнтралізаванай бухгалтэрыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска, у дачыненні да якіх Галоўным следчым упраўленнем папярэдняга расследавання МУС ужо завершана расследаванне крымінальнай справы.

Паводле інфармацыі часова выконваючага абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алега Слепчанкі, сваю чорную справу згаданыя супрацоўнікі рабілі ў перыяд з 2004 па 2007 год. Што ж датычыцца механізму крадзяжу, то ён быў наступным. У афіцыйныя бухгалтарскія дакументы, у тым ліку, у спіскі на залічэнне зарплаты (плацежныя ведамасці), уносіліся заведама несапраўдныя звесткі аб асобах і грашовых сумах, якія належаць выплаце. Фіктыўныя спісы на залічэнне зарплаты, ордэры, плацежныя даручэнні і іншыя афіцыйныя дакументы прадстаўляліся ў філіял банка, а грошы пералічваліся на карт-рахункі зламыснікаў, якія абнаяўлівалі іх у банкаматах. Між іншым, на карт-рахункі саўдзельнікаў незаконна налічвалася ад 100 тысяч да 8 мільёнаў рублёў кожны месяц. А ўсяго такім чынам прайдзісветам удалося «зарабіць» каля 310 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, як адзначаюць у міністэрстве, абвінавачаныя, каб схаваць крадзеж, неабгрунтавана залічвалі грошы на карт-рахункі іншых 14 супрацоўнікаў бухгалтэрыі — усяго на агульную суму 12 570 520 рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

НАРКОТЫКІ Ў МЕТРО...

Больш як на 10 мільёнаў рублёў па цэнах «чорнага» рынку дурману канфіскавана ў 22-гадовага сталічнага жыхара.

Між іншым, арыштаваны ён быў за крадзеж. А вось у ходзе вобыску ў яго на месцы жыхарства і было знойдзена 1,4 кілаграма высушанай марыхуаны. Яшчэ адна крымінальная справа ўзбуджана ў дачыненні да 27-гадовага мінчаніна, якога затрымалі ў мінскім метрапалітэне на станцыі «Пушкінская»: пры сабе ён меў каля 1,2 кілаграма высушанай макавай саломкі.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

Утерянное **удостоверение инвалида II группы,** выданное на **имя Цотниашвили Л.И. серия 09 № 016591,** считать **недействительным**.

Пряльницкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (Двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 – земельный участок в деревне Пряльники, площадь участка – 0,2323 га, начальная цена – 3 000 000 белорусских рублей;

Лот 2 – земельный участок в деревне Пряльники, площадь участка – 0,2359 га, начальная цена – 3 000 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков – строительство и обслуживание жилого дома. Земельные участки расположены в водоохранной зоне реки Бакуновка. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3600614130162 в филиале № 605 МОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13. УНП 600059273, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится **8 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: деревня Пряльники, ул. Молодежная, дом 3, здание сельисполкома. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **7 октября 2008 года** до 17.00 начала аукциона по адресу: д. Пряльники, ул. Молодежная, 3, кабинет секретаря.

Контактный телефон (8 01772) 31236

УНП 600059273

«Размова ідзе пра своеасаблівы агляд дасягненняў кнігавыдавецтва, нацыянальнай культуры, пра нашу сувязь з багатым духоўным гістарычным мінулым...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Адной з падзей стане і дабрачынная акцыя цэнтральных газет «Хрустальнае сэрца». Як вы лічыце, ці ўдасца журналістам абудзіць шырокі дабрачынны рух? Наколькі беларуская грамадскасць гатовая падтрымаць падобны праект?

— Сам факт, што нацыянальная прэса выступіла ініцыятарам такой акцыі, гаворыць пра магутную сілу апошняй. СМІ сёння не толькі інфармуюць, але і могуць арганізаваць тое, што вы назвалі шырокім грамадскім рухам дабрачыннасці... Палітыка нашай дзяржавы грунтуецца на пазіцыі «дзяржава для народа». Таму, думаю, вельмі добра, калі той клопат, які ёсць на дзяржаўным узроўні, будзе перадавацца кожнаму, даходзіць да ўсіх, каму патрэбна падтрымка і дапамога, асабліва калі размова ідзе пра дзяцей. І тут варта разглядаць не толькі матэрыяльны бок.

Калі працоўныя калектывы будуць больш пільна ўглядацца ў тыя патрэбы, якія ёсць у дзіцячых дамах, школах-інтэрнатах, мы зможам гаварыць аб тым, што сапраўды разам клапоцімся аб нашай будучыні. Нялішне было б, скажам, дзеля рэалізацыі сур'ёзнай мэты напачатку здзейсніць простыя крокі — папоўніць запасы бібліятэк дзіцячых устаноў, даць як мага большай колькасці дзяцей магчымасць пабываць з экскурсіямі ў гістарычных мясцінах краіны... Хто ж яшчэ, калі не дарослыя, будзе займацца ўзбагачэннем духоўнага жыцця дзяцей? А роля СМІ якраз у тым, каб больш актыўна паказваць прыклады высокай грамадзянскай свядомасці людзей, прадпрыемстваў, якія ўжо маюць свой дабрабыт — у сваёй сям'і ці працоўным калектыве, — і могуць больш плённа працаваць у сацыяльным накірунку.

Сярод шматлікіх тэмаў, якія трымаюць у полі зроку СМІ, тэма выхавання падрастаючага пакалення павінна мець прыярытэт. І клапоціцца пра гэта павінны не толькі дзіцячыя ці маладзёжныя выданні, але і буйныя грамадска-палітычныя. Такая пазіцыя, мяркую, будзе добрым крокам і ў развіцці кожнага выдання, паколькі дазволіць пашырыць чытацкую аўдыторыю.

— Што можна сказаць аб неабходнасці прыцягнення да дабрачынных мерапрыемстваў вядомых асобаў — артыстаў, спартсменаў і г.д.?

— Любая акцыя, якая распрацоўваецца, а я лічу, што СМІ добра папрацавалі над канцэптуальнай ідэяй «Хрустальнага сэрца», павінна мець шырокае гучанне, а значыць, з абавязковым удзелам у ёй тых асобаў краіны, якія свайм важкім укладам у развіццё любой галіны паказваюць прыклад, з'яўляюцца флагманамі грамадства.

— Работа журналіста — даволі блізкая да дабрачыннасці. Чацвёртай уладзе па сілах «ствараць дабро» сваімі публікацыямі, тэлепередачамі... Наколькі добра ў СМІ гэта атрымліваецца сёння?

— СМІ забяспечваюць дзяржаўныя прыярытэты ў развіцці нацыянальнай інфармацыйнай прасторы. Дарэчы, медыя-прастора Беларусі сёння — адкрытае поле, з шырокай колькасцю электронных СМІ, замежных выданняў, аднак сацыялагічныя апытанні паказваюць, што беларускае грамадства аддае перавагу нацыянальным СМІ. Гэта гаворыць аб пэўнай якасці інфармацыйнага прадукту, аб аб'ектыўнасці, узважанасці інфармацыі, якую яны прапануюць, аб захаванні традыцый беларускага друку. СМІ сапраўды з'яўляюцца барометрам грамадскага жыцця: яны ўзнімаюць пытанні, якія цікавяць розных жыхароў і кансалідуюць грамадства. З другога боку, сказаць, што ўсё ўжо зроблена, і больш няма да чаго імкнуцца, не выпадае. І не толькі таму, што творчасць не мае межаў, але і таму, што імклівае жыццё ставіць новыя праблемы і пытанні. І ў такім складаным працэсе, як будаўніцтва моцнай квітнеючай дзяржавы не толькі канкрэтныя паспадарскі ці прадпрыемствы, але і СМІ павінны браць новыя вяршыні.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

Выбары-2008

Больш актыўны этап перадвыбарнай агітацыйнай кампаніі яшчэ наперадзе

Старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына лічыць, што больш актыўны этап перадвыбарнай парламенцкай агітацыйнай кампаніі яшчэ наперадзе. Бягучы тыдзень — перыяд усведамлення кандыдатамі ў дэпутаты саміх сябе ў гэтай ролі. Такі пункт гледжання кіраўнік Цэнтральнай выбарчай камісіі выказала ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА.

«Агітацыйны этап бягучых парламенцкіх выбараў толькі пачаўся. Пакуль можна гаварыць аб доўгім абуджэнні палітычных сілаў, яны настройваюцца і не праяўляюць асаблівай актыўнасці», — адзначыла Лідзія Ярмошына. Яшчэ афармляюцца заказы на выраб агітацыйных лістовак, кандыдаты рыхтуюць і здаюць свае праграмы ў газеты, адбыліся першыя выступленні суіскальнікаў у тэле- і радыёэфіры.

Лідзія Ярмошына падкрэсліла, што прынятая ЦВК пастанова прадастаўляе магчымасць кожнаму кандыдату ў дэпутаты апублікаваць сваю перадвыбарную праграму ў дзяржаўнай газеце. Аднак некаторыя кандыдаты ад палітычных партый замест уласных перадвыбарных праграм прадстаўляюць у СМІ сумесныя заявы, якія называюць зваротам да нацыі. Такім чынам па іх віне ствараецца канфлікт, канстатавала старшыня Цэнтрвыбаркама. «Мы гатовы пайсці на тое, каб апублікаваць такі матэрыял, але называцца зваротам гэты дакумент не можа. Проста неабходна змяніць назву, паколькі гэта не прадугледжана выбарчым заканадаўствам», — сказала яна. «Абагульненасць гэтых дакументаў падстаўляе саміх жа аўтараў: тое, што не мае адцення асабістасці, асуджана на правал. Магчыма, таму, што мы «перакормлены» агульнымі лозунгамі», лічыць Лідзія Ярмошына. Разам з тым кіраўнік ЦВК перакананна, што «гэты канфлікт будзе вырашаны».

Нагадаем, што перадвыбарная агітацыя ў Беларусі пачалася з моманту рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, пасля 28 жніўня, і прадоўжыцца па 27 верасня ўключна.

У адпаведнасці з пастановай ЦВК кандыдат мае права апублікаваць сваю перадвыбарную праграму ў адной з наступных газет: «Звязда», «Народная газета», «Рэспубліка», «Белорусская нива», а таксама ў абласной і ў раённых, якія выходзяць на тэрыторыі яго выбарчай акругі. Публікацыя ў газэце па аб'ёму не павінна перасягаць 4 тыс. знакаў з прабеламі. Тэкст перадвыбарнай праграмы неабходна прадаставіць рэдакцыі не пазней за 7 верасня.

Выступленні ўдзельнікаў перадвыбарнай гонкі па радыё і тэлебачанні пачаліся 3 верасня. Кандыдатам, зарэгістраваным у акругах Мінска і Мінскай вобласці, эфірны час прадастаўляе радыёстанцыя «Сталіца», астатнім — абласныя радыёкампаніі. Тэлевізійныя выступленні мінскіх кандыдатаў транслюе тэлеканал «Лад», а кандыдатаў з Мінскай вобласці — тэлеканал СТБ. Астатнія суіскальнікі выступаюць у эфірах абласных тэлерадыёкампаній.

Наталля ІЛЫЧОВА, БЕЛТА.

БДІПЧ АБСЕ адзначае захаванне ў Беларусі спакойнай перадвыбарнай атмасферы, якая садзейнічае супрацоўніцтву

Аб гэтым гаворыцца ў прамежкавай справаздачы місіі БДІПЧ АБСЕ па назіранні за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі ў 2008 годзе.

«Паводле паведамленняў наглядальнікаў, атмасфера ў краіне застаецца спакойная, а субяседнікі з ліку афіцыйных асобаў чакаюць, што выбарчы працэс пройдзе мірна і празрыста», — гаворыцца ў справаздачы. Як сведчаць наглядальнікі, у цэлым «усе субяседнікі выказваюць гатоўнасць да супрацоўніцтва». Адзначаецца, што выбарчымі камісіямі на ўсіх узроўнях выконваліся ўстаноўленыя законам тэрміны. Сістэма назначэння выбарчых камісій застаецца нязменнай. На ўзроўні акруговых і ўчастковых камісій адпаведныя органы дзяржаўнага кіравання захоўваюць за сабой поўную правамоцную свабоду вырашэння пры правядзенні такіх назначэнняў.

«Хоць прадстаўніцтва апазіцыянераў у складзе выбарчых камісій істотным не з'яўляецца, урад Беларусі адзначыў павелічэнне колькасці акруговых камісій з прадстаўніцтвам апазіцыі ў якасці кроку наперад», — сказана ў справаздачы. Разам з тым у справаздачы выказваецца думка аб тым, што «адчуваецца няхватка незалежных СМІ».

БДІПЧ АБСЕ 9 ліпеня гэтага года атрымала запрашэнне правесці назіранне за маючымі адбыцца выбарамі ад міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Мартынава. «Запрашэнне паступіла своечасова, гэта дало магчымасць БДІПЧ АБСЕ належным чынам арганізаваць разгортванне місіі па назіранню за выбарамі», — сведчыць справаздача. Місія, якую ўзначаліў пасол Герт Арэнс, складаецца з 15 членаў асноўнай групы экспертаў, якая базіруецца ў Мінску, і 40 доўгатэрміновых наглядальнікаў, размешчаных па рэгіёнах Беларусі. Увогуле ў ёй прадстаўлены 22 дзяржавы — удзельніцы АБСЕ. Парламенцкія выбары 2008 года будуць у Беларусі пятымі па ліку, за якімі ў адпаведнасці са сваёй стандартнай методыкай будзе назіраць БДІПЧ АБСЕ.

БЕЛТА.

ПРЫХАВАНЫ АБРЭЗ

На дачным участку, які знаходзіцца каля в. Бараўцы, узнік пажар. Падчас тушэння агню быў знойдзены абрэз вінтоўкі Мосіна ўзору 1891/1930 гг., які падпадае пад агнястрэльную зброю.

Супраць гаспадара ўчастка — жыхара Лунінца ўзбуджана крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Уважаемые акционеры ОАО «Світанак» г. Жодино

16 сентября 2008 года в 15.00

в актовом зале административно-бытового корпуса состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Світанак», расположенного по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Внесение изменений в Устав Общества.

С материалами повестки дня можно ознакомиться в библиотеке профкома (ул. 8 Марта, 1).

Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.50 в день и по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь:

акционеру Общества – паспорт;

представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию реестра на 01.09.2008 г.

УНН 600038919

СООБЩАЕМ

Аукцион по продаже объектов, расположенных по адресу: г. Могилев, ул. Вишневецкого, д. 8-а, находящихся в республиканской собственности и принадлежащих на праве хозяйственного ведения республиканскому унитарному предприятию «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», назначенный фондом «Могилевоблимущество» на 12 сентября 2008 года, **отменяется.**

УНН 700010076.

Ля вытокаў

Цудоўны час для жніва духоўнага...

Анатоль БУТЭВІЧ, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры, былы старшыня Камітэта па друку, які быў ператвораны спачатку ў Міністэрства інфармацыі, а пасля — у Міністэрства культуры і друку, з 1990 па 1996 год:

— Пятнаццаць гадоў таму, калі пачыналася гісторыя Дзён пісьменства, многае ў незалежнай Беларусі было ўпершыню... На той час у Расіі існавала свята славянскага пісьменства, якое адзначалася і адзначаецца і ў нас, у маі, але мы вырашылі наладзіць сваё свята ўшанавання беларускага слова, свята, якое стала, як і меркавалася, адзіным, дзе беларускае слова гучыць і павінна гучаць на поўную моц і не канкурыраваць з іншымі відамі мастацтва.

Называлася тагачасное свята Дзень беларускага пісьменства і друку. А прымеркаванае яно было да значнай падзеі — выхаду ў свет першай кнігі Ф. Скарыны. Пачаўся першы Дзень з пасяджэння ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы, а пасля «перамяшчыўся» ў Полацк, на радзіму Скарыны... Праўда, жнівень аказаўся не вельмі ўдалым месяцам для падобнай падзеі — ідзе ўборка, дзеці на канікулах, і таму было вырашана перанесці мерапрыемства на верасень, цудоўны час для пачатку жніва духоўнага. Гэта апраўдала сябе, як і тое, каб свята перахоўвалася з аднаго горада ў другі. Кожны год у новым горадзе — гэта значыць, што ўсё новыя і новыя людзі чуюць роднае слова і, спадзяюся, пачынаюць больш яго шанаваць.

У дапамогу краязнаўцам было выратавана ладзіць навуковую канферэнцыю, ажыццяўляць экспедыцыю «Дарога да Святыняў». Тады гэта «дарога» пачыналася на пляцоўцы Незалежнасці, дзе ўдзельнікі сустракалі з Іерусаліма дабратворны агонь ад Труны Гасподняй. Фактычна тое, што мы тады запачаткоўвалі, сёння жыве, набыло сілу і развіваецца. Такім чынам, першы крок аказаўся ўдалым. Думаю, беларускае слова заслужыла права гучаць свабодна...

Жадаю ўдзельнікам барысаўскага свята адчуць смак нашага беларускага слова ў гэтыя дні, і захаваць яго на ўсё далейшае жыццё...

Запісала Святлана БАРЫСЕНКА.

ПОЛЬШЧА РАССЛЕДУЕ ДЗЕЙНАСЦЬ САКРЭТНАГА АБ'ЕКТА ЦРУ

У распараджэнне польскай пракуратуры патрапіў дакумент, які сведчыць, што прыкладна ў 2002 годзе ЦРУ размясціла на тэрыторыі Польшчы сакрэтны аб'ект.

Дакумент, датаваны 2005—2006 гадамі, пацвярджае стварэнне сакрэтнага аб'екта, хоць не ўтрымлівае ўказанняў на тое, што гэты аб'ект выкарыстоўваўся як турма. Пракуратура мае намер выкарыстаць знойдзеную паперу пры расследаванні сітуацыі з магчымым утрыманнем у Польшчы падазроных у тэрарызме.

КХЛ: першая перамога ў асноўны час

Учора беларускі прадстаўнік у Кантынентальнай хакейнай лізе правёў свой трэці матч. У Новасібірску мінскае «Дынама» сустракалася з «Сібір'ю». Першы перыяд застаўся сухім, а вось у другім у вароты канадскага легіянера Эндзі Чыода шайба ўсё ж уляцела. Гаспадары, якія засталіся ў большасці, пакаралі гасцей за частыя выдаленні. Праўда, «бела-блакітныя» заставаліся ў статусе пацярпелых не так доўга: лік зраўняў Андрэй Міхалёў. Такім чынам, пераможца матча высветліўся ў трэціх перыядзе. Дынамаўцаў вывеў наперад Яўген Курылін. У канцы трэцяй дваццаціхвілінкі трэнер сапернікаў узяў тайм-аўт і зняў варатара, але гэта не дапамагло «Сібіры». Вынік гульні не змяніўся — 2:1 на карысць беларусаў, якія нарэшце запісалі на свой рахунак першую перамогу ў асноўны час. Наступны паядынак каманда Джыма Х'юза правядзе ў нядзелю супраць «Амура».

Ірына ПРЫМАК.

Абзац

■ **Праўленне Белспажыўсаюза арганізавала гарачую лінію па пытаннях, звязаных з нарыхтоўкай і закупам плодаагародніннай і дзікарослай прадукцыі. Па ўсіх праблемах закупу, транспарціроўкі і нарыхтоўкі яблыкаў, журавін, грыбоў і ягад можна звяртацца па тэлефонах гарачай лініі: 226 97 07, 226 84 95, 226 82 52 у буднія дні з 8.30 да 19.30 і ў выхадныя — з 9.00 да 13.00 гадзін.**

■ У Гомельскай вобласці ў наступным годзе будзе закладзена 10 га вінаграднікаў. Плантацыі мяркуецца разбіць на плошчах сельгаспрадпрыемства «Усход» (Гомельскі раён). Чаранкі, якія будуць тут высаджаныя, ужо пайшлі ў рост у гадавальніку Інстытута гароднінаводства НАН Беларусі. Як чакаецца, вырашчаны віноград будзе выкарыстоўвацца для вытворчасці каньячных спіртоў.

■ **Акцыя «Прыгажуні на старце» пройдзе ў Гомелі 9 верасня — у Міжнародны дзень прыгажосці. Увечары ў Піянерскім скверы ў гэты дзень адбудуцца спаборніцтвы па бегу на абцасах на 60-метровай дыстанцыі, у якім возьмуць удзел усе жадаючыя прадстаўніцы прыгожага полу пасля 18 гадоў. Асноўнае патрабаванне да бягух — наяўнасць абцасаў вышэй за 7 см. Гэты атрыбут абутку будзе вымярацца перад стартам.**

■ Мядзведзь Мікіта стаў новым жыхаром Гродзенскага заапарка. Ён нарадзіўся ў Жлобінскім заапарку 8 месяцаў таму, гродзенцы набылі яго за Вг600 тыс. Праз некаторы час да яго падселяць маладога мядзведзіцу ў спадзяванні на папаўненне ў далейшым. Пакуль жа навасёла адкормліваюць свежай рачной рыбай, у яго рацыёне таксама мёд, арэхі і пячэнне.

■ **На Гомельшчыне ў 2009 годзе пасевы растаропшы плямістай будуць павялічаныя ў 10 разоў да 100 гектараў. Сёлета ў КСУП «Чалюшчавічы» Петрыкаўскага раёна атрыманы выдатны ўраджай гэтай незвычайнай культуры — 10,5 тоны. Увесь ураджай пойдзе на насенне. У медыцынскіх мэтах выкарыстоўваецца лісце, карані і насенне растаропшы. Яны прымяняюцца пры гепатыце, цырозе печані, зніжэнні зроку, садзейнічаюць вывядзенню таксінаў і павышэнню імунітэту. Мае растаропша і харчовую каштоўнасць.**

■ 500 літаў (130 еўра) штрафу давядзецца заплаціць вільнюскаму прадаўцу за гандаль сувенірамі з савецкай сімволікай — такое рашэнне прыняў учора Вільнюскі акруговы суд. Прадавец пазбавілася і тавару, які канфіскаваны па рашэнні суда. Жанчына на ўпадабанай турыстамі вуліцы гандлявала піліоткамі, салдацкімі рамянямі, афіцэрскімі галаўнымі ўборамі, эмблемамі падраздзяленняў савецкіх войскаў. Гэта першы выпадак пакарання за распаўсюджанне і дэманстрацыю савецкай сімволікі, забарона на якія прадугледжана ў законе, прынятым Сеймам Літвы ў ліпені. Памянёны закон забараняе выкарыстанне савецкай і нацысцкай сімволікі. Разам з фашысцкай свастыкай і знакамі СС забаронена выкарыстоўваць пяцікутную зорку, серп і молат і г.д.

■ **Вучоныя ўстанавілі, што жанчынам, якія нарадзілі з дапамогай кесарава сячэння, больш складана ўстанавіць первічную сувязь з уласным дзіцем і рэагаваць на яго патрэбнасці. У жанчын, якія нарадзілі натуральным шляхам, і тых, хто перанёс аперацыю, аказаўся розным узровень гармону аксітацыну, які адказвае за фарміраванне мацярынскіх паводзінаў. Гармон актыўна выпрацоўваецца пры схватках. Гэта варта памятаць тады, калі жанчыны выбіраюць роды з дапамогай кесарава сячэння не па медыцынскіх паказаннях, а па ўласным жаданні.**

Поўны абзац

■ Інвалід Вал Макейб са штата Нябраска адсудзіў у паліцыі сваю штучную нагу, якую ахоўнікі правапарадку ўзялі для правядзення крыміналагічнай экспертызы і не хацелі вяртаць. Не так даўно Макейб стаў ахвярай разбойнага нападу. Невядомыя рабаўнікі пяць разоў стрэлілі ў інваліда. Кулі патрапілі ў левую руку, пахвіну, правую ягадзіцу, правую лапатку і ў пратэз, які Макейб насіў ужо больш за 30 гадоў пасля таго, як страціў нагу ў выніку інцыдэнту на чыгунцы. Інваліда даставілі ў бальніцу, дзе яму была зробленая аперацыя, а пратэз забрала паліцыя для правядзення балістычнай экспертызы кулі. Акрыяўшы ад ранаў, Вал запатрабаваў вярнуць свой пратэз, аднак у паліцыі наадрэз адмовіліся зрабіць гэта, заявіўшы, што пратэз з'яўляецца рэчавым доказам, далучаным да справы. Інвалід апынуўся ў безвыходным становішчы. З-за раны рукі ён не мог карыстацца мыліцамі. Перасесці на інвалідную каляску ён таксама не мог, паколькі быў паранены ў ягадзіцу. Зрабіць другі такі ж пратэз было вельмі накладна: выканаць па індывідуальнай замове, ён каштаваў 28 тысяч долараў. У завяршэнне да ўсяго, урач бальніцы, у якой пасля ранення знаходзіўся Макейб, заявіў, што без пратэза дахаты яго не адпусціць. У выніку Макейб падаў скаргу ў суд, які зразумеў яго становішча і абавязаў паліцыю вярнуць пратэз.

■ **У амерыканскім штаце Фларыда паліцыя адшуквае перапранутага ў жанчыну мужчыну, які пры рабаванні бабулькі страціў фальшывыя грудзі. Злачынец, які вырваў у бабулі сумачку, выкарыстаў у якасці «грудзей» напоўнены вадой прэзерватыў. Паліцыя мае намер зняць з рэчавага доказу адбіткі пальцаў і адправіць на ДНК-аналіз. Відавочцы сведчаць, што рабаўнік быў апрануты ў кароткую спадніцу і топік. Ён знік з месца здарэння на аўтамабілі, у якім сядзелі яшчэ двое мужчын, пераапранутых у жанчын.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

САРВАЎСЯ

Калі прыцямнела, жыхар Пінска вырашыў залезці з даху 5-павярховага дома на балкон адной з кватэр, але не ўсё ў яго атрымалася і 40-гадовы мужчына сарваўся.

Па факце смерці пракуратура праводзіць праверку.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Праблему ўздымае чытач

«ТАКОЙ КОЛЬКАСЦІ ДАКУМЕНТАЎ ПРЫ ЎСТАНОЎЦЫ ЛІЧЫЛЬНІКАЎ ВАДЫ МНЕ ЯШЧЭ НЕ ДАВОДЗІЛАСЯ ПАДАВАЦЬ НІ Ў АДНУ АРГАНІЗАЦЫЮ»

Наш даўні падпісчык мінчанін Пётр Андрэевіч Навуменкаў у пэўным сэнсе стала супрацоўнічае з рэдакцыяй: рэгулярна выказвае сваё меркаванне па тых ці іншых падзеях, што асвятляюцца на старонках «Звязды», задае пытанні, адказы на якія амаль заўсёды маюць не прыватнае, а грамадскае значэнне. Словам, чалавек з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Вось і на гэты раз Пётр Андрэевіч узняў праблему, якая па сваёй сутнасці датычыцца многіх. Дадзім слова нашаму чытачу.

«Нядаўна мы ўстанавілі ў сваёй кватэры лічыльнікі халоднай і гарачай вады. Як гэта рабілася, я і хачу вам расказаць.

Спецыялісты ЖЭСа ці іншай правамоцнай арганізацыі ўстанаўліваюць у кватэры лічыльнікі. Спажывец аплачвае кошт лічыльнікаў і работы. Выканаўца (ЖЭС) выдае даведку (акт), што пацвярджае ўстаноўку лічыльнікаў. Мне ўяўляецца, што з гэтай даведкай можна ісці ў разліковы цэнтр ЖЭСа і ў далейшым аплачваць ваду, што спажываем. Аказваецца, з гэтай даведкай трэба ісці ў іншую арганізацыю: УП «Мінскводаканал», цэнтр па разліках са спажыўцамі «Вадазбыт». У «Вадазбыт» трэба падаць наступныя дакументы: даведку з ЖЭСа, што ўжо маецца, пашпарты лічыльнікаў вады, тэхнічны пашпарт кватэры ці ордэр, пашпарт уладальніка кватэры. Калі ўладальнік кватэры па нейкіх прычынах не можа паехаць у «Вадазбыт», дык іншы член сям'і павінен падаць даверанасць, завераную ў натарыуса. Каб атрымаць яе, трэба паехаць у натарыяльную кантору, напісаць, заверыць дакумент, заплаціць пэўную суму грошай.

Такой колькасці дакументаў мне не даводзілася падаваць ні ў адну арганізацыю.

Дакументы гатовы. Падаю іх супрацоўніку «Вадазбыта». Са мной заключаюць дагавор і выдаюць другі аркушык, дзе ўказаны маё прозвішча, мой рахунак. У далейшым, з указаннем прозвішча і рахунка, я павінен буду аплачваць расход усёй вады па двух лічыльніках для «Вадазбыта».

Далей з тэксту дагавора з «Вадазбытам» трэба зняць копію. Яе аднесці ў разліковы цэнтр ЖЭСа. Там мне выдаюць паперку з запісаным тэлефонам, па якім я павінен паведамляць паказчыкі лічыльніка гарачай вады. Гэта інфармацыя прызначана для «Цепласетак» (аплата падагрэву вады). Г.зн. паказанні лічыльніка гарачай вады я паведамляю двойчы: у ашчаднай касе ці на пошце пры аплаце ўсёй спажытай вады і ў разліковым цэнтры ЖЭСа (падагрэў вады).

Распрацоўшчыкі мерапрыемстваў па ўстаноўцы лічыльнікаў вады, верагодна, не чулі аб прагрэсіўнай форме працы з насельніцтвам, якая называецца «адно акно». Уся працэдура нязручная, вельмі грувасткая, не прадуманая ад пачатку да канца.

Мне ўяўляецца, што было б правільным выконваць работы так: я пішу заяву ў ЖЭС з просьбай устанавіць лічыльнікі, аплачваю кошт лічыльнікаў і работ па іх устаноўцы. Астатняе выконваюць адпаведныя службы. У далейшым адзін раз на месяц я здымаю паказанні абодвух лічыльнікаў і аплачваю кошт вады і падагрэву. Сувязь паміж «Водаканалам» і «Цепласеткамі» ажыццяўляе кампутар».

Гэты ліст рэдакцыя накіравала на разгляд кіраўніцтву УП «Мінскводаканала». Што нам адказалі па сутнасці?

«Зараз заключыць дагавор на разлікі па ўстаноўленых лічыльніках вады можна

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Таямнічае святло старых выданняў

Выстаўку пад такой назвай падрыхтавалі да Дня беларускага пісьменства ў Чавускім гісторыка-краязнаўчым музеі. Напярэдадні свята музей запрасіў да сябе ўсіх, хто любіць кнігу і адчувае прыцягальную сілу старадрукаў, якія праз стагоддзі данеслі да нас мудрасць продкаў, іх імкненне да ведаў і асветы.

Экспазіцыяй выстаўкі сталі старажытныя кнігі з фондаў музея, а таксама прыватных калекцый. Наведвальнікі змаглі пагартаць энцыклапедычны слоўнік Браккгаўза і Эфрона 1898 года выдання, «Малітваслоў» — 1850-га, «Псалтыр» — 1870-га, «Біблію» — 1839-га гадоў выдання. З прыватных калекцый, па словах дырэктара музея Іны Казаковай, на выстаўку дастаўлена больш за 20 старадрукаў. У асноўным гэта кнігі царкоўнага зместу. Першую экскурсію па экспазіцыі ўчора правёў ураджэнец Чавускага раёна, свяшчэннаслужыцель глускага Богаяўленскага храма Фёдар Кашанок.

Ул. інф.

Дажынкі — гэта сустрэча лета і восені, доўгай працы і кароткага адпачынку, а перш за ўсё — гэта свята, якім завяршаецца жніво.

Той, хто шчыра адпрацаваў на ніве, мае права пахваліцца і сабой, і сваёй работай; мае права, як кажуць у народзе, і станцаваць, і заспяваць...

6 верасня ў Століне працоўныя Брэстчыны адзначаць абласныя дажынкі.

Сёлета берасцейцы сабралі добры ўраджай, таму менавіта для іх і прагучыць на свяце гэты вальс...

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК.

СТОЛІНСКІ ВАЛЬС

Столінскі вальс Вы са мной танцавалі,
Месяц глядзеў на гарынскія хвалі,
Зоры плылі па Гарыні ж у Прыпяць...
Вы мяне зноў у той танец вярніце!

Столінскі вальс — малады і вясёлы!
Пахлі сады, пахлі кветкі мяцёлы,
І салаўі давідна не змаўкалі...
Я Вас кахаў, і мяне Вы кахалі!

Столінскі вальс Бог на радасць прыдумаў...
Пінск яго чуе і сцішаны Тураў,
І Гарадок — уладанне Давыда,
Кожны куток — там, дзе чарка наліта!

Столінскі вальс у душы застаецца
І пераходзіць ад сэрца да сэрца,
І ад сяўбы да жніва залатога,
Ад нараджэння і шляху да Бога!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ТВАРАМ ДА ЦЭНТРА»: РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

ГОРАД ЯК ВЕЧНАСЦЬ

Што значыць горад для чалавека? Гэта толькі дамы — маўклівыя, нежывыя? Камень і цэгла. Цытадэлі з бетону, у клетачках якіх знаходзяць прытулак людзі? Вуліцы і дарогі, якія некуды прыводзяць. І, магчыма, па нечым прайшлі. Па нечым, што ўжо існавала на гэтым месцы ў даўнія часы, ці ляжала руінамі пасля вайны.

Горад — гэта не толькі месца, дзе табе давялося жыць. Пакутаваць, сталець, радавацца назаўжды праводзіць у вечнасць блізкіх. Горад — гэта і ёсць масток у вечнасць, якая міласціва адпусціла пэўную колькасць гадоў чалавеку, які тут жыве. Барыс Хасанавіч АЛЕКСАНДРОВІЧ — карэнны мінчанін. Ён з тых татар, якія палюбілі Беларусь і былі ёй адданыя, навучыўшыся захоўваць свае традыцыі і пры гэтым зразумеўшы і ў многім прыняўшы мясцовыя. Ён любіць гэты горад і мае свой погляд на тэму рэканструкцыі старога Мінска, якую мы паднялі на старонках «Звязды» напачатку жніўня. Але яго асабістая гісторыя яшчэ злучана з нашай газетай — менавіта Хасан Александровіч вёў выдавецкую справу ў падполлі ў гады вайны, друкуючы нашу газету. Яго сын пайшоў па шляху бацькі ў выдавецкую справу. Сёння ён гаворыць пра Мінск, пра вобраз горада, які захаваўся ў яго сэрцы, і з якога вырасла сучасная сталіца. І гэта мне здаецца вельмі цікавым.

— Я памятаю Мінск, калі ён быў яшчэ маленькім кампактным горадам, — гаворыць Барыс Александровіч. — Усе хадзілі пешшу ці на падводах. Былі ў горадзе розныя кварталы — татарскі, яўрэйскі. Але ўсе дружна жылі. Наша татарскае пасяленне было за оперным тэатрам. За Юбілейнай плошчай (дзе гасцініца «Юбілейная») была мячэць. Рака Свіслач цякла бліжэй да Юбілейнай гасцініцы, рэчка была з прыгожымі берагамі, вада ў ёй была чысцюткая, празрыстая, усе купаліся. Але рэчку перакруцілі, закавалі ў бетон. А ў пойме ракі Свіслач знаходзіліся татарскія гароды. Тут вырошчвалі капусту, буракі, моркву, зеляніну. Бабуля мела багата зямлі — прыкладна гектараў пяць. Добрая была гаспадарка. Што вырастала, на вазы грузілі і адвозілі на кірмаш, туды, дзе зараз Траецкае прадмесце. Гэта было месца, дзе віравала жыццё. Месца, дзе быў ніжні рынак, было ўвасабленнем сапраўднага лона горада: разабраныя тушы жывёл, кроў цякла па радах... Гэта зафіксавана ў фотаздымках. Але калі рабілі Траецкае прадмесце ўжо ў цяперашнім выглядзе, гэта ніяк не адлюстравалася. Цяпер Траецкае лялечнае. А тады жылая частка выглядала інакш: завулкі, прыгожае аздабленне (там жылі заможныя людзі), але ўсё чамусьці знікла пры аднаўленні...

Я памятаю яшчэ той Верхні горад, які быў жылым кварталам. Ад яго мала чаго захавалася, але старыя дамы нагадваюць мне сёння пра колішняе жыццё. Памятаю, як яшчэ да вайны і потым пасля вайны я хадзіў у той раён да бабулі ўздоўж рэчкі Нямігі, якую потым схавалі ў калектар. Я яе застаў — маленькую рачулку, якая была падобная на бліскучую сцежку — хоць ты ідзі па ёй босымі нагамі. А мы самі жылі ў раёне Камароўкі. Гэта тады быў канец горада, самая багна, а людзі па кладцы хадзілі. Наш дом стаяў на Выдавецкай вуліцы, дзе жылі супрацоўнікі выдавецтва. Бацька мой быў друкаром, узнімаў выдавецкую справу ў Беларусі.

Перад самай вайной бацьку далі пуцёўку ў санаторый. Як ён адтуль вярнуўся дадому ў першыя дні вайны, нават не ведаю. Нас было чацвёра дзяцей. Нам сказалі, што будзем эвакуявацца, але маці не рашылася. І правільна зрабіла — перажылі вайну. Каб пражыць падчас вайны, матуля забрала ўсё каштоўнае, што было ў бацькі, і панесла прадаваць у Рубяжэвічы — кіламгрм дзесяць мукі за гэта далі. Летам было трохі лепей — у нас быў агародзік, бульба, цыбуля. Так і выжылі. Калі бамбёжка пачыналася, мы знаходзіліся не ў доме, а ў склепе. Бамбілі моцна — калі прыціскаўся да зямлі, адчуваў, як яна дрыжыць. Я маленькі быў, але вучыўся не палохацца там, дзе трэба было выжыць. Ваенны Мінск вучыў мяне гэтаму. Аднойчы вельмі захацелася есці. Я пралез да немцаў, якія сядзелі за сталом, выпівалі. Мяне заўважылі, перакладчык спытаў, што маленькі хоча. Сказаў шчыра: «Я хлеба хачу». Немец сказаў, калі выпіў шклянку шнапсу, дадзім булку хлеба. Гэта мне, пяцігадоваму. Але я падумаў, як дома ўсе ўзрадуюцца гэтаму хлебу... Маці казала, калі я дайшоў дадому, то адразу страціў прытомнасць...

Бацька падчас вайны, каб пракарміць сям'ю, грузіў торф. Паёк давалі — ён нёс нам. А сам жа яшчэ займаўся важнай і небяспечнай справай — друкаваў падпольную «Звязду». Урач Клумаў, імем якога назвалі бальніцу, дапамагаў партызанам. Майму бацьку, калі той стаў працаваць на электрастанцыі, урач выдаваў бальнічныя лісты — каб яго немцы не западозрылі. На гэты час бацька мог займацца газетай.

Чатыры гады мы хаваліся ў зямлянцы, на балотах, дзе цяпер Камароўскі рынак. У тым раёне яшчэ рэчка цякла, называлі Камароўскі ручай, метры тры шырынёй. Ён цёк адсюль, дзе цяпер Інстытут фізкультуры, раней называўся раён Вілы, і ішоў на балотную станцыю, у бок Камсамольскага возера. Неглыбокі ручай, але там і рыба была адзін час, а потым яго асушылі разам з балотам. Калі вызвалілі Мінск, немцы беглі на гэта балота ратавацца прама ў нацельнай бялізне, падымалі рукі, крычалі: «Гітлер капут!»

Пасля вайны захаваліся ў Мінску ў асноўным драўляныя будынкі. Дом Урада і касцёл. Горад ляжаў у руінах. Оперны тэатр быў разбомблены. Нават Камсамольскае возера пацярпела ад бамбёжак — у тых месцах, куды трапілі бомбы, у варонках потым утварыліся віры. Людзі ішлі купацца і гінулі ўжо пасля вайны...

Пасля вайны ў раёне былой Выдавецкай вуліцы ўсё змянілася. Таго раёна цяпер няма — яго «накрыў» крыты Камароўскі рынак. Разам з гістарычным месцам, дзе «Звязда» вяла сваю гераічную барацьбу і адлюстроўвала гісторыю цэлага народа. Атрымалася так, што ў нейкі час ежа паспрабавала выцесніць самую памяць. І зрабіць гэта аказалася даволі проста. Толькі памятны знак падпольнай «Звяздзе» стаіць цяпер ля Камароўкі. Але знікла назва самой вуліцы Выдавецкай, якая ў свой час была адметным месцам у горадзе.

Пасля вайны бацька вельмі хацеў, каб пры пераўтварэнні таго раёна захавалі хоць бы самую хатку, дзе друкавалася «Звязда» і стварылі там музей, ён увесь час адстойваў гэта. Добрая ж ідэя — музей падпольнай газеты! Мог бы стаць універсальнай з'явай — паставіць бы там друкарскі станок, каб кожны наведвальнік мог атрымаць нумар «Звязды»... Але такая памяць ніяк не ўпісвалася ў планы горададбудаўнікоў, якія не звяртаючы ні на каго ўвагі стваралі новы Мінск. А ў ім памяць павінна была жыць толькі ў спецыяльна адведзеных месцах. Вось такога падыходу я не разумею нават цяпер, пражыўшы жыццё.

Ужо пасля смерці бацькі я вёў барацьбу з уладамі, каб не пераносіць яго магілу — усё-такі заслужаны чалавек. Былі намеры знесці татарскія могілкі. Але адстаяўшы сваю магілу, мы змаглі захаваць памяць пра іншых людзей, якія вякамі жылі ў гэтым горадзе. Я люблю заходзіць на бацькаву магілу. Цяпер на могілках будуюць мячэць. А калісьці за савецкім часам разбурылі старую мячэць, якая была ў раёне Юбілейнай. Праўда, спачатку яе ператварылі ў ДТСААФ. А потым падарвалі — быў моцны падмурак... І вось будуюць новую. Напэўна, трэба радавацца — нібыта справядлівасць сцвярджаецца. Але сумна, што такой цаной — людзі былі вымушаны перажыць руйнаванне дарагога будынка.

Сумна яшчэ і з-за таго, што далёка не ўсе здольныя вучыцца ў гісторыі, не ўсе разумеюць каштоўнасць старых будынкаў, якія калісьці ўтваралі Мінск, той горад, з якога вырасла наша сучасная сталіца. Я не супраць будаўніцтва новых сучасных дамоў, палацаў. Я за тое, каб паважліва ставіліся да таго, што сёння называюць «руіны» — старых дамоў у цэнтры. Таму што яны сведкі многіх драматычных падзей, урэшце, яны перажылі вайну і далі магчымасць выжыць многім людзям. А гэта вартае дарагога. Ніякая самая надзейная сучаснасць не павінна забіваць гісторыю жыве ў сэрцы гараджан.

Я і цяпер люблю гуляць па тых раёнах, куды мяне прыводзіць сэрца, і дзе жыве мая памяць. Штосьці — яшчэ пазнаю. Па нечым — ныне сэрца. Вось як па рачулцы Нямізе. Вызваліць бы яе з палону — ёсць жа ў ёй дасюль вада, выліваецца ў Свіслач. Калі не спрабавалі чысціць пару гадоў таму, то ўзварухнулі самую гісторыю — потым там пачалі знаходзіць рэшткі старажытнай зброі, манеты. Так, у сучасных людзей пры іх тэхналогіях ёсць спакуса перакраіць ландшафт пад сябе. Але тое, што ненатуральна, нагадае пра сябе так ці інакш: вось жа ў час вялікіх ліўняў на вуліцы Нямізе звычайна ўсё плыве. Ды таму, што там павінна быць рэчка!..

Можна, было, спачатку зраўнаваць Мінскае замчышча бульдозерамі, як гэта здарылася, не падумаўшы, што калі-небудзь да яго людзі будуць праяўляць цікавасць, і наступныя пакаленні захочуць адзначыць хоць бы гэтае месца. Можна перанесці помнік Багдановічу, зачапіць яго кранам, пілаваць сам падмурак (паставілі ж трывала!) — і разам з помнікам прыбраць увесь стары брук як непатрэбную рэч. Але ж дзе я сваім унукам магу паказаць, што такое брук, і які ён бывае? Ці ж нельга было яго выкарыстаць і паказаць хоць бы дзе-небудзь? Гэта, магчыма, і не каштоўнасць, але адметнасць, якую прамянялі на зручнасць. Я вырас у Мінску. Мне дарагая яго адметнасць, няхай не мала, няхай яна сціплая — яна суправаджала мяне па жыцці. Па ёй я вучу сваіх унукаў любіць родны горад. Па такіх куточках я ваджу іх, расказваю тое, чаго яны ўжо не ведаюць пра Мінск. І вельмі шкадую, што ўжо пасля вайны, у мірны час многія выжыўшыя будынкі «пусціліся ў расход» як непатрэбны матэрыял. Хто думаў пра тое, што іх калі-небудзь могуць назваць каштоўнымі? А ці сучасным «руінам» не пагражае такі ж падыход? Для мяне гэтыя руіны — знак таго, што Мінск мае гісторыю і сваю памяць.

Гараджан, якія захоўваюць памяць пра былое жыццё, не так мала, і гэтая памяць жывіць людзей. Гэтая памяць лучыць нас з герачным мінулым, пра якое ўзгадваюць у нас у пэўныя трагічныя дні. А для маёй сям'і гэтае мінулае было ў свой час выпрабаваннем, нават лёсам.

Запісала Лариса ЦІМОШЫК.

ДЗІЦЯ
ДЗІКАЙ ПРЫРОДЫ

Перыядычных выданняў з ілюстрацыямі прыроды ў нашай краіне і раней не бракавала. Але часопіс «Дзікая прырода», які толькі што выйшаў, стаў прыемным сюрпрызам нават для тых, каго, здавалася, ужо нічым не здзівіш. А здзіўляюць, найперш, фотаздымкі — ад вокладкі да апошняй старонкі. Не, не глянцавасцю і выдатнай якасцю друку, што, само сабою, прыемна — а ў першую чаргу нечаканымі, цікавымі і проста прыгожымі выявамі прадстаўнікоў дзікага прыроднага свету Беларусі, злоўленымі момантамі і падгледжанасцю рэдкіх жывёл і птушак. Чаго каштуе нават адзін «партрэт» рысі на вокладцы! Пасля першага беглага прагляду часопіса, міжволі закралася думка: няўжо і ў нас, нарэшце, з'явіцца свой «National Geographic» альбо «Geo»? Спадзяюся, чытачу вядомы гэтыя старэйшыя і самыя папулярныя ў свеце часопісы прыроды.

— Мы будзем расказваць пра самыя запаведныя і дзікія куточкі Беларусі і шукаць дарогу да сэрцаў мільёнаў аматараў прыроды — кажа ва ўступным слове заснавальнік і галоўны рэдактар выдання Сяргей Плыткевіч. — «Дзікая прырода» — даўняя мара многіх фотамайстроў і тым больш фотапаляўнічых, якія валодаюць унікальнымі і рэдкімі здымкамі. Будзем паказваць лепшае і адкрываць невядомую Беларусь.

І першым сваім «адкрыццём» часопіс выбраў вусце ракі Лань — палескую амазонію, дзе ў непраходных балотах і зарасніках гняздуюцца калоніі чапляў. «Няўжо ў цэнтры Еўропы сапраўды захавалася такая экзотыка? Ці гэткае ўражанне з'яўляецца на падставе рэдкіх па нечаканасці кадраў?» — запыталіся мяне калегі, маўляў, фатографы любяць усё прыхарошваць ды перабольшваць.

Зразумела, скептык можа запярэчыць, што ўсё даўно адкрыта і вядома ў невялікай краіне, як наша. Але на тое ён і скептык. Мне ж здалося вельмі цікавым, што ў Беларусі ёсць чалавек, які стварае штучныя гнёзды для вялікіх драпежных птушак — арланаў-белахвостаў і арлоў-беркутаў і перадае гэты вопыт іншым. Гэта — арнітолаг і неверагодны прыродалюб з Віцебска Уладзімір Іваноўскі. І ён шчыра дзеліцца сваім вопытам і назіраннямі. Хіба такі спецыяліст — не з'ява для аховы беларускай прыроды? Цяпер Уладзімір Іваноўскі ўзначальвае грамадскае аб'яднанне «Ахова птушак Беларусі».

Першым навіну пра выхад у свет «Дзікай прыроды» мне паведаміў фотапаляўнічы па прызванні, а па пасадзе — вядучы паляўніцтвазнаўца Маладзечанскага лясгаса жыхар вёскі Хаценчыцы Вілейскага раёна Віктар Казлоўскі: «Віншую, сябра! Выданне цікавае ва ўсіх адносінах — і фотаздымкі, і артыкулы, і рэкамендацыі спецыялістаў!» З Віктарам мы знаёмыя з першага рэспубліканскага чэмпіянату па фотапаляванні, які праходзіў сёлета ў маі на Тураўскім лузе, потым разам здымалі арлінае гняздо, ладзілі вечаровыя здымкі дзікай жывёлы. У гэтага фотапаляўнічага багаты вопыт здымкаў натуры, у яго ёсць чаму павучыцца, што пераняць. Фотаздымкі Казлоўскага таксама сталі своеасаблівым адкрыццём Беларусі ў першым нумары. А потым усхвалявана пазваніў яшчэ адзін паляўніцтвазнаўца — Андрэй Шымчук — з Цяцерынскай паляўнічай гаспадаркі Круглянскага раёна. Павіншаваў, запытаў пра размову за «круглым сталом» з удзелам вопытных спецыялістаў ў паляўнічай гаспадарцы, змешчаную ў часопісе, ці цікаваю яна атрымалася, актуальнаю? Паведаміў, што нават звычайным паляўнічым і егерам выданне здалося і цікавым і змястоўным. Андрэй таксама займаецца фотапаляваннем і марыць, што і яго фотаздымкі з'явяцца на старонках «Дзікай прыроды».

— Нягледзячы, што яшчэ не адбылося прэзентацыі часопіса, пра яго ўжо пытаюцца розныя людзі і спецыялісты — гаспадары сядзіб вясковага турызму, кіраўнікі лясгасаў і паляўнічых гаспадарак, рыбакі, паляўнічыя і турысты і, само сабою, фатографы і фотапаляўнічыя, — дзеліцца ўражаннямі заснавальнік Сяргей Плыткевіч. — Першы год мы плануем выходзіць з перыядычнасцю раз у два месяцы, а далей пабачым, як будзе гадавацца гэтае дзіця дзікай прыроды.

Анатоль КЛЯШЧУК.

Ёсць праблема!

АРЭНДНЫ ТУПІК

Як выйсці з яго галерэі «Тызенгаўз»?

Дом № 4 на плошчы Тызенгаўза ў Гродне — гісторыка-культурная каштоўнасць і вядома тым, што ў 1760-я гады тут размяшчаўся музычны флігель. Цяпер у гэтым будынку офісы шэрагу ўстаноў, некалькі кватэр, а з 1995 года па ініцыятыве і за сродкі бізнэсмена Уладзіміра Радлінскага, чые бацькі пражывалі ў гэтым доме, частка пустых падвальных памяшканняў была перабстлявана пад галерэю «Тызенгаўз».

З самага пачатку ў гэтага праекта не было чыста камерцыйнай накіраванасці, паколькі мастацкая галерэя — не рынак ці супермаркет, а ўстанова, так бы мовіць, камернага характару, разлічаная на пэўнае кола зацікаўленых людзей. І наўрад ці ў нашых сённяшніх, ды і, мусіць, заўтрашніх рэаліях можна разлічваць на сур'ёзны фінансавы прыбытак. Тым не менш галерэю «Тызенгаўз» можна з поўным правам назваць паспяховай. Гэты поспех у тым, што выстаўляцца тут лічаць за гонар мастакі не толькі з Гродна, але і з Мінска, іншых рэгіёнаў Беларусі і замежжа, што аказваецца падтрымка не толькі знаным прафесіяналам, але і пачаткоўцам, праводзяцца выстаўкі дзіцячых работ, з задавальненнем сустракаюць і даюць, можна сказаць, урокі мастацтва групам школьнікаў... Уваход свабодны, білетаў няма.

— Калі мастак робіць у нас выстаўку, то адну карціну ён пакідае галерэі, каб акупіць нашы расходы, хоць і не ўсё потым прадаецца, — расказвае гаспадыня галерэі «Тызенгаўз» з 2000 года, індывідуальны прадпрымальнік Галіна Сарока. — А вось арганізацыя выставак дзіцячых работ мае чыста дабрачынны характар. Акрамя таго, за сезон у нас абавязкова двойчы-тройчы выстаўляюцца маладыя мастакі — студэнты Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы і таленты, якіх мы запрашаем з іншых рэгіёнаў рэспублікі. Гэтым летам была выстаўка памяці мастака Уладзіміра Сядзякіна.

Аб аўтарытэце і запатрабаванасці галерэі сведчыць тое, што на сёння ўжо практычна сфарміраваны план наступнага выставачнага года і нават ёсць заяўкі ад мастакоў на 2010-ы. Аднак Галіна Канстанцінаўна цяпер у будучыню глядзіць з трывогай. І прычына тут у новых умовах арэнднай платы за памяшканне.

Дагэтуль у адпаведнасці з дагаворам арэнды з УЖРЭП Ленінскага раёна г. Гродна штомесячная плата складала 102,94 еўра. Дзякуючы пэўнаму даходу ад продажу фарбаў, паперы, пэндзляў, а таксама карцін (з кожнай рэалізаванай работы, вядома ж, плаціцца падатак) галерэя працаваць магла. Аднак цяпер, у сувязі з нядаўна ўведзеным на рэспубліканскім узроўні новым парадкам арэнднай платы, яна для галерэі павялічылася да 224,03 еўра. І гэта — з улікам паніжаючых каэфіцыентаў за падвал і адсутнасць натуральнага асвятлення.

Такім чынам, арэндная плата за памяшканне рэзка ўзрасла, чаго не скажаш пра даходы ад продажу тых жа фарбаў, паколькі гэта не тавар шырокага спажывання, а спецыфічныя матэрыялы, разлічаныя ў асноўным на гродзенскіх студэнтаў-мастакоў. Свая спецыфіка, вядома ж, і ў продажы карцін, зусім не гарантыя, што кожная з іх знойдзе свайго пакупніка.

Галерэя «Тызенгаўз», дарэчы, займае толькі частку падвала, а на астатнюю, нягледзячы на быццам бы казырны адрас у цэнтры горада, вока пакуль ніхто не паклаў, бо ўмовы не вельмі ўжо і зайздросныя, нават праблемныя. Каналізацыя старая, пасля моцнага дажджу здараюцца такія непрыемнасці, што Галіне Канстанцінаўне даводзілася запрашаць на дапамогу сваіх сябровак і нават выклікаць для адпампоўвання вады работнікаў МНС. І тым не менш больш чым удвая павялічылася плата за арэнду.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

ДУХОНАСЦІ ТРЫВАЛЫЯ СКРЫЖАЛІ

Рэчаіснасць заўсёды поўніцца парадоксамі. І таму не даводзіцца здзіўляцца, чаму паэзія Міхася Башлакова, якая ўжо тры дзесяцігоддзі шматколерна зіхіціць-ззяе на паэтычным небасхіле, дагэтуль яшчэ не ўганараваная дома. Мо ўважліва не прачытана яна, не адзначана яе адметнасць? Ці не дастаткова рэкамендавана на ўзнагароджанне? Знойдуцца і іншыя прычыны на гэты конт. Аднак варта заўважыць: творчасць Міхася Башлакова аб'ектыўна заслугоўвае і грамадскага, і дзяржаўнага ўшанавання.

Тэмы творчасці палескага лірыка — вечныя і надзвычай сучасныя. Радзіма і Паэт. Ва ўсе часы родны край палоніць мастакоўскія душы і духоўна сілкуе іх. Ён паўстае велічным, аграмадным, цудадзейным. І адначасова знямогламым, спакутаваным, ахвярным. Тысячагадовы боль, разліты скрозь у родных мясцінах, чуйна ўспрымаецца творцам, пякельна працінае яго душу, трывожыць думкі, акрэслівае жыццёвую дарогу. А слава Бацькаўшчыны гартуе яго дух, выкрышталізоўвае гонар, годнасць і сумленне. Радзіма — гэта лёс. А лёс не прымаюць (долю прымаюць) — лёс робяць, ствараюць. Без успрымання агульных клопатаў, агульных надзей краіны, без удумлівага асэнсавання яе гістарычных падзей — няма Паэта — той асобы, што ў карпатлівай дзейнасці цягам часу становіцца часцінкай Бацькаўшчыны, яе духоўным промнікам. Гэтае дыялектычнае адзінства «Радзіма — паэт» пастаянна хвалюе Міхася Башлакова: яно заяўлена ў яго першых кнігах «Касавіца» (1979), «Начны пароМ» (1987), «Дні мае залатыя» (1993), «Лілея на цёмнай вадзе» (1994), «Як слёзы горкія Айчыны...» (1999) і шырока разгорнута ў кнігах паэзіі і графікі «Нетры» («Неизведанное»; 2004) і «Палын. Чарнобыль» (2005), які вылучаны на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь.

Палескаму краю, найперш яму — той прасторы, якая выхавала, зрабіла мужным грамадзянінам і паслядоўным патрыётам, прысвячае Міхась Башлакоў сваю творчасць.

Радзіма...
Гэта светлая любоў
Да родных гоняў.
За бялюткім гаем.
Яна, як крык
Самотных журавоў,
Што аж да слёз
Да самых
Праціне...

Як музыка,
Як песня для душы.
Як першае
Нязбыўнае каханне...
На схіле дзён,
На горкае мяжы
З вачэй бяжыць
Слязінкай
На расстанне...



Паэт тонка адчувае існасць Радзімы. Яна паўстае перад ім маштабна, шматаблічна, у розных іпастасях. З непрыхаваным болем ён усклікае: «Як гэта горкая рабіна, / / Самоціцца мая Айчына.» І гэты боль, які ў свой час спапяляў сэрцы Байрана і Лермантава, класікаў беларускай літаратуры, кіраваў памкненнямі творчай моладзі ў мінулым і пазамінулым стагоддзях, цяпер вярэдзіць душу Міхася Башлакова, не дае яму спакою, забыцца. З гэтым болем можна зжыцца і рабіць, тварыць, але нельга прымірыцца.

Звіце палын
На схілах і пагорках
У вечаровых
Сцішаных палях.
Гарыць над шляхам
Стомленая зорка,
Чарнобыльская,
Горкая мая.

А за пагоркам
Горка так спяваюць
Пра сваю долю,
Горкую ад слёз...
Мае вяскоўцы
Век свой дажываюць
Пад шэпт старых
Прыгорбленых бяроз...

Няўжо і праўда,
Гэта ты, Радзіма?..
А можа, толькі
Горкі прыпамін?..
Пацягне ад пагорка
Горкім дымам...
Палын, палын,
Звіце вакол палын...

Мастацкі радок, пластычны, гнуткі, утрымлівае вялікую гаму пачуццёвых нюансаў — ад услаўлення харастваа роднага краю да стрыманай перадачы імпульсіўнай аўтаркай несупакоенасці. Міхась Башлакоў плённа прадаўжае традыцыі, што ідуць у рускай паэзіі ад Сяргея Ясеніна, Мікалая Рубцова, а ў беларускай — ад Аркадзя Куляшова.

Рамантычнае ўспрыманне рэчаіснасці, глыбокае суперажыванне з тым, што адбываецца навокал, і філасофскае абагульненне, лаканічна перададзенае мастацкім вобразам, сімвалам, родніць Міхася Башлакова з Міхасём Барздыкам — мастаком-графікам. Ён — вельмі дасведчаная асоба, са шчырай душой, з неаслабным імкненнем творыць, сцвярджаць. Яго графічныя аркушы добра знаёмыя грамадскасці (цыклы «Дні лістапада», «Снежаньскія забавы», «Фарбы восені», «Абуджэнне», «Гукі стомленых дзён» і інш.), высока адзначаны за мяжой — сярэбраным медалём Еўрапейскай Акадэміі мастацтваў (1992), залатым медалём Міжнароднага конкурсу графікі (Бельгія, 1993).

Вопытны мастак улавіў напружаную энергетыку паэтычных строф і арганічна спалучыў графічныя аркушы з імі... Закадаваная ў паэтычных радках вобразнасць, сімволіка своеасабліва вывялася ў малюнку. Гэта — не ілюстрацыі да вершаў. Тут адбылося творчае пераўтварэнне духоўнай энергіі з літаратурнай вобразнасці ў мастацкую, узнікла духоўнае спляценне, скрыжаванне. Так нарадзіліся кнігі «Нетры» («Неизведанное») і «Палын. Чарнобыль», «Roads» («Шляхі», 2007), а таксама аўтарскія выданні гэтай плыні («book-art») «Доля», «Поўня», «Ліставей» (усе 2007), адзначаныя за мяжой. Кніга графікі і паэзіі «Нетры» на Міжнародным кніжным кірмашы ў Франкфурце-на-Майне (Германія, 2005) атрымала высокую ацэнку і ўвайшла ў лік ста найлепшых кніг свету. Паэтычна-графічны дыялог «Палын. Чарнобыль» на Міжнародным конкурсе выяўленчых мастацтваў (Бельгія, 2006) узнагароджаны элітным залатым медалём.

Гэтыя кнігі сведчаць пра адметны перыяд у развіцці айчыннага кнігавыдання, пра творчы працяг традыцый, закладзеных нашымі першадрукарамі. Літаратурна-мастацкая вобразнасць гарманічна яднаецца з выяўленча-мастацкімі сродкамі — і кніга выступае не зборнікам паэзіі і малюнкаў, а цэльным творам — абагульненым сімвалам адлюстраванай рэчаіснасці. Тут усё прадумана: і структура выдання, якая нагадвае музычны гукарад, і суаднесенасць уступа і канцоўкі, і ўпарадкаванасць заставак і малюнкаў, і афармленне вокладкі і ўсяго кніжнага апарату. Таму гэтыя выданні кампазіцыйна нагадваюць музычныя творы. Кніга «Нетры» выглядае патэтычнай сімфоніяй, у якой апяваецца харастваа роднага краю. Выданне «Палын. Чарнобыль» — літаратурна-мастацкі рэквіем, у якім гучаць-пераклікаюцца галасы нябёсаў, зямлі і спакутавана-неўміручага, духоўна-ўзнёслага люду.

Кнігі «Нетры» і «Палын. Чарнобыль», вылучаныя на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь, чакаюць прызнання на Радзіме — тут, дзе плённа разгортваецца сумесная дзейнасць Міхася Башлакова і Міхася Барздыкі, іх карпатлівая праца па яднанні духоўных плыняў — развіцці адметных па змесце і форме паэтычна-мастацкіх выданняў.

Міхась ШАВЫРКІН.

АРЭНДНЫ ТУПІК

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— З такой арэнднай платай існаваць нашай установе адназначна немагчыма, — канстатуе Галіна Сарока. — Будзем вымушаны зачыніцца альбо, мажліва, галерэю выкупіць фірма, якая пастаўляе нам фарбы.

Галіна Канстанцінаўна пакуль не мае на руках дагавора з новымі ўмовамі арэнднай платы за памяшканне, аднак у аддзеле камунальнай маёмасці і прыватызацыі Гродзенскага гарвыканкама карэспандэнта «Звязды» з гэтым дакументам азнаёмілі. Паказалі таксама пісьмо на адрас фонду «Гроднааблмаёмасць», у якім гарадскі выканаўчы камітэт просіць устанавіць паніжаючы каэфіцыент 0,4 да базавых ставак арэнднай платы для памяшканняў, што выкарыстоўваюцца для размяшчэння выставак прадметаў мастацтва і народнай творчасці. Начальнік аддзела культуры гарвыканкама Генадзь Жалязняк спадзяецца, што, як і раней, на абласным узроўні будзе аказана дапамога ў даціраванні арэндных адносінаў установам, якія займаюцца не вытворчасцю, а мастацтвам. Аднак наколькі гэта рэальна? Разгледзеўшы хадайніцтва гарвыканкама, камісія фонду «Гроднааблмаёмасць» прыняла рашэнне «адмовіць ва ўстанаўленні паніжаючых каэфіцыентаў да ставак арэнднай платы ў сувязі з адсутнасцю прававых падстаў».

Што ж чакае галерэю «Тызенгаўз» далей? Скарачаць свае плошчы, а разам з тым і памер арэнднай платы? Але не скажаш, што цяпер тут ёсць нешта лішняе, без чаго можна абысціся. Неяк кампенсаваць павышэнне расцэнак за арэнду пашырэннем гандлёвага абароту? Аднак гэта лагічна зрабіць толькі за кошт тавару, які будзе арганічна глядзецца побач з карцінамі, а на фарбах, паўторымся, падвышкі не зробіш. Уводзіць для наведвальнікаў продаж білетаў? Ці, мо, усё ж будуць атрыманы дзяржаўныя прэферэнцыі па арэнднай плаце за памяшканне?

— Гэта адна з лепшых мастацкіх галерэй у Беларусі, — лічыць гродзенскі мастак Вацлаў Спорскі, з якім мы тут сустрэліся. — У галерэі «Тызенгаўз» з задавальненнем выстаўляюцца мастакі не толькі з нашага горада, але і са сталіцы, Віцебска, іншых рэгіёнаў рэспублікі. Прычым такіх устаноў у нас вельмі мала: у Гродне на сёння на мастацтва працуюць усяго дзве галерэі і выставачная зала. Для параўнання, толькі ў цэнтры Беластока размешчана пяць падобных галерэй. Мне здаецца, што ўлада павінна падтрымліваць такія культурныя цэнтры. Людзям жа патрэбна нешта для душы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Спорт-тайм

Стартуем у Львове

Сёння нацыянальная футбольная зборная стартуе ў адборачным цыкле ЧС-2010 у ПАР. Першы матч беларусы правядуць у Львове, дзе давядзецца сапернічаць з украінскімі гульцамі. З «жоўта-блакітнымі» беларусы ўжо гулялі ў адной групе ў адборы да ЧС-2002. Тады ў Кіеве лік нават не быў адкрыты, а ў Мінску наймацнейшымі аказаліся госці — 2:0. Сёння ж у групе 6 адбудуцца яшчэ два матчы: у Барселоне андорцы прымуць англічан, а ў Загрэбе харваты — казахстанцаў. Усе еўрапейскія ўдзельнікі чэмпіянату свету вызначацца восенню наступнага года. Напрамую ў фінальную стадыю выходзяць лепшыя зборныя дзевяці адборачных груп, а яшчэ чатыры пропускі здабудуць пераможцы матчаў плэй-оф, дзе згуляюць каманды, якія зоймуць другія месцы.

«Шахцёр» ледзь не выбыў з Кубка

Першыя пуцёўкі ў 1/8 фіналу Кубка Беларусі заваявалі футбалісты вышэйшай лігі. Раней за астатнія клубы ў гэту стадыю розыгрышу прабіліся мікашэвіцкі «Граніт», мінскі МТЗ-РІПА, гродзенскі «Нёман» і сталічны «Лакаматыў». У другі турнірны дзень (4 верасня) у гульнях 1/16 розыгрышу з прадстаўнікоў эліты цяжкасці адчуў на сабе толькі салігорскі «Шахцёр». Асноўны час гарнякі завяршылі ўнічыю (2:2), прычым камандзе Юрыя Вяргейчыка давялося адыгрывацца. І ўсё ж «Асіповічы» не здолелі выйграць у «Шахцёра» на родным полі — 2:4. У Рэчыцы «Смаргонь» перамагла мясцовы «Ведрыч-97» — 1:0, а ў Нясвіжы наваполацкі «Нафтан» засмуціў «Верас» — 2:0.

У беларускіх легіянераў новы трэнер

Кіраўніцтва ўкраінскага клуба вышэйшай лігі «Ілычавец» (Марыупаль) звольніла Аляксандра Ішчанку з пасады галоўнага трэнера. Выконваць яго абавязкі будзе Ілья Блізнюк. Сярод яго падапечных і тры беларускія футбалісты — нападаючы Павел Бяганскі, паўабаронца Мікалай Кашэўскі і абаронца Павел Кірыльчык. Развіталася са сваім настаўнікам беларусам Міраславам Рамашанкам і расійская каманда «Том». Новым рулявым назначаны Васіль Баскакаў.

Пасля Швецыі — у Беларусь?

Днямі сталі вядомыя сапернікі нашай краіны ў своеасаблівым спаборніцтве на права прыняць чэмпіянат свету па хакеі з шайбай 2014 года. Жаданне правесці гэты лядовы форум таксама выказалі Чэхія, Венгрыя, Латвія і Украіна. Хто ж акажацца гаспадаром турніру, даведаемся ў маі 2009 года. Рашэнне будзе прынятае на наступным кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея ў швейцарскім Берне. Нагадаем, што ў 2009-м чэмпіянат свету пройдзе ў Швейцарыі, у 2010-м — у Германіі, у 2011-м — у Славакіі, у 2012-м — у Фінляндыі, у 2013-м — у Швецыі.

Рабочы ў правінцыі падрабляў грошы

У Глыбоцкі РАУС з філіяла «Беларусбанка» паведамілі, што пры перараздзе грашовай выручкі, што паступіла з двух крамаў «Юбілейны» і «Вектар», знайшлі дзве купюры — 100 і 50 тысяч беларускіх рублёў з яўнымі прыкметамі падробкі. У прыватнасці, адсутнічалі вадзяныя знакі і абаронная палоска. Міліцыянеры ўстанавілі, што фальшывыя грошы збываў 30-гадовы рабочы. Канфіскаваны капіравальная і камп'ютарная тэхніка, дзве фальшывыя купюры па 100 тысяч беларускіх рублёў. Вядзецца следства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДТЗ справакаваў... дым?..

Паблізу вёскі Орданцы Шклоўскага раёна пад коламі аўтамабіля загінула немаўля. Дарожна-транспартнае здарэнне, паводле папярэдняй інфармацыі, справакавала тое, што аўтамабіль «УАЗ», якім кіраваў 27-гадовы вадзіцель, трапіў у дымавую завесу: непадалёк палілі ржышча. 38-гадовая жанчына, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, ішла з каляскай па дарозе, калі і адбылася бяда. Жанчыне была аказана медыцынская дапамога без шпіталізацыі, а вось яе гадавалы сын у ДТЗ загінуў.

Ігар ГРЫШЫН.

Наша ахова нас сцеражэ

З 2 па 6 верасня ў Смаргоні праходзіць VIII рэспубліканскі адкрыты агляд-конкурс прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў Дэпартамента аховы МУС Беларусі. Сёлета за званне лепшых аховуікаў і атрымаць службовы аўтамабіль у якасці падарунка паспаборнічаюць не толькі беларускія каманды, але і госці з Украіны, Расіі і Малдовы.

Каманды за некалькі дзён павінны прайсці шмат конкурсаў: гэта і рукапашны бой, і стральба з табельнай агнястрэльнай зброі, здача нарматываў па фізічнай падрыхтоўцы, фігурнае кіраванне службовым аўтамабілем. Самым яркім і запамянальным для гледачоў прайшоў конкурс пра пераадоленні спецыяльнай паласы перашкодаў міліцыянерамі-кінолагамі разам са сваімі выхаванцамі.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

Недзіцячыя праблемы

НЕЗАДАВОЛЕНАЯ ПАТРЭБА,

або Міфы і рэчаіснасць пра дзіцячыя садкі

Міф 1.
Без хабару ў садок трапіць немагчыма

«Чым адрозніваецца дзіцячы садок ад ваенкамата? Каб аддаць дзіця ў садок, трэба даць хабар. Ваенкамат працуе па зваротным прынцыпе».

Гэты анекдот недалёкі ад рэчаіснасці, праўда, асабіста я, ведаючы вялікую колькасць гісторый пра тое, з якімі цяжкасцямі ўладкоўваюць дзяцей у садок, не ведаю ніводнай, дзе прыбягалі б да хабару. Тое, што трапіць у дзіцячы садок складана, асабліва ў новых раёнах, не сталі абвяргаць нават у камітэце адукацыі сталічнага гарвыканкама. Да праблем рыхтавалася і я, збіраючыся аддаваць сваю дачку ў яслі. І была нямала здзіўленая, калі ў сакавіку мне дадому патэлефанавала загадчыца аднаго з трох садкоў, размешчаных побач з домам: «Калі хочаце прыйсці да нас у верасні, запісвайцеся». І параіла пахадзіць па астатніх дзіцячых установах, выбраць, што спадабаецца. Адкуль такі прагрэс, пыталася я ў сябе і не знаходзіла адказу. З чаго б гэта да нас такая ўвага: у чарзе мы не стаялі і паўгода, а раён самы што ні на ёсць спальны, з новай забудовай? Аказваецца, ёсць свае плюсы і ў чарзе. Я паглядзела на выхавальніхаў у адным садку і ў іншым, і выбрала той, у які запрашалі. Праз год магу сказаць, што не пашкадавала. Нам пашанцавала з выхавальнікамі, хоць садок самы звычайны. І кормяць дзяцей не чатыры, а ўсяго тры разы, з-за чаго ён лічыцца так сабе. Не тое што суседні, куды і ломяцца большасць прагрэсіўных бацькоў нашага мікрараёна.

Наконт таго, ці маюць бацькі права самастойнага выбару дзіцячай установы, у сталічным камітэце адукацыі мне растлумачылі, што маюць, праўда з фармулёўкай «пры наяўнасці свабодных месцаў». Выдатная агаворка, якая пакідае загадчыцы дашкольнай дзіцячай установы і іншым чыноўнікам адукацыі некаторае месца для манеўру. Напрыклад, такога. У суседнім садку загадчыца ў размове высвятляе, дзе працуюць бацькі. «Электрык? Выдатна, у нас там у падвале абсталяванне сапсавалася... Індывідуальны прадпрымальнік, займаецеся пастаўкай камп'ютарных камплектуючых? Ведаеце, у нас, на жаль, няма пакуль месцаў». Праўда, жонка прадстаўніка малога бізнэсу ў такой сітуацыі без бою вырашыла не здавацца. Размовы на павышаных тонах у раённым выканкаме не дапамаглі — няма і ўсё. Затое ў Мінгарвыканкаме праблема была вырашана імгненна і з прабачэннямі за дзеянні раённых чыноўнікаў. І месца ў садку, само сабой, знайшлося.

Міф 2.
Стаяць у чарзе трэба з нараджэння

Стаяць у чарзе з нараджэння — яшчэ не значыць, што ў садок удасца трапіць лёгка і без праблем. Справа ў тым, што банк даных, як афіцыйна называецца чарга, у кожным раёне свой. І мая знаёмая, якая жыла ў спальным раёне на акраіне і стала ў чаргу, нарадзіўшы сына, адпаведна ў адным раёне горада, праз год размяняла кватэру і, пераехаўшы ў іншы раён, пачала ўсё спачатку. У два гады ў яслі аддаць сына не ўдалося — свабодныя месцы «ў наяўнасці» былі толькі ў адным садку ў раёне старой забудовы — дзесяць прыпынкаў грамадскага транспарту з перасадкай. Без уласнага аўтамабіля гэта нерэальна — уявіце, як дабірацца зімой, у моцныя маразы ці эпідэмію грыпу, скажам. Другі варыянт, які і выбрала мая знаёмая — пачакаць да трох гадоў.

Мікрараён яе ў цэнтры горада і не новы, побач чатыры(!) дзіцячыя садкі. Са сваім рэйтынгам у бацькоў. Адзін самы-самы. Раней там была загадчыца-энтузіястка, якая прывівала выхаванцам звычку да здаровага ладу жыцця — басейн, практыкаванні, загартоўванне. Садок быў адным з лепшых у горадзе. Цяпер той загадчыцы няма, а слава засталася. Па-ранейшаму туды возяць дзяцей з усяго горада. Трапіць туды мая знаёмая і не разлічвала. Іншая справа — садок нумар два ў рэйтынгу, на які ў душы і разлічвала сяброўка. «Безумоўна, вы туды трапіце, — заверылі яе ў выканкаме. — На чаргу ў садку станавіцца не трэба». Гэта і было ракавой памылкай. У жніўні пасля размеркавання ў раённай адміністрацыі знаёмая знайшла прозвішча свайго сына ў самым горшым, паводле меркавання бацькоў, садку. «Мой сын на прагулцы праз агародж будзе назіраць за бамжамі», — гэтыя яе словы памятаю дагэтуль — побач з дзіцячай установай пункт прыёму друсганай сыравіны. І пачалося. Знаёмая і яе муж асаджвалі адміністрацыю з патрабаваннем паказаць спісы. Высветлілася, што чалавек 15, якія сталі ў чаргу пазней, трапілі-такі ў лепшы садок. У кагосьці туды ходзіць брат ці сястра, і ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі, ім адмовіць нельга. Нехта з такой пасадай, «што вы самі разумееце»... І калі ў чарговы раз знаёмая прыйшла ў адміністрацыю раёна, падрыхтаваўшы пагрозы скардзіцца і пралік інстанцый, куды накіруюцца скаргі, супрацоўнікі аддзела дашкольнай адукацыі нечакана здаліся без бою і пагроз. І ў гэтай сітуацыі я не зайздрошчу ні аднаму, ні другому боку.

Міф 3.
Чым лепшы садок, тым меншыя паборы з бацькоў

Такім чынам, сын маёй знаёмай наведвае, як памятаем, садок з другой колькасцю балаў у табліцы пераваг бацькоў. Там перш-наперш маёй знаёмай прапанавалі набыць і прынесці грунт для газона і корм для жывога кутка. І тут яна парадавалася, што сын не трапіў у самы лепшы садок. Там бацькоў сустракалі словамі «У нас нічога няма. Вось вам спіс». А ў спісе, напрыклад, дыван на падлогу ў групе, люмінісцэнтныя лямпы, жалюзі... Трэба было выбраць і набыць штосьці з прапанаванага, і не ў складчыну з іншымі бацькамі, а самастойна. Або пералічыць грошы на рахунак. Адна матуля прапанавала пералічыць сто тысяч рублёў, на што пачула ад загадчыцы: «Ну што з вамі рабіць, калі вы такія бедныя, пералічвайце хоць столькі. Тата дзяўчынкі з вашай групы, між іншым, пералічыў мільён!» Для параўнання заўважу, што ў сціплы садок, куды ходзіць мая дачка, ніякіх набыткаў нам рабіць не прапануюць. У нас няма жывога кутка і газон самы звычайны з грунтам, які быў там і дваццаць гадоў таму. Пралетарскі раён, што з нас возьмеш, акрамя абавязковых адлічэнняў на цацкі, напрыклад. Дзесьці ў кастрычніку, пасля таго, як усе бацькі набылі канцтавары, на першым бацькоўскім сходзе выхавацелька звярнулася: «Паглядзіце, з чым гуляюць вашы дзеці!» Мы паглядзелі і скінуліся па 75 тысяч. Потым па 20 на навагодні ранішнік, потым па столькі ж на 8 Сакавіка і яшчэ па столькі ж — на выпускны з ясельнай групы. Па 25 — на рамонт групы ў маі і яшчэ па 25 — на фотаальбом. Фотаальбом, у якім усяго дзве старонкі, здаваўся мне яўна лішнім у гэтым спісе і так хацелася эканоміць, аднак усе бралі, і мне давялося. Выхавальнікам складана ўсё ж такі адмовіць. Тым больш, што нам з імі, лічу, пашанцавала. У канцы года мы напісалі нават пісьмы-падзякі ў адміністрацыю раёна. Цяпер мяне, як аўтара гэтай ініцыятывы, ведае ў твар загадчыца, і новыя выхавальнікі ў групе, куды прыйшла дачка, адчуваецца, таксама шмат чулі пра мяне...

Афіцыйна

Праблема з месцамі ў дзіцячых дашкольных установах абмяркоўвалася сёлета на самых высокіх узроўнях. У камітэце па адукацыі Мінгарвыканкама паведамілі, што ў гэтым годзе ў Мінску будуць адчынены дзве новыя новабудоўлі на 380 месцаў у мікрараёнах Сухарава і Лошыца. А да 2014 года плануецца ўвесці ў строй 26 дзіцячых садкоў на 5 тысяч 590 месцаў. Будаўніцтва дашкольных устаноў абыходзіцца гарадскому бюджэту ў суму ад 6,3 да 7,5 мільярда рублёў у год. Пакуль што для забеспячэння мінчан месцамі ў дашкольных установах часткова выведзены першыя класы з шэрагу дзіцячых садкоў, некаторыя дзіцячыя садкі, якія раней былі занятыя іншымі ўстановамі, вяртаюцца ў сістэму дашкольнай адукацыі.

Увогуле ж дашкольная адукацыя сталіцы прадстаўлена 420 дзіцячымі садкамі. З іх 371 установа ўпраўлення адукацыі, 34 — ведамаснай прыналежнасці, 15 — рэспубліканскай уласнасці. Побач з традыцыйнымі мадэлямі дашкольнай адукацыі ў сталіцы актыўна пашыраецца сетка новых тыпаў устаноў. Апошнім часам адчынена 9 цэнтраў развіцця дзіцяці, 4 комплексы «дзіцячы садок-школа».

На падтрыманне матэрыяльна-тэхнічнай базы дашкольных устаноў Мінска сёлета выдаткавана 15 мільярдаў рублёў. Гэтыя сродкі расходуюцца на набыццё абсталявання, дзіцячых пляцовак, спартыўнага інвентару, цацак. Па інфармацыі камітэта адукацыі, у 2004—2007 гадах на гэтыя мэты было зрасходавана 12 мільярдаў рублёў. Дзіцячыя ўстановы наведвае 76 тысяч дзяцей. Праектныя магчымасці — 93 тысячы 360 месцаў. «Мы маем магчымасці задаволіць заяўкі бацькоў унутры тэрыторыі раёна пражывання, аднак большасць бацькоў хоча вадзіць дзіця ў садок побач з домам», — паведамілі ў камітэце па адукацыі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Журналісцкае расследаванне

«ПРЫВІТАННЕ, МАМА...»

Дзіцячы дом сямейнага тыпу зачыняецца. Згодна з інструкцыяй, кватэру трэба вызваліць. Сям'я не пагаджаецца...

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 5 верасня.)

МІКОЛА

Другі ўдар і хутка пасля Крысціны нанёс Мікола, іх першынец, усыноўленае дзіця. Надзвычай здольны, артыстычны і ўпарты хлопчык, у першым класе ён быў выдатнікам, да пятага добра вучыўся, лёгка схопліваў новы матэрыял. Але з шостага пачаліся праблемы (Мікола вучыўся ў адным класе з Крысцінай, якая якраз тады і пайшла з сям'і). У сёмым ён стаў прапускаць урокі, у восьмым зусім перастаў хадзіць на заняткі, стаў валацужнічаць, хлусіць, у яго з'явіліся «дрэнныя» сябры. У снежні Людміла Рубцова не пусціла яго ў школу, да якой ён усё роўна не даходзіў. Сказала: «Сядзі і вучыся дома!» За чатыры дні Мікола самастойна вывучыў усе тэмы па фізіцы, хіміі і матэматыцы, якія ім былі прапушчаны з верасня, і прарашаў усе задачы. Пасля ўзмаліўся: «Пусці ў школу!» Неяк давучыўся год. Але ў 9 класе аказаўся на лаве падсудных разам з яшчэ пяццю такімі ж падлеткамі.

Восем месяцаў пятнаццацігадовы Мікола знаходзіўся ў Жодзінскім следчым ізалятары. Сям'я на той час спакутавалася ад праблем, якія ён стварыў. У міжпакаёвых дзвярах з'явіліся замкі. Але самае цяжкае — дзеці былі настроены супраць Міколы. Суддзя, кажа Людміла Рубцова, ведала гэта і перад тым, як вынесці прысуд, сказала ёй: «Можна даць тэрмін умоўна і можна адправіць яго ў дзіцячую калонію. Усё залежыць ад таго, наколькі неабходна ізаляваць яго ад сям'і». Выбар быў няпросты. На адной чашы вагаў Мікола, на іншай — пяцёра дзяцей. Людміла папрасіла пра ўмоўнае пакаранне.

Цяпер яна ведае, што не памылілася. Следчы ізалятар пайшоў Міколу на карысць. Ён не толькі перастаў красці, грубіць, ілгаць, але і стаў больш мяккім і больш цярпімым. Сям'я яго прыняла. Праўда, за вучобу ён так і не ўзяўся. Два гады прасядзеў у 9-м класе. Рубцовы вырашылі адмовіцца ад усынаўлення, каб вярнуць Міколу льготы, якія належаць сіраце і такім чынам забяспечыць яго паступленне ў вучылішча. З Міколы было знятае ўсынаўленне па яго ініцыятыве пасля таго, як яму споўнілася 18 гадоў. Ён атрымаў спецыяльнасць газаэлектразваршчыка, ажаніўся, працуе, носіць прозвішча прыёмных бацькоў. З Людмілай, якую называе «мама», падтрымлівае адносіны.

Праз чатыры гады пасля суда над Міколам і праз два гады пасля адмены ўсынаўлення муж Людмілы Рубцовай пайшоў з жыцця. Магчыма, нешта канчаткова надламалася ў ім. Суседзі кажуць, што гэты чалавек меў залатыя рукі і надзвычай добрую душу...

ІНШЫЯ ДЗЕЦІ

Артуру, як і Міколу, 22 гады. Ён закончыў вучылішча і працуе столярам у прыватнай фірме ў Жодзіне. Ажаніўся, мае дачку, два гады ўжо жыве ўласнай сям'ёй у доме, у якім вырас, разам з маці і сёстрамі. Незаконна.

— Спецыяліст па апецы кажа: няхай ідзе працаваць на завод, там яму дадуць месца ў інтэрнаце. Але на прыватнай фірме Артур атрымлівае каля мільёна, жонка яго ў водпуску па доглядзе дзіцяці, — гэта адзіны даход сям'і, — заступаецца за сына Людміла. — А на заводзе ён будзе зарабляць 300 тысяч, на якія сям'ю ўтрымліваць не зможа.

У дзень, калі я прыехала да Рубцовых у Жодзіна, Людміле пазваніла Крысціна, папрасілася пажыць з дачкой хоць бы тыдні два. Да гэтага яна жыла ў Мінску, у кватэры бацькоў, але нешта там не зладзілася, і Крысціна вырашыла з'ехаць. «Хатняе» дзіця ў такіх выпадках вяртаецца да маці. Вось і ў Крысціны першая думка была пра Людмілу, і гэта яшчэ адзін доказ таго, што тут яе адзіная апора. Людміла адмовіла, праўда, не толькі таму, што не мае права пусціць Крысціну ў дзіцячы дом сямейнага тыпу, з якога тая пайшла восем гадоў таму. Да таго ж, напярэдадні да іх прыходзіла камісія гарадскога аддзела адукацыі, якая ўказала на незаконнасць пражывання там Артура з сям'ёй. Людміла адмовіла Крысціне яшчэ і таму, што лічыць, што той не хапае цярпення і мудрасці, што сыход з сям'і мужа — памылка. Але тут зноў змяшалася чалавечае і чыноўнае, і ў гэтай колкай сумесі атрымліваюць раны неакрэплыя душы.

Дзецям-сіротам, якіх калісьці аддалі ў сям'ю, каб пазбегнуць хібаў выхавання ў інтэрнатных установах, як толькі яны дасягаюць паўналецця, увесь час нагадваюць: «Вы — не такія, як астатнія. Вы — сіроты. Памятайце пра гэта і не прэтэндуйце на тое, на што можа прэтэндаваць «хатняе» дзіця».

Віка, сястра Артура, вучыцца на трэцім курсе эканамічнага ўніверсітэта. Ганна — чацверакурсніца педагагічнага ўніверсітэта. Канстанцыну застаўся год вучобы ў Выш эйшым радыётэхнічным каледжы. Плануе паспрабаваць свае сілы яшчэ і ў Акадэміі мастацтваў. Аляксандра, яго сястра, сёлета паступіла на біялагічны факультэт БДУ. З яе паступленнем і звязана неабходнасць закрыцця сямейнага дзіцячага дома Рубцовых.

— У жыцці ўсё выглядае зусім не так, як на паперы, — кажа Людміла. — Так, ім даюць бясплатна інтэрнат. Але гэта не пакой, а ложкамесца. І іх сябры будуць на канікулах з'язджаць дадому, а ім не будзе куды паехаць. Да таго ж на лета некаторыя інтэрнаты закрываюцца на рамонт, а гэта значыць, у дзяцей час ад часу будзе ўзнікаць праблема з жыллём. Пакуль яны маюць дом, яны маюць апору.

Чыноўнікі заўважаюць: у Рубцовай ёсць уласная кватэра ў Мінску і дом у Жодзіне, калі яна такая клапатлівая маці, хай прымае дзяцей там. Людміла ўдакладняе: кватэра аднапакаёвая — там няма месца для чатырох студэнтаў (а яшчэ ж Артур з сям'ёй, ды і ў Крысціны з Міколам таксама пакуль няма свайго жылля). Домік стаў за гэты час непрыдатны для жылля, яна плануе яго адновіць, але на гэта трэба час і грошы, якіх пакуль няма ні ў яе, ні ў дзяцей.

— Я кажу інспектару па апецы, што нават несезонныя рэчы дзецям не будзе дзе захоўваць, — перадае Людміла. — А мне ў адказ: хай захоўваюць на складзе аддзела адукацыі. Атрымліваецца, што аддзел адукацыі наняў мяне, каб гэтыя дзеці не адчувалі сябе абдзеленымі, і ён жа зводзіць на нішто намаганні пятнаццаці гадоў. Бо немагчыма адчуваць сябе неабдзеленым, калі табе няма куды паехаць з інтэрната і калі твае рэчы захоўваюцца на складзе ГарАА.

Людміла просіць пра два-тры гады адтэрміноўкі, таму што траім дзецям ужо прапанавалі будаўніцтва кватэр у Жодзіне за ўласныя сродкі і з выкарыстаннем ільготных крэдытаў, і калі яны пабудуюцца, у іншых таксама могуць з'явіцца нейкія варыянты вырашыць жыллёвае пытанне. Але аддзел адукацыі не бачыць магчымасці пакінуць кватэру Рубцовым, бо працоўны дагавор з Людмілай павінен быў скончыцца 31 жніўня. Пакуль ён прадоўжаны да паўналецця Аляксандры, якое наступіць у снежні.

— Пасля гэтага не будзе ніякіх законных падстаў не закрываць гэты дзіцячы дом сямейнага тыпу, — патлумачыла начальнік аддзела сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства Міністэрства адукацыі Галіна Рудзянкова. — А так як гэта кватэра з'яўляецца спецыяльным жылым памяшканнем, то выкарыстоўвацца яна павінна строга па прызначэнні.

Праўда, дадае Рудзянкова, мясцовыя ўлады могуць перавесці кватэру ў сацыяльнае жыллё і выдзеліць тым жа дзецям Рубцовай, якім у адпаведнасці з законам яны павінны прадставіць жыллё на працягу года пасля іх працаўладкавання ў Жодзіне. Артур, між іншым, тры гады ўжо як працаўладкаваны, Крысціна таксама шукае работу ў гэтым горадзе, у якім прайшло яе дзяцінства. Падобная практыка перадачы сямейнага дзіцячага дома ў сацыяльнае жыллё дзецям ужо ёсць у Беларусі. Дзіцячы дом Глухавых у Бабруйску быў падзелены на кватэры і перададзены дзецям з іх новымі сем'ямі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзеці Людмілы Рубцовай — Мікола, Віка, Аляксандра і Канстанцін (злева направа).

Між іншым, сямейныя дзіцячыя дамы, якія будаваліся ў Беларусі з дапамогай дабрачыннага фонду Вялікабрытаніі, увогуле аддадзены прыёмным сем'ям, пры ўмове, што яны пражылі там 10 гадоў. У гэтым ёсць логіка. Бо сям'я — гэта не 10—15 гадоў жыцця разам, гэта магчымасць зносінаў на ўсё астатняе жыццё, магчымасць дапамагаць у выхаванні ўнукаў.

Рубцовых варыянт Глухавых цалкам бы задаволіў, але не жодзінскія ўлады, якія лічаць, што не яны павінны забяспечваць гэтых дзяцей жыллём.

— Рубцова абавязана была паставіць сваіх прыёмных дзяцей на жыллёвую чаргу па месцы атрымання імі статусу сіраты, — каментуе начальнік аддзела адукацыі Жодзінскага гарвыканкама Яўген Горыд. — Мы ёй пра гэта неаднаразова казалі, але яна гэтага не зрабіла. Гэта па яе віне дзеці знаходзяцца ў падвешаным стане і не забяспечаны жыллём.

У гарвыканкаме ўпэўнены, што Рубцова проста не хоча губляць элітную кватэру (там кухня — 16 кв. метраў і зала — 36, самі жодзінцы гэты дом называюць «валютным», бо калісьці ён будаваўся за валюту) і спрабуе ўтрымаць яе ўсімі спосабамі.

Аднак Рубцова паставіла ўсіх дзяцей (акрамя Крысціны і Міколы) на жыллёвую чаргу ў Жодзіне. Менавіта дзякуючы гэтаму траім з пяці: Артуру, Вікторыі і Ганне ўжо прапанавана будаўніцтва кватэр. Прычым яна ж не проста сама гэта зрабіла. На ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, дзяцей прыняў выканкам. Людміла толькі занесла дакументы, нічога ні ад каго не хаваючы. Ды і гісторыю яе сям'і там добра ведалі.

Усе дзеці Рубцовых атрымалі сіроцкі статус у вёсках Мінскага, Валожынскага, Нясвіжскага і Лагойскага раёнаў. Мікола прапісаўся ў доме роднай маці ў вёсцы Пяцеўшчына Мінскага раёна, дзе жылля непрыдатным. Гэта дае яму магчымасць працаўладкавацца ў Мінску. Жыве ён таксама ў Мінску, у доме бацькоў прыёмнага таты, часова. (Зноў жа, бачыце, дзе шукаў і дзе ён знайшоў апору, хай сабе і на некаторы час).

Выпадак з Крысцінай, аб жыццеўладканні якой клапацілася ўжо не Людміла, а школа-інтэрнат і вучылішча, паказальны. Яна скончыла Вілейскае ПТВ на цырульніка, перад выпускам даведалася, што аказваецца за ёй, за яе сястрой і братамі замацавана жыллё ў вёсцы Сямкова Лагойскага раёна. Там яна і прапісана. Я паехала туды з Крысцінай, каб упэўніцца, што ёй прапанавалі такога, пра што не паклапацілася Рубцова для сваіх дзяцей. І бачыла, як загартаваная жорсткімі выпрабаваннямі лёсу Крысціна заплакала, калі пераступіла СВОЙ парог. Заплакала яна ад прынікжэння, бо гэта было цывілізаванае жыллё, а не месца: «Памятай, хто ты і адкуль!» Інакш гэта немагчыма назваць. Без акон і дзвярэй, без электрычнасці, вады, каналізацыі, маленькая брудная кватэрка, у якой нехта зрабіў ужо майстэрню для рамонту аўтамабіляў. Ды і ў самім двухпавярховым шматкватэрным напаўразбураным доме з вечнай вялікай лужынай перад вокнамі жывуць толькі алкаголікі і бамжы.

У Крысціны няма ніякага жадання змагацца за жыллё ў Сямкове. Ды гэта было б і не проста. Цырульнікі там не патрэбныя, толькі даяркі, а калі б яна ўладкавалася даяркай, то двухгадовае дзіця яе не было б каму дагледаць, бо на працу ёй трэба было б сыходзіць у чатыры раніцы, і прыходзіць у адзінаццаць вечара. Муж яе працуе дальнабойшчыкам. Крысціна марыць атрымаць жыллё ў Жодзіне. Яна плануе купіць там прапіску, стаць у чаргу і пабудавацца. Гэта адзінае месца на зямлі, дзе яна адчуе сябе дома. Хоць якраз дома ў яе там няма.

— Дзеці часта не хочуць вяртацца ў тыя мясціны, дзе яны атрымалі статус сіраты, — сказаў мне Якаў Дабрахотаў, начальнік аддзела ЖКГ Валожынскага раёна, адкуль родам Канстанцін і Аляксандра з сям'і Рубцовых. — І іх можна зразумець. Гэта мясціны, дзе з імі адбылася трагедыя, дзе прайшла самая горкая частка жыцця, якую яны імкнуцца забыць.

Новая рэдакцыя Жыллёвага заканадаўства была прынятая ў верасні 2007 года. Да гэтага дзяцей-сірот павінны былі браць на жыллёвую чаргу па месцы іх вызначэння на выхаванне. «Гэта значыць, у Жодзіне, — тлумачыць Рудзянкова. — І так як закон зваротнай сілы не мае, Віка, Артур і Ганна, якія пастаўлены на ўлік да верасня 2007-га, павінны атрымаць жыллё там. Тым жа Заканадаўствам даргледжаны і другі варыянт забеспячэння жыллём — па месцы прадастаўлення першага працоўнага месца». Аднак жодзінскія ўлады ўпэўнены, што нікога з дзяцей Рубцовай не абавязаны забяспечваць жыллём.

Мінскі аблвыканкам рэкамендаваў Жодзіну пакінуць кватэру сям'і Рубцовых да працаўладкавання малодшага дзіцяці.

— Пры ўмове, што Рубцова і дзеці, а Артур ужо працуе, значыць плацежаздольны, самі будуць утрымліваць кватэру, — дадае Ірына Буцвілоўская.

Аднак рэкамендацыя — не загад. Мясцовыя ўлады, магчыма, і хацелі б, але не рашаюцца прымаць рашэнне на карысць Рубцовых. Тым не менш канчатковае рашэнне трэба будзе зрабіць самае позняе ў снежні, калі Аляксандры споўніцца 18. І што тут перавяшць: чыноўніцкае альбо чалавечае — невядома. Хоць, безумоўна, і Яўген Горыд мае сваю праўду, калі кажа: «Мне трэба расфарміроўваць дзіцячы дом, і я мог бы ўжо гэтай восенню пасяліць у гэтай кватэры яшчэ сем-дзесяць дзяцей, якія прагнуць жыць у сям'і. Дык чым ужо дарослыя дзеці Рубцовай лепшыя за шасцігодак з дзіцячага дома?»

Напэўна, ідэальным было б і Рубцовым пакінуць кватэру, няхай як сацыяльную, і не важна — маці будзе жыць там з дзецьмі і нянькіць унукаў, або самі дзеці свайго сем'ямі. Ці як кампраміс — на некалькі гадоў, як яны просяць. І для іншых дзіцячых дамоў сямейнага тыпу прадаставіць жыллё, столькі, колькі спатрэбіцца. Толькі ўся штука ў тым, што мы, як заўважыла Галіна Рудзянкова, імкнёмся падзяліць сем хлябоў на пяць тысяч чалавек. З сацыяльным і спецыяльным жыллём у Жодзіне вялікія праблемы.

Але пакуль мы не навучымся ў сваіх добрых намерах ісці да канца, вынікі нашы будуць сумнымі. Гэта цяжка. Але гэта неабходна.

І вось яшчэ што. Захаваецца сям'я альбо не — залежыць далёка не толькі ад таго, якое рашэнне прымуць жодзінскія ўлады. Па сутнасці, уся гэта гісторыя — строгі іспыт для прыёмнай маці. Калі ёй ўдалося закласці здаровае ядро, сям'я і любоў паміж яе членамі захаваюцца ў любым выпадку. І, напэўна, тое, што яна змагаецца за кватэру — добры знак. Бо лягчэй за ўсё было б ёй з'ехаць у сваю аднапакаёвую ў Мінску і пра ўсё забыць, пачаць жыць цалкам для сябе. Гэты варыянт задаволіў бы чыноўнікаў. Але не мацярынскае сэрца.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Мінск— в. Сямкова — Мінск.

Каментарый начальніка аддзела сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства Мінадукацыі Г.І. РУДЗЯНКОВАЙ:

***— Сям'я — гэта не група людзей,

МІНІСТР БУДНЫ

У Лоску знакаміты асветнік надрукаваў свае галоўныя творы

Сымон Будны часцей узгадваецца ў звязцы з Нясвіжам. І гэта, напэўна, апраўдана — менавіта тут выйшаў вядомы «Катэхізіс». Першая друкаваная кніга на землях сучаснай Беларусі, прычым, што адметна, на старабеларускай мове. Аднак залатой парой у творчасці вядомага асветніка, філосафа і грамадскага дзеяча многія ўсё ж лічаць лоскі перыяд. У маёнтку тутэйшага магната з'явіліся творы, якія без перабольшання ўвайшлі ў сусветную скарбонку. Каб паспрабаваць пачуць крокі Буднага і пабачыць усё на ўласныя вочы, я і накіраваўся прама ў Лоск.

ДЗЕ ТАЯ БУДА?

Дасюль няма дакладнага меркавання ні пра дату нараджэння Сымона Буднага, ні пра месца. Узгадваецца, што ён з'явіўся на свет каля 1530 года ў сям'і дробнага шляхціца. Дакладна вядома адно — нарадзіўся асветнік у паселішчы пад назвай «Буда». Часцей можна пачуць, што гэта адбылося ў Польшчы (у пацвярджэнне версіі ўзгадваецца, што колькі твораў надрукавана на польскай мове). Аднак такіх мястэчак многа ў Беларусі, ва Украіне, у Расіі, ды ўвогуле ва ўсёй Усходняй Еўропе. Так што інтрыга ўсё ж застаецца.

Далейшы жыццёвы шлях Буднага больш-менш вядомы. У чатырнаццаць гадоў ён паступіў на факультэт вольных мастацтваў Кракаўскага ўніверсітэта. Правёў у сценах гэтай навучальнай установы каля дзесяці гадоў, пасля ўдасканальваў сваю адукацыю на тэалагічным факультэце Базельскага, а таксама ў шэрагу іншых еўрапейскіх універсітэтах. У 1558-м Сымон Будны прыехаў у Вільню — тагачасную сталіцу Вялікага Княства Літоўскага. Тут ён выкладаў на беларускай мове асновы тэалогіі ў мясцовым пратэстанцкім зборы. Праз некалькі гадоў стаў кальвінісцкім прапаведнікам спачатку ў Клецку, а пасля ў Нясвіжы. У рэзідэнцыі Радзівілаў пры фінансавай падтрымцы буйных магнатаў Будны заснаваў адну з першых у Беларусі друкарняў. Сюды з Вільні быў перавезены шрыфт, якім у свой час карыстаўся Францыск Скарына. І 10 чэрвеня 1562 года ў Нясвіжскай друкарні выйшаў знакаміты «Катэхізіс», дзе, дарэчы, Будны рашуча выказаўся ў абарону беларускай мовы. Таксама ў гэтым горадзе былі надрукаваныя яшчэ некалькі кніг, у прыватнасці, «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Будны стаў адным з ідэйных правадыроў беларускай Рэфармацыі, адным з кіраўнікоў яе радыкальнай плыні — арыянаў ці, як іх называлі, «літоўскіх братоў». Свае погляды Будны адстойваў праз актыўную літаратурна-публіцыстычную і выдавецкую дзейнасць. Галоўнымі на той час сталі пераклад Бібліі і апокрыфаў на старазапаветныя і новазапаветныя тэмы. Асветнік перазняваў ў Холхава, а неўзабаве і ў Заслаўе. У гэтым горадзе завяршэцца пераклад і Старога Запавету. У друкаваным выглядзе кніга з'яўляецца, як мяркуюць спецыялісты, ва Уздзе. Падчас працы

Мікалай ВАЙЦЮЛЕВІЧ захоплена расказвае пра Сымона Буднага.

над тэкстам Свяшчэннага Пісання найбольш праявіўся перакладчыцкі талент Буднага. Ніхто з тагачасных рупліўцаў, перакананыя многія сучасныя даследчыкі, не меў такога высокага ўзроўню ва ўсёй Еўропе, як беларускі гуманіст. Апрача беларускай ён выдатна валодаў класічнай лацінскай, а таксама старажытнагрэчаскай, польскай, іўрытам ды многімі іншымі мовамі. Зразумела, такі чалавек знаходзіў вакол сябе шмат прыхільнікаў.

ДРАЎЛЯНЫ «ТРОХКУТНІК»

Пасля смерці Мікалая Радзівіла Чорнага Сымону Буднаму трэба было шукаць новых фундатараў сваёй выдавецкай дзейнасці. Такі брат па веры неўзабаве знайшоўся — беларускі магнат Ян Кішка заснаваў у Лоску друкарню і прапанаваў асветніку пасаду міністра. Гэта быў той шанц, якім Сымон не мог не скарыстацца. Такіх шырокіх магчымасцяў у Буднага не было нават у Нясвіжы. Нездарма лоскі перыяд называюць яго залатой парой.

Лоск — сапраўды містычная вёска, якая вядомая з далёкай даўніны. Гэтае месца ўзгадваецца з XIV стагоддзя, і ўжо як умацаванае паселішча. Пра тыя падзеі распавядаецца ў экспазіцыі мясцовага гісторыка-краязнаўчага музея, які, дарэчы, носіць імя Сымона Буднага.

— Лоск можна лічыць адным з пунктаў своеасаблівага трохкутніка разам з Крэвам і Гальшанамі, — заўважае кіраўнік музея Мікалай Вайцюлевіч. — Калі ад апошніх цяпер засталіся «каменныя ўспаміны», то ад нашага драўлянага замка — хіба толькі гарадзішча.

Яно і сёння ўзвышаецца над вёскай больш чым на дзесяць метраў. Сярод месцічаў ходзяць розныя легенды наконт «будаўнічага матэрыялу». Адно з паданняў у сваім вершы выклала тутэйшая паэтка Валянціна Гіруць-Русакевіч. Паводле гэтай версіі, Лоскі замак будавалі з камянёў. Прычым з розных па колеры: спачатку клалі чорныя, пасля карычневыя, шэрыя, а на зубцы — жаўцявыя і чырвоныя. Як толькі завяршылі майстры працу, то пайшоў дождж і замак заззяў рознымі фарбамі. Дзіўны бляск здзіўляў усіх гасцей. З-за чаго знік замак? Зноў-такі каханне! Юнак і дзяўчына жылі б шчасліва разам доўгія гады, калі б не вайна. Прымусіла ліхалецце мужчыну за меч узяцца, а жанчына чакала доўгія сямнаццаць гадоў. Калі сустрэліся, то дзяўчына ссівела, а каханы спачатку яе не пазнаў. Ад адчаю кінулася яна з высокай замкавай вежы. А замак рассыпаўся па каменьчыках...

Кажуць, што з той пары несупакоеная панна маладзіковай яснай ноччу з'яўляецца ў ваколіцах Лоска. То вядзе каня, то на праніку (драўляная плоская прылада, якой раней жанчыны білі лён ці палатно на рэчцы) па вадзе перапраўляецца. Калі нехта гэты прывід убачыць, то галоўнае не спужаць — нават пры малейшым шолаху здань панны імгненна знікае. Магчыма, пра ўсе мясцовыя сакрэты калісьці расказалі і Сымону Буднаму. Ці паверыў легендам асветнік, хто ведае? Ён сваёй справай быў заняты.

У Лоску кнігавыданне вялося неверагоднымі нават па сённяшніх мерках тэмпамі: як вынікае з матэрыялаў музея, толькі ў 1574 годзе ў Лоску было надрукавана пяць кніг! У экспазіцыі можна пабачыць, як выглядала тагачасная друкарня, а таксама фаліянты. Магу вам сказаць, што гэта сапраўдныя творы мастацтва. Таксама побач размешчана схема замка, а яшчэ матэрыялы пра знакамітага земляка. І экзэмпляры з археалагічных раскопак, якія праводзілі супрацоўнікі інстытута гісторыі некалькі дзесяцігоддзяў таму. Напэўна, шукалі сляды друкарні Сымона Буднага. Знаходак было шмат, у тым ліку — вялікі нацельны крыж. Калі яго раскрылі, то высыпаўся нейкі парашок. Экспанат забралі навукоўцы, а ў музеі пакінулі толькі копію. Бадай, галоўную загадку Лоскае гарадзішча даследчыкам тады не раскрыла.

«ЯКАЯ ЛАСКА МНЕ БУДЗЕ»

Мікалай Вайцюлевіч кажа, што да спадчыны Буднага дакрануўся нечакана. У Лоск прыехаў у 1973-м, пасля службы ў войску. І адразу заняўся... будоўляй. Справа ў тым, што ў вёсцы якраз пачалі ўзводзіць новую школу. Двухпавярховы будынак узводзілі побач з новым кварталам, які сярод месцічаў атрымаў назву «гарадок». Вяскоўцам дзіўна было пасяліцца ў сапраўдных кватэрах, дзе былі амаль усе гарадскія выгоды.

— У старой школе быў створаны гісторыка-краязнаўчы куток, — заўважае Мікалай Вайцюлевіч. — А як перайшлі ў новы будынак, то трэба было справу далей працягваць. Пры ўдзеле вучняў, бацькоў, настаўнікаў і быў створаны музей імя Сымона Буднага. Калі заняўся гэтай работай, то яна мяне вельмі зацікавіла. Давялося ад матэматыкі «ўлезці» ў гісторыю. І цяпер я тут галоўны захавальнік.

Дванаццаць кніг Будны надрукаваў у Лоску. У музейным раздзеле «Святло далёкага мінулага» аб гэтым узгадваецца. У 1574 годзе ўпершыню ў сусветнай літаратуры выйшаў Новы Запавет з прадмовай, каментарыямі і заўвагамі. Зноў-такі Будны пацвердзіў свой высокі ўзровень — выданне выклікала шырокі рэзананс. Таксама сярод тагачасных навінак — «Аб фурыях, ці французскія вар'яцтвы». У гэтай кнізе расказваецца пра жудасныя падзеі Варфаламееўскай ночы і гучыць папярэджанне грамадзянам ВКЛ, дзе ў той час разгортвалася нежартоўная рэлігійная барацьба.

15 жніўня 1576 года Будны надрукаваў у Лоску свой асноўны тэалагічны трактат «Аб найгалоўнейшых палажэннях хрысціянскай веры». У гэтым творы асветнік падагульніў свае рэлігійна-філасофскія погляды. Ён сцвярджаў чалавечую прыроду Хрыста, выступаў супраць занадта жыцця і незямнога свету. Аднак Будны лічыў, што і без дапамогі царквы чалавек не здолее дасягнуць маральнай дасканаласці. «Якая ласка мне будзе — не ведаю, — пісаў Сымон Будны. — Але пра тое зусім не дбаю. Мне досыць ужо таго, што не закапаў майго малога таленту, а прынёс карысць... Усю маю працу няхай ацэняць наступныя пакаленні».

У Лоскім музеі, паводле слоў яго дырэктара Мікалая Вайцюлевіча, захоўваецца мабыць адзіны ў свеце каляровы партрэт Буднага. Яго намаляваў самадзейны мастак Уладзімір Дурко. Увогуле гэты апантаны чалавек падарыў музею 46 карцін і эцюдаў. Цяпер базавая школа ў Лоску зачынена, а ў будынку налета плануюць размясціць дом састарэлых на 80 месцаў. Музей застанецца — прынамсі, так запэўнілі Вайцюлевіча. Музей, а таксама памятная дошка нагадваюць аб дзейнасці вядомага беларускага асветніка ў Лоску. Міністр Будны і дасюль гаспадарыць у невялікай беларускай вёсачцы.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Валожынскі раён.
Фота аўтара.

НЕ СОРАМНА І ПЕРАД ЯПОНЦАМІ

Ураджэнец Беларусі Восіп Антонавіч Гашкевіч быў першым расійскім консулам у Японіі (з 1858 па 1865 год). Ён нарадзіўся ў 1815 годзе, аднак доўгія гады жыў у Пецярбургу. І толькі ў 1867 годзе гэты вядомы вучоны і асветнік (напрыклад, ён дасканала валодаў 13 мовамі) вярнуўся на радзіму, недалёка ад Астраўца набыў маёнтак, узяў другі шлюб з дачкой адстаўнога палкоўніка. Памёр Восіп Гашкевіч 3 мая 1875 года ад хваробы лёгкіх, быў пахаваны на могілках у Астраўцы. Дагэтуль наш славуты зямляк карыстаецца ў далёкай Японіі вялікай павагай: да магілы знакамітага консула адтуль штогод прыязджаюць госці. Кожны год у іх ёсць магчымасць пераканацца на ўласныя вочы, як імкліва апошнім часам паляпшаецца жыццё ў СВК імя Гашкевіча.

Уласна, імя знакамітага беларуса гаспадарка атрымала толькі ў 2003 годзе. У 2006 годзе да яе далучылі частку тэрыторыі СВК «Палушы» і цяпер яна мае 6247 гектараў зямлі, з якіх 2791 гектар складае паша. Асноўны напрамак СВК — малочна-мясная жывёлагадоўля з развітым раслінаводствам у галіне вырошчвання збожжа. Моцны «штуршок» у развіцці вытворчасці (ды і дабрабыту працаўнікоў) гаспадарка атрымала са з'яўленнем у 2005 годзе шэфаў у «асобе» Міністэрства гандлю: штогод, паводле слоў прэс-сакратара Алены Кавалёвай, СВК імя Гашкевіча атрымлівае фінансавую дапамогу ад міністэрства ў суме каля 1 мільярда рублёў.

На сродкі ад шэфаў у асноўным набываецца сельскагаспадарчая тэхніка айчыннай вытворчасці, што дазваляе гаспадарцы істотна эканоміць працоўныя і энергарэсурсы. Так, дзякуючы набыццю сушыльнага комплексу «Лід Арай» на дапрацоўцы збожжа толькі сёлетняга ўраджаю было зэканомлена 16 тысяч кВт электраэнергіі. Пасля замены трактароў на энерганасычаныя (такія, як «Беларус-2522, 1221, 1025») у выніку зніжэння расходаў паліва атрымалася зэканоміць 35 мільёнаў рублёў.

За апошнія гады ў СВК рэалізацыя малака вышэйшага гатунку дзяржаве павялічылася на 20 працэнтаў. Гэта стала магчымым дзякуючы набыццю і ўстаноўцы на чатырох малочнатаварных фермах ахаладжальнікаў малака.

Акрамя таго, за кошт фінансавай падтрымкі шэфаў у СВК была праведзена рэканструкцыя малочнатаварнай фермы з пашырэннем да 600 галоў дойнага статку ў вёсцы Малі, што дазволіла гаспадарцы істотна знізіць працаёмкасць, зэканоміць працоўныя рэсурсы і рацыянальна выкарыстоўваць рабочую сілу.

У гаспадарцы актыўна вядзецца будаўніцтва і рамонт будынкаў, ідзе будаўніцтва аграгарадка Малі, які плануецца ўвесці да канца года. Сёлета ж у СВК плануецца адкрыць цэх па вытворчасці блокаў, агароджаў, аўтасэрвіс, мясны цэх, цырульню, пральню, фітнэс-клуб, пяць гасцінічных нумароў. За апошнія два гады тут пабудаваны магазін, таваразварот якога за першае паўгоддзе гэтага года склаў 132 мільёны рублёў.

...На тэрыторыі гаспадаркі ўстаноўлены памятны знак у гонар першага расійскага консула ў Японіі, створаны музей. Жыхароў краіны ўзыходзячага сонца, якія наведваюць яго, безумоўна, цяжка ўразіць і здзівіць эканамічнымі дасягненнямі. Але ёсць усе падставы з гонарам іх паказваць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пад музыку Вінцэнта

Імпрэза

Правядуць гэтую нядзелю жыхары Турава

Музыка для паэта і драматурга Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча была часткай яго свету, нават часткай творчасці. Таму што разам са сваім знакамітым сучаснікам, кампазітарам Станіславам Манюшкам, ён меў дачыненне да станаўлення беларускага музычнага тэатра. Манюшка адчуваў у словах Вінцэнта музыку і змог на музычную мову перакласці яго ідэі. І пісьменнік сам з задавальненнем спяваў партыі ў оперы Манюшкі.

Няма чаго здзіўляцца, што ў год 200-годдзя пісьменніка музычная эліта Беларусі адзначае гэту дату па-свойму: на канцэртах гучаць творы яго сучаснікаў — Станіслава Манюшкі, Міхала-Клеафаса Агінскага, Міхаіла Ельскага, Напалеона Орды. Але і ў наш час ідэі, творы, героі Дуніна-Марцінкевіча натхняюць кампазітараў на стварэнне музыкі. З беларускай музычнай класікай тураўчан працягвае знаёміць Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі. Праграму «Музычны свет Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча» прадставіць у гарадскім Доме культуры камерныя калектывы аркестра. Імпрэза камернай і духоўнай музыкі ў Тураве праходзіць не ўпершыню. Лепшыя музыканты краіны едуць у гэты старажытны горад з багатай гісторыяй яшчэ і дзеля яго будучыні — у таленавітай моладзі Гомельшчыны ёсць магчымасць наведаць майстар-класы ў Жыткавічах і Тураве.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Гомель ушанаваў алімпійцаў

Сярэбранага медаліста дзесяціборца Андрэя Краўчанку і яго трэнера Івана Гардзіенку і бронзавага прызёра па мастацкай гімнастыцы ў камандным першынстве Алесю Бабушкіну з яе трэнерам Лідзіяй Сербінай. Ушанаванне адбылося ў Гомелі ў суботу, 30 жніўня, у Дзень горада. Алімпійцаў і іх трэнераў павіншавалі выконваючы абавязкі старшыні гарвыканкама Сяргей Кавалёў і намеснік старшыні Сяргей Парошын, якія ўручылі ім каштоўныя падарункі. А тыя ў сваю чаргу расказалі аб тым, як яны рыхтаваліся да гэтых адказных спаборніцтваў, якая барацьба ішла за медалі, выказалі спадзяванне, што і ў далейшым у горадзе на Сожы будуць створаны яшчэ лепшыя ўмовы для развіцця фізкультуры і спорту.

Дарэчы, так яно і будзе. У хуткім часе плануецца закончыць пачатую рэканструкцыю спартыўных збудаванняў ДЮСШ № 4 (спартыўная гімнастыка), з'явіцца новая лядовая арэна, плавальны басейн на 50 метраў, разглядаюцца праект па будаўніцтве крытага футбольнага манежа і пытанне аб фінансаванні аб'ектаў конна-спартыўнай школы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Чый тавар?

Каля дзесяці тысяч джэмпераў і 3,5 тысячы кашуль знайшлі апаратыўнікі на швейным прадпрыемстве ў Баранавічах, якое стаіць на ўліку ў Слоніме.

Прадукцыя знаходзілася на складзе, але дакументаў на яе не было. Цяпер у сітуацыі будзе разбірацца суд.

Халадзільнік вінаваты

У магазін па вул. Я. Купалы, што ў Брэсце, зайшоў невядомы і нечакана для прысутных пачаў ламаць халадзільнік.

Беспрацоўнага, які ўжо сядзеў за рабаванне і хуліганства, затрымалі, але ці здолее ён заплаціць 3 мільёны за пашкоджаны халадзільнік?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ТО НАЖОМ, ТО ЛЯЗОМ

Апошнім часам на Гомельшчыне пачасціліся выпадкі, калі ці то мужыкі, ці то жанчыны, а то і ў пары, прыняўшы «на грудзі» алкагольныя напоі, хапаюцца за нажы.

Так было, напрыклад, у Светлагорску, калі пасля сумеснага распіцця непрацуючая 30-гадовая жанчына, якая, дарэчы, асуджалася за крадзеж, параніла ў грудзі свайго сужыльца. Выратаваць яго медыкам не ўдалося.

Тое ж самае напаткала пенсіянера 1937 года нараджэння ў Рэчыцы, калі 46-гадовая сужыльелька «прайшлася» нажом па яго целе. Чалавек сканаў ад страты крыві. Труп быў выяўлены і ў кватэры адной гамяльчанкі, дзе яе сын пасля сваркі забіў сваю знаёмую 23-гадовую дзяўчыну. У бальніцу была дастаўлена адна гамяльчанка, якая скасавала шлюб са сваім мужам, але жыла з ім у сумеснай кватэры. Той прыраўнаваў яе да іншага мужчыны і паласнуў жанчыну лязом па горле. Па ўсіх выпадках узбуджаны крымінальныя справы.

«ЦЯЖКІХ» ПАДЛЕТКАЎ ПРЫНЯЛА ТУРМА. І ШТО Ж?

Для выхавання групы дзяцей, якія знаходзяцца за рознага роду парушэнні на ўліку ў інспекцыі па справах няпоўнагадовых Цэнтральнага аддзела ўнутраных спраў, было вырашана правесці акцыю «Кантрасты». Яе ажыццявілі раённыя арганізацыі БРСМ пры падтрымцы такога ж аддзела дэпартамента аховы МУС краіны. І што ж?

Дзяцей павезлі на экскурсіі ў Мазыр, дзе ім паказалі маляўнічыя мясціны горада, Замкавую гару, спартыўна-аздараўленчы гарналыжны комплекс, дзе яны пакаталіся на атракцыёне «Табаган». Уражанні — самыя лепшыя. І тут жа — рэзкія кантрасты. Калі група наведалася ў папраўчую калонію № 20. Калючы дрот, размовы са зняволенымі, іхняе жыллё, сталоўка... Задумацца сапраўды было над чым. І гэта адразу стала відаць на настрої хлопцаў, які змяніўся. Зрабілі правільныя высновы са сваіх паводзінаў? Зусім магчыма. Бо ўсё бачылі на свае вочы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Простыя рэчы

Уладзімір ВЫСОЦКІ

Маладосці я крыху грашыў рыбным браканьерствам. Уласна кажучы, мы гэта браканьерствам і не лічылі, проста лавілі рыбу на шматлікіх азёрах і рэках нашага краю, як нашы бацькі і дзяды перад гэтым. А вось цяпер, як законапаслухмяны грамадзянін, закінуў далей свой невадок. Як сказаў рускі класік Аляксандр Пушкін: «Я это потому пишу, что сам уж больше не грешу». Але рыбы ў Паставах купіць можна заўсёды. І вось ёсць у нас рыба, ёсць астатнія прыправы для гатавання юшкі. Мы выехалі ў дазволенае месца на беразе возера і распачалі гэтую прынадную для мужчын справу (сапраўдная юшка забараняе прысутнасць жанчын). Пакуль мы размаўлялі, успаміналі, юшкай займаўся адзін кухар, які выклікаўся з нашага асяроддзя, як умелец. Быў ён крыху нападпітку, але, здаецца, справу ведаў добра.

Здымаецца з вогнішча вядро, разліваецца па місках пахкае варыва. Зразумела, па чарачцы. І за лыжкі. А варыва без солі, гэта не юшка, гэта нешта нават агіднае. Солі ў нас не аказалася. Проста забыліся на яе, не захапілі. І ўся працэдура была сапсаваная. Вечар, які павінен быў стаць запамінальным, ператварыўся ў вечар спрэчкі: а хто ж не дадумаўся захапіць солі. Ехаць па яе далекавата. Ды і саліць вараную рыбу, знятую з агню, ужо нікому не хацелася.

Такім чынам, соль. Простая рэч, якую раней дактары называлі адной з белых смерцяў (праўда, цяпер такія заявы чуеш усё радзей, больш гавораць пра соль з ёдам, які нам, беларусам стаў вельмі патрэбным). Без звычайнай жа, простай солі цяжка абысціся звычайнаму, не вымучанаму нейкімі дыетамі чалавеку.

А як чалавек пазнаёміўся з соллю?

Некалі і недзе прачытаў такую версію. Старажытны чалавек еў сваю здабытую ў нялёгкіх пошуках ежу. Магчыма, нейкае смажанае на вогнішчы мяса. І выпала ў яго з рук гэта ежа. Ён падняў, бо нават сённяшні вясковец падыме тое, што выпала, не будзе грэбаваць. А ежа стала смачнейшай. Яна трапіла на саланчак. І менавіта ад гэтага стала смачнейшай. Так чалавек адчуў смак солі.

Версія мае права на існаванне. А, магчыма, у яе знойдуцца апаненты. Толькі не можа чалавек існаваць без солі. А саланчакі — самы прамы яе носьбіт, які ляжыць на паверхні.

Саланчакі — глебы, у паверхневым слоі якіх адзін ці больш працэнтаў воднарастваральных соляў.

А колькі ж у нашай Беларусі назваў, звязаных з соллю! Саланая, Саланое, Саланік, Саланевічы, Саланое і гэтак далей.

Я ведаў, што ўкраінцы сваіх пахаджан за соллю называлі чумакамі. Нават Млечны шлях яны называлі «Чумацкім шляхам». Падавалася, што гэта менавіта ўкраінскае, іхняе. Але, аказваецца, і мы сваю соль у свой час бралі такім жа шляхам. З Крыма. Калі больш дакладна пазнаёміўся з беларускім фальклорам, убачыў: у нас таксама былі свае чумакі. Існуе ў нас процьма менавіта чумацкіх песень. Ну, проста не магу не прывесці адну з іх. Яна так і называецца «Ты чумача, чумача».

— Ты чумача, чумача,
Жыццё тваё лядача:
Ты не косіш, не арэш,
Чаго рана з Крыма йдзеш,
Усіх таварышаў вядзеш?
— Вяду, вяду да не ўсіх,
Толькі нету аднаго,
Братца майго родненькага,
Самага большанькага.
Ён застаўся ў Крыму:
Прабіла соль галаву;
Не соль прабіла — вясы,
Клаўшы соль на вазы.

Гэты народны верш, нават песня цікавыя для мяне дзвюма адметнасцямі. Значыць, Крым са сваёй соллю быў не вельмі бяспечны для тых, хто ездзіў туды за соллю. А па-другое, стаўленне сялян да чумакоў — «ты не косіш, не арэш». Так, сяляне любілі менавіта сваю працу на зямлі, а да іншай, таксама патрэбнай, ставіліся з пэўнай непавагай, як да досыць лёгкай. Такое стаўленне, магчыма, стане зразумелым, калі прывяду яшчэ адну народную песню менавіта пра чумакоў. Ну, гэта ж таксама шэдэўр, які дае нам і нейкія гістарычныя звесткі, і магчымасць зразумець тагачасныя сямейныя адносіны ў вёсцы.

Чумак рана ўставае,
Сваіх хлопцаў пабуджае:
— Уставайце, хлопцы, рана,
Уставайце, вазы мажце,
Сівых валоў запрагайце,
Новы ёрмы закладайце,
У Крым-горад выязджайце...

І чумак раіць сваёй жонцы, якая застаецца ў хаце:

— Заставайся, жана, дома,
Рубай дровы і лучыну,
Цярпі гора і кручыну...

Відаць, не так проста даставалася соль людзям. Асаблівым дэфіцытам была яна ў часы ваенных навал. Старыя людзі ўспамінаюць, што прыпачатку чарговай вайны, якіх на іх вяку было нямала, найперш знікалі соль, запалкі, газа. Ну, самае патрэбнае ў жыцці. Калі нават на сваім панадворку можна і парсючка забіць — патрэбна соль, каб захаваць на нейкі час сала і нейкую вэндліну. Без солі і звычайнай кашы не зварыш. Будзе яна прэсная. Не стаў шукаць у Міхаіла Шолахава, але ўспамінаю, што ў яго «Ціхім Доне» людзі на пакосе ядуць адкінутае кіслае малако, густа прыпраўленае соллю, называлася гэта «казацкай прысягай». Хлеб, пасыпаны соллю, — своеасаблівы рытуал, знак для славянаў, іх успамін аб продках. Пачакайце, у Якуба ж Коласа:

Тым часам маці тарапліва
Закон дзядоў сваіх слаўняе:
Кладзе кусочак хлеба з соллю
Пад красны кут...»

А ў мяне з соллю яшчэ адна асацыяцыя — селядзец. Таксама нешта салёнае, але ж не наша, сялядцы ў нашых азёрах і рэках не водзяцца. Толькі смачна. І зноў успомніўся ранні Максім Танк. Ён быў бунтар і змагар, але пісаў і пра будзённае. Быў ён, аказваецца, і выпіць аматар. Але як паэтычна пра гэта гаварыў:

У прыдарожнай забытай карчме
Нешта зусім не п'янею, шынкарка.
Пэўна, не брагу, а восень у чарках
Сёння падносіш гасцям на начлег.

Так можа напісаць толькі сапраўдны паэт, чалавек, які валодае менавіта сваім бачаннем. Але гэты верш Максіма Танка ўспомніўся мне іншым. Там ёсць радкі, якія ўразілі знаёмым адчуваннем:

Помню печ, ля якой грэліся мы,
Пах селядцоў, кажухоў і махоркі...

Менавіта пах селядцоў, пах солі, якая звычайна не пахне, а вось з марской рыбай стварае своеасаблівы водар. Магчыма, ён некаму і не даспадобы. Ды сёння і селядцы прадаюцца ў такой упаковцы, што паху не пачуеш. А ў маім дзяцінстве заходзіш у краму — і пах салёных селядцоў. Тады іх было вельмі шмат. Тады ў нейкі час іх нават давалі, як здавалася, «у нагрузку». Купляеш нейкія прадукты — як дадатак табе прадаюць і порцыю ўжо ржавых селядцоў.

Але ў нашай мясцовасці салёную рыбу любілі і любяць. Праўда, цяпер яе ў асноўным сушаць. А дзядуля некалі на пост купляў з суседам на двух бочачку селядцоў, прывозілася яна з Калінінграда, які ў тыя часы называўся Кенігсбергам.

Пішучы артыкул, задаў сабе простае пытанне: а як жа ўтвараецца соль?

Ёсць такое азначэнне, як солеўтварэнне. Аказваецца, гэта галагенэз, працэс утварэння лёгкарастваральных соляў — сульфатаў і хларыдаў кальцыю, магнію, натрыю, калію ў паверхневых басейнах. Неабходная ўмова солеўтварэння — пастаянны прагін тэрыторыі, дзе адбываецца соленамнажэнне, магчымасць жыўлення басейна вадою, інтэнсіўнае выпарэнне, якому спрыяе прыдатны клімат.

Вось цяпер і зразумела, чаму Крым быў нашым папярэднікам, запаветнай мясцінай для назапашвання солі. Там якраз усе прыдатныя ўмовы.

Але я зачапіўся за слова калійныя. Пачакайце. А чым жа Беларусь сёння ганарыцца, як не калійнымі солямі. У нас і горад ёсць, які называецца Салігорск, дзе большасць насельніцтва займаецца здабычай на шматлікіх шахтах калійных соляў, без якіх сёння не можа абысціся сельская гаспадарка ўсяго свету. І гэта прыносіць нашай роднай Беларусі, акрамя немалых грошай, яшчэ і сусветную славу.

А ёсць жа яшчэ і салетры, угнаенні вельмі каштоўныя таксама. Ад лацінскага sal nitri — азотнакіслыя солі натрыю, калію, амонію і іншых каштоўных для зямлі рэчываў.

Але звернемся да звычайнай, простай харчовай солі. У народзе нямала звязана з ёй мудраслоўяў.

Насыпаць солі на хвост — добра ўшчучыць чалавека, зрабіць яму нядобрае, але за справу.

Падсыпаць солі — таксама зрабіць не лепш некаму.

Пуд солі з'есці — з некім вельмі падружбавацца, правесці час у агульнай справе.

Соль зямлі — пра лепшых людзей, якія і робяць гэту зямлю знакамітай сярод іншых.

Соль табе ў вочы — прымаўка, якую ўжываюць, каб засцерагчыся ад дрэннага вока, ад суроку.

Сыпаць соль на раны — гэта і моладзь зразумее па знакамітай песні, а яшчэ можна сказаць: не вярэдзьце мае раны.

А музыкант паправіць мяне, што **соль** — яшчэ і пяты гук музычнай гамы, нота, якая яго абазначае.

Ёсць у дзяржаве Перу такая манета, якая называецца таксама **соль**, а ў італьянцаў **сольда** «soldo». Усё ў свеце мае свае карані. І ўсё называецца калі не адналкава, то з нейкай ступенню супадзення. Дазвольце на заканчэнне анекдот. Хоць, гэта было яшчэ. У нашай вайсковай часці, як тады любілі пісаць, служылі воіны амаль шасцідзесяці нацыянальнасцяў. І вось украінец гаворыць: падайце сіль. Рускі папраўляе — соль. А грузін дадае: правільна сол.

А я пажадаю, каб заўсёды ў вас на стале стаяла сальніца і да хлеба, і да ўсяго іншага.

Алесь КАСЦЕНЬ,
г. Паставы.

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА.

Лечымся без лекаў

НЕРВЫ СУПАКОЯЦЬ ГЕРАНЬ І ВАЛЯР'ЯН

Цяперашнее жыццё часта называюць «часам стрэсаў і жахаў». І не дзіўна: без хваляванняў сёння не абыходзіцца ні адзін дзень: калі нас не засмуцяць дома або не аблаюць у грамадскім транспарце, дык, уключыўшы тэлевізар, мы таксама можам атрымаць «дозу» непрыемных уражанняў — ураганы, катастрофы і іншыя надзвычайныя здарэнні — амаль штодзень. Наша нервовая сістэма не вытрымлівае такога націску — мы становімся раздражняльнымі, без прычыны «ўзрываемся», дрэнна спім, хутка стамляемся...

Калі вы сталі адчуваць, што ў вас «здаюць нервы», скарыстайце наступныя рэцэпты народнай медыцыны. З іх дапамогай вы зможаце вярнуць самавалоданне, адрэгуляваць сон, пазбавіцца ад дэпрэсіі і галаўнога болю.

●Самы папулярны заспакаяльны сродак — **валяр'ян.** Можна скарыстаць аптэчныя прэпараты, а можна прыгатаваць лекі самім: 1 ст. лыжку каранёў валяр'яну заліце шклянкай кіпеню і настойвайце 2 гадзіны. Прымайце настой па паўшклянкі 2—3 разы на дзень.

●Звычайная **герань**, якая расце на падаконніку практычна ў кожным доме, здольная здымаць празмернае ўзбуджэнне і дорыць спакой. Калі ў час напружанай працы ў вас з'явіліся галаўныя болі, накацілі цяжар і стомленасць, дапамажыце сабе: капніце 1—2 кроплі эфірнага алею герані на ватны тампон або разатрыце свежы ліст расліны і ўдыхайце жывацворны водар.

●Падлучыцца можна і дзікім **хмелем**. Яго суплоддзі збіраюць, як толькі яны набудуць зеленавата-жоўты колер. Прыемны, крыху гаркаваты чай з хмелю здымае раздражненне, супакойвае. На шклянку чаю бяруць не больш як дзве шышачкі. Гэтымі ж шышачкамі можна напоўніць палатняную падушачку і класці яе на ноч у галовы. Таксама ў падушачку можна пакласці базілік, лаванду, мяту, мелісу, чабор — любую расліну, пах якой вам падабаецца.

●Чай з **мелісы** — незаменны сродак пры неўрозах, галавакружэнні, парушэннях сну. Заспакаяльнае дзеянне мелісы асабліва ярка праяўляецца, калі стрэс паўплываў на органы стрававання: трава здымае спазмы, пасля выпітага кубка такога чаю вяртаецца апетыт. Спосаб прыгатавання: заліце 3 ч. лыжкі сыравіны шклянкай кіпеню, настойвайце хвілін пяць (пасудзіну з настоем абавязкова ўхутайце).

●«Выйсці» з глыбокай дэпрэсіі або змякчыць яе праявы дапаможа **зверабой** — прыродны антыдэпрэсант. Зверабой не толькі супакойвае нервы, але і ўмацоўвае іх. Для прыгатавання настою 1 ст. лыжку здробненай расліны заліваюць 1/2 л кіпеню і пакідаюць на 15—20 хвілін.

●**Пасіфлора (страснацвет)** — экзатычная расліна, якая змяшчае біяфлаваноіды і валодае антыстрэсавымі ўласцівасцямі, дапаможа пазбавіцца ад парушэнняў сну, а таксама ад павышанай узбуджальнасці і прыступаў страху. Спосаб прыгатавання: 1 ст. лыжку сыравіны заліце 200 мл кіпеню, 15—20 хвілін кіпяціце на вадзяной лазні. Адвар працадзіце, а затым уварыце да паловы аб'ёму. Прымаць па 5—10 кропляў, растварыўшы ў 1 ст. лыжцы гатаванай вады.

●Суцішыць галаўны боль, выкліканы нервовым перагрузбуджэннем, паспрабуйце наступным спосабам: вазьміце па **20 г пладоў каляндры, лісця мелісы і мяты.** Збор заліце 100 мл спірту і 20 мл вады, настойвайце суткі, працадзіце. Сурвэтку, змочаную ў настойцы, прыкладвайце да скроняў і патыліцы.

Можна прыгатаваць **фіялкавы воцат:** 1 ст. лыжку мёду растварыць у 250 мл падагрэтага белага віна, дадаць туды дзве жменькі кветак фіялкі і 150 мл воцату. Усё перамяшаць, заліць у бутэльку, настойваць 10 дзён, пасля працадзіць. Пры галаўных болях прымайце настой унутр па 1 ст. лыжцы, змешваючы з вадой, альбо працірайце ім лоб.

●Пры вялікіх фізічных і разумовых нагрузках спраўдзіцца са стомленасцю дапаможа...

...імбірная настойка: 150 г карэння імбіру заліце 0,8 л гарэлкі, настойвайце 2 тыдні, перыядычна ўстрэсваючы. Настой працадзіце. Настойку прымайце 2 разы на дзень па 1 ч. лыжцы, запіваючы вадой.

...мядовая настойка: змяшайце 250 г майскага мёду, 350 г какору, 150 г соку з лісця 3—5-гадовага алоэ. Атрыманую сумесь настойвайце тыдзень у халодным месцы, перыядычна ўстрэсваючы. Настойку прымаюць па 1 ст. лыжцы за паўгадзіны да яды 3 разы на дзень.

●Пасля напружанага працоўнага дня заварыце сабе **чай «Духмяны»**, які насыціць ваш арганізм вітамінамі: вазьміце адзін-два бутоны гваздзікі або кавалачак кораня імбіру, па 1/4 ч. лыжкі кмену, карыцы, мяты і два лаўровыя лісткі, заліце збор 0,5 л кіпеню. Сумесь кіпяціце 30 хвілін, затым дадайце крыху чорнага чаю і настойвайце 5 хвілін. Такі чай добра піць з мёдам.

●**Мёд** — самы бясшкодны з вядомых заспакаяльных і снатворных сродкаў. Пры бяссонніцы развядзіце 1 ст. лыжку мёду ў шклянцы цёплай вады і выпіце за 30—40 хвілін да сну.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ЛЯЧЫЦЦА МІНЕРАЛЬНАЙ ВАДОЙ ВАРТА ТОЛЬКІ ПАСЛЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ З УРАЧОМ

Лекавыя ўласцівасці мінеральнай вады вядомыя з даўніх часоў. І сёння гэта адно з універсальных сродкаў для лячэння і прафілактыкі многіх захворванняў. З пытаннем аб тым, як правільна прымяняць мінеральную ваду, карэспандэнт БЕЛТА звярнулася да загадчыка аддзялення фізіятэрапіі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталлі Афанасенкі.

Лекавыя мінеральныя воды характарызуюцца альбо павышаным утрыманнем мінеральных або арганічных кампанентаў і газаў, альбо нейкімі асаблівымі фізічнымі ўласцівасцямі (радыеактыўнасць, узровень РН і інш.). Менавіта гэтыя характарыстыкі і вызначаюць уплыў мінеральнай вады на арганізм, расказала Наталля Афанасенка.

Пры захворваннях сардэчна-сасудзістай сістэмы, суставаў і пазваночніка, неўрозах, неўрастэніі, скурных хваробах паказаны прыём мінеральных ваннаў. Хімічнае і тэрмічнае раздражненне скуры ў час прыёму такой працэдуры прыводзіць да выдзялення актыўных рэчываў, што стымулюе актывізацыю абменных працэсаў, паляпшае кровазабеспячэнне скуры і ўнутраных органаў.

Існуюць хларыдна-натрыевыя, мінеральна-жамчужныя, мінеральна-ёдабромныя, а таксама мінеральна-хвойныя ванны. Усе яны адрозніваюцца тым, што ўтрымліваюць розныя мікраэлементы, якія па-рознаму ўплываюць на арганізм. Напрыклад, ёдабромныя ванны ўплываюць на шчытападобную залозу, хвойныя — на нервовую сістэму, а хларыдна-натрыевыя — на абмен рэчываў.

Ванны прымаюць курсамі па 10—15 працэдур. Іх можна спалучаць з фізіятэрапіяй, масажам, лячэбнай фізкультурай. Пасля курса лячэння ванны ствараюць устойлівую рэмісію, якая можа доўжыцца ад 6 месяцаў да 2 гадоў.

Лячэнне мінеральнай вадой супрацьпаказана пры ўскладненай форме язвавай хваробы страўніка і дванаццаціперснай кішкі, пры ацэрбагенным гастрыце, пры ацэрбагенным энтэрыце, пры выяўленых парушэннях функцыянальнага стану печані, пры цяжкіх формах цукровага дыябету, пры ацэрбагенным калеце, пры ацэрбагенным калеце, пры ацэрбагенным калеце

Да 600-годдзя Белавежскай пушчы

ПУШЧАНСКІЯ ДАРОГІ

Галоўная пушчанская дарога з Усходу на Захад цягнецца ажно 20 кіламетраў. А з поўдня на поўнач нават больш за 60. У Пушчы захаваліся дзве царскія дарогі па дзесяць кіламетраў кожная і абедзве ў добрым стане. На адной з іх 10 мастоў, якія таксама называюцца царскімі, бо ўзведзены былі падчас праўлення і паляванняў у пушчы імператара Аляксандра III. Цяпер шмат пушчанскіх дарог асфальтуюцца, каб велатурызм быў тут такі ж папулярны, як наведванне сядзібы Дзеда Мароза ці агледзіны жывёл у вальерах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пружанскі і Камянецкі раёны.

Інфраструктура Аўгустоўскага канала павінна развівацца не на словах, а рэальна

Канкрэтныя даручэнні па развіцці турыстычнай інфраструктуры Аўгустоўскага канала, а таксама па вырашэнні шэрагу пытанняў з суседнімі краінамі былі дадзены прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідоркім адпаведным міністэрствам і ведамствам, а таксама мясцовым уладам па выніках рабочай паездкі.

На рэканструкцыю беларускай часткі канала было затрачана каля 40 мільярдаў рублёў дзяржаўных сродкаў з тым, каб зрабіць яго развітым турыстычным цэнтрам, які з часам не толькі акупіцца, але і прынясе дадатковыя даходы мясцоваму бюджэту. Планаў па развіцці турыстычнай інфраструктуры шмат, але мала што на сёння рэалізавана. Пакуль толькі ў праектах можна ўбачыць усесезонныя кафэ, рэстаран-млын, фарэлевыя ставы, гасцініцу, летнюю эстраду...

Якія ўмовы павінны быць створаны інвестарам на Аўгустоўскім канале? Сяргей Сідорскі распарадзіўся стварыць пры аблвыканкаме каардынацыйны савет з іх удзелам, каб аказваць інвестарам дзейсную падтрымку і аператыўна вырашаць існуючыя праблемы. Даручана таксама разгледзець на рэспубліканскім узроўні пытанне надання беларускай частцы канала статусу спецыяльнай турыстычнай зоны, дзе былі б створаны самыя спрыяльныя ўмовы для прыцягнення інвестыцый.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НЕВЯДОМАЯ ЕЎРОПА

Беларуская частка Аўгустоўскага канала і навакольныя мясціны павінны стаць больш вядомымі турыстам дзякуючы праекту «Невядомая Еўропа» па праграме «Тасіс».

Праект разлічаны на два гады. Паводле інфармацыі кіраўніка фірмы «Нямнова-тур» Сяргея Каляды, першы накірунак — гэта падрыхтоўка інструктараў-выратавальнікаў з пасведчаннямі еўрапейскага ўзроўню для суправаджэння турыстаў-воднікаў. Актыўны адпачынак заўсёды звязаны з элементамі экстрыму і небяспекі і толькі пры наяўнасці такіх спецыялістаў можна разлічваць на куды большую, чым цяпер, прывабнасць беларускай часткі канала для водных падарожжаў (сёлета прайшлі 23 сплавы і з іх толькі 6 — з удзелам замежных турыстаў).

Другі накірунак праекта прадугледжвае закупку байдарак, горных веласіпедаў і іншых сродкаў для парку актыўнага адпачынку, а таксама абсталяванне кемпінгавых і палатачных пляцовак еўрапейскага стандарту з адпаведнай інфраструктурай, разлічанай і на інвалідаў. Акрамя таго, маршруты і аб'екты сэрвісу ў зоне канала будуць пазначаныя не проста на карце, а непасрэдна на мясцовасці, каб падарожнік дакладна ведаў, дзе што знаходзіцца.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Открытое акционерное общество «Пивзавод Оливария»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ
о проведении внеочередного собрания акционеров ОАО «Пивзавод Оливария», которое состоится 25 сентября 2008 г. в 09.00 в конференц-зале ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 19.

Форма проведения внеочередного собрания акционеров – очная.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1) О досрочном прекращении полномочий члена Наблюдательного Совета ОАО «Пивзавод Оливария» Эндрю Джона Стивенсона.
2) О досрочном прекращении полномочий члена Наблюдательного Совета ОАО «Пивзавод Оливария» Томаса Кучинскаса.
3) Об избрании членов Наблюдательного Совета ОАО «Пивзавод Оливария».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 25 сентября 2008 года, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию на 12 сентября 2008 года.

Материалы к внеочередному собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 25 сентября 2008 года будут представлены для ознакомления акционерам с 19 сентября 2008 года на информационном стенде в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19.

Регистрация акционеров для участия во внеочередном собрании ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться 25 сентября 2008 года с 07.50 до 08.50 в помещении конференц-зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19 (второй этаж). Регистрация проводится при предъявлении документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании (доверенность) и/или паспорта.

УНН 100128525

Считать недействительным полис по обязательному страхованию владельцев транспортных средств на тер. РФ **серии ААА 288397000, 288397582** и квитанцию **1-СУ серии КВ 4096220**.

Полька беларуская

Бяседныя ПЕСНІ

Песня «Полька беларуская» Ігара Лучанка і Леаніда Дранько-Майсюка абудзіла ўвагу нашага люду да вельмі папулярнага некалі народнага танца. Народжаны ў Чэхіі, ён арганічна прыжыўся ў беларускім краі і пашырыўся. Харэограф і даследчык беларускай народнай харэаграфіі Ларыса Алексютовіч выдала кнігу «Сорак беларускіх полек», у якой падала гісторыю іх узнікнення, апісанне і нотны матэрыял.

У мінулым народныя гулянні, маладзёжныя вечарыны заканчваліся віхурыстай полькай. Пары імкліва кружыліся то ў адзін бок (управа), то ў другі (улева) — па крузе і на месцы, з пераходам і з рознымі выкрунтасамі. Полька патрабавала ад танцораў і майстэрства, і фізічнай вынослівасці. Напрыканцы XX стагоддзя яна, як і іншыя парныя танцы, пачала знікаць з танцавальных залаў. Яе яшчэ можна ўбачыць на канцэртах і на фэстах, дзе праяваннае пакаленне здольнае паказаць свой спрыт...

Вакальны твор «Полька беларуская» спрыяе замацаванню ў нашым побыце такога тэмпераментнага танца. Песня весела гучыць на застоллі, у турысцкай кампаніі і заклікае ад спеву перайсці да скокаў.

Верш Леаніда Дранько-Майсюка
Музыка Ігара Лучанка

Толькі зойдзе ў хату госць —
Будзе ўзята чарка.
Ёсць гармонік, бубен ёсць —
Чым не гаспадарка!
І ад печы, ад сяней,
Колькі маем духу,
Мы заскачам, як раней,
Полечку-трасуху.

Прыпеў:
Полька, полечка-трасуха,
Не чужая — нашая,
Абдымуха, паскакуха —
Лепшае нямашака.
Для цябе штаны малыя
І спадніца вузкая,
Паміж Польшчай і Расіяй —
Полька беларуская!
Між Літвой і Украінай —
Полька беларуская!

Полька беларуская!

Там, дзе сосны — там і лес,
Дзе парог — там ганак,
Дзе Алеся — там Алесь,
Дзе Васіль — там Ганна.
І не трэба нас вучыць,
Абуваць у лапці.
Піць умеем і рабіць,
Полечку скакаці.
Прыпеў.
Не выкідвалі ікон,
Не забылі Бога,
Наша хата — пяць вакон,
Столя ды падлога.
Столя белая-бяла,
А падлога суха,
І ад печы да стала —
Полечка-трасуха.
Прыпеў.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Бульба будзе якаснай і смачнай?

Дзякуючы ўмовам надвор'я, што назіраліся і назіраюцца, якасць ураджаю бульбы сёлета павінна быць нашмат лепшай, чым у папярэднім сезоне, прагназуюць навукоўцы Навукова-практычнага цэнтра НАН па бульбаводстве і плодаагародніцтве. Праўда, падкрэсліваюць яны, калі былі захаваны ўсе рэкамендацыі па абароне бульбы ад фітафторы, у прыватнасці, праведзена як мінімум чатыры апрацоўкі.

Дзе такія рэкамендацыі выконваліся дакладна, на клубнях фітафторы не заўважана ўвогуле або яна прысутнічае мінімальна. Такая бульба павінна захоўвацца нашмат лепей, чым было, напрыклад, летась, калі перад закладкай на захоўванне даводзілася праводзіць цэлы комплекс папярэдніх мерапрыемстваў. Сёлета ж такія рэкамендацыі могуць датычацца толькі асобных участкаў, дзе перад гарачнёй прайшлі дажджы і часовае залішняе пераўвільгатненне глебы назіралася больш за дваты дні. Як раяць навукоўцы, клубні з такіх участкаў трэба асобна перабраць, прасушыць, перад закладкай патрымаць у часовых буртах і — ні ў якім разе не змешваць з «другім хлебам» з іншых месцаў.

Што датычыцца смакавых якасцяў бульбы, дык, зноў жа дзякуючы спякотным умовам надвор'я, яны таксама павінны быць лепшымі, чым летась, асабліва па крухмалістых гатунках. Пры вялікіх працягглых тэмпературах колькасць крухмалу ў клубнях павялічваецца, адпаведна, паляпшаюцца смакавыя якасці (бульба разварваецца). Да прыкладу, сёлета нават «другі хлеб» ранняй групы гатункаў добра разварваўся. Праўда, каб зберагчы гэтыя смак і якасць, трэба яшчэ бульбу і належным чынам захоўваць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У КАМУНАЛЬНІКАЎ СКРАЛІ ЛІЧЫЛЬНІКІ

Прадстаўнікі адміністрацыі аднаго з віцебскіх жыллёва-камунальных упраўленняў паведамілі ў РАУС Першамайскага раёна, што ноччу нехта скраў са складскога памяшкання лічыльнікі вады.

Зламыснік падабраў ключы і ўвайшоў на склад ЖЭУ, які не ахоўваўся (тут і сігналізацыя адсутнічала). Скрадзена 60 лічыльнікаў халоднага водазабеспячэння і 70 мантажных камплектаў. Усё гэта, па ацэнках камунальнікаў, каштуе звыш 2 мільёнаў рублёў. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕ ПАГЛЯДЗЕЛА Ў АКНО

З кватэры па вул. Леніна, якая знаходзіцца ў цэнтры Баранавічаў, 27-гадовая жанчына выкінула на вуліцу бутэльку, якая ўпала на «Сітраен-С5».

Цяпер за пашкоджанне чужой маёмасці жанчына можа атрымаць да двух гадоў турмы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ПЯЦЬ МЕДАЛЁЎ!

У польскім горадзе Шчэціне адбыўся чэмпіянат Еўропы сярод аматараў гульні ў шашкі ўзростам ад 10 гадоў да юніёраў. Нашы гракі парадавалі балельшчыкаў не толькі сваімі вострымі партыямі, але і вынікамі: прывезлі дамоў пяць медалёў (!). Сярод іх залатых — Андрэй Толчыкаў з Гомеля (катэгорыя турніру U-19) і мінчанка Вольга Федаровіч (U-16), сярэбранага — сястра-блізня Вольгі Дар'я (U-16) і Марыя Міронава, таксама з Мінска (U-10), бронзавага — Уладзіслаў Валюк (U-10), сын сталічнага міжнароднага гросмайстра, двойчы чэмпіёна свету па шашках-64 Андрэя Валюка.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-5

У мінулым выпуску мы аб'явілі пяты конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.

Будуць адзначаны пераможцы конкурсу, а таксама суддзя і каардынатар конкурсу, і лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам, трэба быць вельмі пільным і не прапусціць выпадкі, калі будуць у пазіцыях пабочныя развязкі альбо якія не развязваюцца. Таму за ўказанне такіх істотных недахопаў налічваюцца прэміяльныя балы. Норма ж другога разраду — рашыць усе заданні, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно ачко.

А цяпер падаём другое заданне — мініяцюру нашага аўтара з Гродна Міхаіла Стэфановіча:



БЕЛЫЯ: b2, b4, c1, c5, e1 (5). ЧОРНЫЯ: a5, c7, e3, e5, f6, g3 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда».

Разгледзьце таксама такую задумку М. Стэфановіча, але ўжо ў рамках нашага бліца-40/3:



БЕЛЫЯ: b2, b4, c5, d4, g7 (5). ЧОРНЫЯ: a5, c7, d6, e7, f4, g3, g5 (7). Пашукайце і тут перамогу за белых.

Пераможцу чакае сюрпрыз ад Анатоля Пяркальскага (Глыбокае) — яго зборнік звяздоўскай рубрыкі «Шашкі» за 2006 год у афармленні мясцовага «ФОТА-цэнтра».

РАШАЕМ, АТРЫМЛІВАЕМ ПРЫЗЫ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

БЛІЦ-39/5 (П. Шклудаў): 1. ef8 2. f:c5! 3. ce3 4. e:f2!x.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ (П. Шклудаў): № 1. 1. ed4 2. d:h2 3. a:c5 4. c:c5 hg5 5. bc7 gf4 6. cd8 fe3 7. da5 ef2 8. ae1 ab6 9. c:a7 fg1 10. ab8 gd4 11. ef2 12. ba7x.

АМАТАРАМ СТАКЛЕТАК (Д. Камчыцкі — В. Кавалёў): 6. ... 39-43 A 7. 39 (42) 32! (48) 43x. A (38-43, 49) 35 (32) 43, 50-44x.

БЛІЦ-39/6 (А. і А.. Шабаліны): 1. gf4 2. f:h4 bc3 3. ed2 4. ed4 5. ab4 6. cd2 7. gf2 8. h:f4x.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ (А. і А. Шабаліны): 1. dc5 2. cb4 a:e1 3. cb2 4. g:c7 5. gf2x.

БЛІЦ-40/1 (У. Сапяжынскі): c1 (h4) e1 (h6-g5 A, f6) g5, d8x. A (f6) g5 (f4 B) e3x. B (h4) d8 (h6-g5) c7 (f4) g3x.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ (У. Сапяжынскі): a5 (b2) d8 (e7 A) f6 (c1) f6-g5, h6 (e3) d2x. A (c1) h2 (b8) dc7x.

БЛІЦ-40/2 (Я. Палыкоўскі, чорныя): 1. fd6? fe5! 2. d:f4 bc5 (арыгінальна!) 3. fe5 gf4 4. e:h8 5. hd4 6. f:d4 7. g:c1 hg5=.

«ВЯЛІКАЯ КІТАЙСКАЯ СЦЯНА» (Д. Камчыцкі): 23 (48) 33, 37, 41#.

Гэтыя заданні, а таксама бліцаў-38/1-6 і 39/1-4 выканалі І. Буяк (в. Бацяны Воранаўскага раёна), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), Аляксандра Камінская (Віцебск), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), С. Нячаеў (Баранавічы), І. Астроўскі (Мінск), настаўніца фізкультуры Марыя Яўгенаўна Лічко і яе выхаванцы Яўген Казлоў, Анжэліка Кашкан, Джон Мамедаў, Аляксандр і Аляксей Яраховічы (в. Возера Уздзенскага раёна), А. Кіслы (Узда), А. Янчук (Камянец), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), І. Мацкевіч (Жодзіна), А. Пяркальскі і інш. Сярод іх — Васіль Голас (Любань), Іван Працук (Паставы), Анатоль Рогач (Вілейка) і Пётр Шклудаў (Наваполацк) у бліцы- 39/1 (М. Стэфановіч) указалі 1. cd2x і 1. cd8x.

Бліц-38 выйграў Аляксандр Кіслы, а бліц-39 — Васіль Голас. Першаму з іх высылаецца зборнік звяздоўскай шашачнай рубрыкі за 2005 год, другому — за 2006-ты (з прызавога фонду аўтара зборнікаў А. Пярхальскага).

СТАЦЬ НА ЎЛІК

Я малады спецыяліст і размеркавана на работу ў горад Мінск. Іншагародняя, з інстытуцкага інтэрната выпісалі, цяпер не маю рэгістрацыі ў Мінску ні пастаяннай, ні часовай. У жыллёвым аддзеле выканкама мне сказалі, што на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў я магу стаць з кастрычніка 2008 года, толькі абавязкова трэба зарэгістравацца па месцы жыхарства. Чаму толькі з кастрычніка і якія дакументы мне неабходна сабраць да гэтага тэрміну?

Валянціна Р., *г. Мінск*

Згодна з пунктам 7 Палажэння, якое зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2005 г. № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносінаў» са зменамі і дапаўненнямі, улік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ажыццяўляецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па іх пастаянным месцы жыхарства. Пацвярджэннем таго, што ваша пастаяннае месца жыхарства знаходзіцца ў горадзе Мінску, будзе з'яўляцца рэгістрацыя ў Мінску па месцы жыхарства ў парадку, прадугледжаным Палажэннем аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.09.2007 г. № 413.

З кастрычніка вас могуць паставіць на ўлік па той прычыне, што з 07.10.2008 г. уступае ў сілу Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 03.06.2008 г. № 292 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2005 . № 565».

Дзеючым у цяперашні час Палажэннем аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, зацверджаным Указам ад 20.11.2005 г. № 565, прадугледжана, што на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў не прымаюцца грамадзяне, якія прыбылі ў г. Мінск з іншых населеных пунктаў, на працягу 5 гадоў з дня рэгістрацыі іх па месцы жыхарства ў г. Мінску.

Змяненні і дапаўненні, унесеныя ў Палажэнне, якія ўступаюць у сілу з 7 кастрычніка, прадугледжваюць у гэтым плане выключэнне для маладых спецыялістаў, атрымаўшых адукацыю за кошт рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і накіраваных на работу ў г. Мінск па размеркаванні ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Гэта азначае, што з 7 кастрычніка вы можаце падаваць заяву па ўстаноўленай форме аб прынятці вас на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пры сабе неабходна мець пашпарт з рэгістрацыяй па месцы жыхарства ў горадзе Мінску; дакументы, якія пацвярджаюць ваш статус маладога спецыяліста (гэта могуць быць копіі дыплома, пасведчання аб накіраванні на работу і працоўнага дагавора (кантракта)); дакументы, якія пацвярджаюць права на пазачарговае, ці першачарговае прадастаўленне жылога памяшкання (пры наяўнасці ў вас такога права); зместкі аб даходах і маёмасці, якія прыходзяцца на кожнага члена сям'і, калі вы маеце права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання. Астатнія неабходныя дакументы запрошваюцца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам у трохдзённы тэрмін з дня паступлення заявы грамадзяніна. Аднак вы маеце права самастойна сабраць іх і прадаставіць разам з заявай. Гэта, напрыклад, такія дакументы, як даведка аб займаемым у дадзеным населеным пункце жылым памяшканні і складзе сям'і, выдаецца арганізацыяй, што ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, або арганізацыяй, якая прадаставіла жылое памяшканне; даведкі аб жылых памяшканнях, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзяніна і членаў яго сям'і ў населеным пункце па месцы падачы заявы аб прынятці на ўлік, якія выдаюцца тэрытарыяльнай арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй.

Аб рашэнні, прынятым па заяве, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган паведамляе грамадзяніну ў пісьмовай форме на працягу аднаго месяца з дня яе падачы пасля атрымання ўсіх неабходных дакументаў. Грамадзяне лічацца прынятымі на ўлік з дня падачы заявы аб прынятці на такі ўлік пры наяўнасці ў іх падстаў для прызнання маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Адмова ў прыняцці на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў можа быць абскаржана ў судовым парадку.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БАЦЬКОЎСКІЯ КЛОПАТЫ

Разумнікі і разумніцы

Раней лічылася, што першае дзіця ў сям'і — самае разумнае і здольнае. Другое і трэцяе, маўляў, яму ўступаюць. Аднак вучоныя абверглі гэты міф.

Гены і ўзрост маці

На думку спецыялістаў, на дзіцячы інтэлект уплывае не «парадкавы нумар» іх з'яўлення на свет, а ўзрост маці. Параўнаўшы даныя 3000 сем'яў, вучоныя выявілі, што жанчыны, якія нарадзілі дзяцей у маладым узросце, маюць менш шанцаў выгадаваць з нашчадкаў геніяў, чым тыя паненкі, што сталі маці пасля 25—30 гадоў. У прынцыпе гэта заканамерна, бо ў 18 гадоў жанчына менш адукаваная, менш прыстасаваная да жыцця. Не кажучы ўжо пра тое, што ў маладой маці менш фінансавых магчымасцяў, каб даць дзіцяці добрую адукацыю. Ці не таму сёння ва ўсім свеце назіраецца тэндэнцыя да таго, каб абзаводзіцца нашчадкамі ў 30 гадоў і пазней? Яшчэ адзін важны фактар — спадчыннасць. Чым разумнейшыя бацькі, тым разумнейшыя іх дзеці. Прычым інтэлект дзіцяці, на думку вучоных, залежыць у першую чаргу ад інтэлекту маці, а не бацькі. Такім чынам, дарагія жанчыны, калі вы плануеце цяжарнасць, самы час заняцца самаадукацыяй.

Мінімум чыпсаў, максімум рыбы

На інтэлект дзяцей уплывае і харчаванне будучай маці. Чэмпіён сярод прадуктаў, якія «адказваюць» за інтэлект, — тлустыя гатункі рыбы. У такой рыбе змяшчаецца рэчыва з амаль касмічнай назвай амега-3, якое паляпшае разумовыя здольнасці. Дарэчы, ці не гэтым тлумачыцца фенаменальны інтэлект японцаў, у якіх рыба — аснова рацыёну? Вашаму дзіцяці будзе цяжка стаць выдатнікам без фоліевай кіслаты, ёду, цынку, жалеза, лецыціну. Таму заклік лекараў даваць дзецям полівітаміны з'яўляецца цалкам лагічным. Аднак вітаміны вітамінамі, але і рацыён харчавання павінен быць правільным. Мінімум чыпсаў, пэпсі, максімум садавіны, агародніны, малочных прадуктаў. А яшчэ мяса, яйкі, крупы (асабліва грэцкія).

Шахматы плюс...

Нягледзячы на тое, што інтэлект — штука ў многім прыроджаная, бацькі ўсё ж могуць палепшыць разумовыя здольнасці свайго дзіцяці. Бо інтэлектуальны ўзровень дзіцяці залежыць не толькі ад колькасці шэрага рэчыва, але і ад таго, як развіваецца мозг у дзяцінстве і юнацтве. Таму дзеці, з якімі бацькі многа займаюцца, маюць больш шанцаў стаць вундэркіндамі, чым тыя, якія пакінутыя на волю лёсу. Што ж раяць спецыялісты для паляпшэння разумовых здольнасцяў сваіх дзяцей? Па-першае, розныя галаваломкі, рэбусы, шахматы — усё гэта выдатна развівае логіку і матэматычныя здольнасці. Нават калі ваша дзіця не будзе вялікім матэматыкам, а «кінецца» ў гуманітарную галіну, уменне мысліць лагічна яму ўсё роўна спатрэбіцца. Па-другое, маляванне, чытанне мастацкай літаратуры і заняткі музыкай — гэта таксама адаб'ецца на развіцці дзіцяці самым добрым чынам. Невыпадкова цяпер у некаторых еўрапейскіх краінах у радзільных дамах немаўлятам уключаюць Моцарта.

БЕЗ РЭЦЭПТА

Сардэчны «бутэрброд»

Пры любых сардэчных непаладках рэкамендуецца прымаць валяр'ян. Аднак настойка валяр'яну — гэта разавы сродак для заспакаення, пастаянна піць яго не будзеш, асабліва на рабоце. Паспрабуйце прымяніць іншы спосаб: вазьміце зранку кавалак хлеба таўшынёй у палец, разрэжце яго на 4 часткі і на кожную капніце 2—4 кроплі настойкі валяр'яну. Кожныя 4 гадзіны кладзіце ў рот па такім кавалачку і смакчыце некалькі хвілін, пакуль не праглыняце. Малая колькасць валяр'яну трапіць у ваш арганізм самым кароткім шляхам — праз слізістую абалонку рота, мінаючы страўнік.

-2522-

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Шыпшына — на вагу золата

У даўніну на гэту дзіўную расліну адпраўлялі спецыяльныя экспедыцыі. Знахары і траўнікі здаўна выкарыстоўвалі яе ў сваіх леках.

Настоі і алеі з пладоў шыпшыны дапамагаюць ад многіх хваробаў. Сярод іх апёкі, раны, авітаміноз, расстройства страўніка, атэрасклероз. Для прыгатавання лекавага настою *1 ст. лыжку сухіх здробненых пладоў шыпшыны заліце 1 шк. гарачай вады, пракіпяціце 10 хвілін на невялікім агні, настойвайце 30 хвілін, працадзіце. Захоўвайце гатовы раствор не больш чым двое сутак. Прамыйце 2—3 разы на дзень па паўшклянкі пасля яды.*

Алей шыпшыны не дарэмна мае тытул «кароль натуральных алеяў». Уласцівасці яго вельмі разнастайныя. Ён знімае раздражненне на скуры, павялічвае яе эластычнасць, нармалізуе работу тлушчавых і потавых залоз, дорыць твару роўны і прыгожы колер, выдаляе сляды стомленасці і стрэсу, валодае антымікробным дзеянненм, танізуе крывяносныя сасуды. А яшчэ гэта мяккі і ў той жа час магутны антыдэпрэсант, які надае ўпэўненасці ў сабе. Дастаткова штодня ўдыхаць перад сном водар алею шыпшыны.

Найбольш каштоўнымі лічацца буйныя ярка-жоўтыя ягады з венчыкам, які лёгка аддзяляецца. Захоўваць іх лепш за ўсё ў шчыльна закрытых слоіках ці папяровых і палатняных мяшочках максімум два гады. Сушаць спелыя плады шыпшыны цэлымі ці палавінкамі, папярэдне выдаліўшы насенне і валаскі, спачатку пры тэмпературы 100° С (цэлыя плады — 10 хвілін, рэзаныя — 6—7 хвілін), затым дасушваюць пры 70—75° С. У добра высушанай шыпшыны скурка пры сціскванні не мнецца, а спружыніць. Перасушаныя плады рассыпаюцца. Пасля сушкі ператрыце плады ў руках і выдаліце чашалісцікі, 1—2 дні вытрымайце шыпшыну пры пакаёвай тэмпературы.

Са свежых пладоў шыпшыны атрымліваецца вельмі смачныя варэнне, павідла, вітамінныя гарбаты.

ВАРЭННЕ

Буйныя спелыя ягады прамыйце, прасушыце на ручніку. Выдаліце чашалісцікі, разрэжце папалам і маленькай лыжачкай старанна выберыце насенне. Кіпячы сіроп зніміце з агню, апусціце ў яго падрыхтаваныя ягады, пакіньце на 4—6 гадзін. Пасля чаго зноў давядзіце да кіпення, паварыце не больш чым 10 хвілін і зноў пакіньце на 4—6 гадзін. Насычаныя сіропам плады варыце да гатоўнасці, разліце ў слоікі, закатайце.

На 1 кг шыпшыны прыгатуйце сіроп з разліку 2 шк. цукру на 1 шк. вады.

Варэнне набудзе пікантны смак, калі ваду замяніць сокам: яблычным, грушавым, чорных парэчак ці дадаць сок 1—2 лімонаў. Плады з варэння можна выкарыстаць для ўпрыгажэння святочнай выпечкі.

ПАВІДЛА

Падрыхтаваныя плады заліце невялікай колькасцю вады і гатуйце, пакуль яны не стануць зусім мяккімі. Пратрыце масу праз сіта ці двойчы прапусціце праз мясарубку. Працёртую масу патушыце на невялікім агні 30 хвілін, пасля чаго дадайце цукар, добра перамяшайце, варыце да гатоўнасці.

ВІТАМІННАЯ ГАРБАТА

● Сушаныя плады шыпшыны (100 г) гатуйце ў вадзе (1 л) 5 хвілін. Настойвайце 40—60 хвілін, працадзіце, дадайце лімонны сок і цукар (на смак).

● Плады шыпшыны (20 г), рабіны (10 г) заліце вадой, варыце 5 хвілін, потым пакладзіце траву мацярдушкі (5 г), настойвайце 10 хвілін.

-2523-



ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

ДОБРЫЯ РУКІ

Больш не буду казаць, што прадаў карціну ці малюнак, бо гэта не дакладна. Варта гаварыць, што я перадаў палатно ці графічны ліст у добрыя рукі. Днямі Андрэй і Аляксандра выйшлі з маёй студыі з карцінамі. Андрэй упадабаў маленькі партрэт паэта, на стварэнне якога мяне натхніў фотаздымак, зроблены на мітынгу. Аляксандра нагледзела сабе найлепшыя палотны, напісаныя за апошні год: аголеную «Мадам Грызайль» і краявід «У белым доме, ля сіняй бухты...». Маціцовашэрую «Мадам...» я вельмі любіў, і ганарыўся, што нейкім незразумелым чынам мне ўдалося напісаць такое палатно. Без гэтай карціны ў студыі ўтварылася пустата. Пакуль яна вісела на сцяне ці стаяла на мальберце, студыя была запоўнена своеасаблівым мастацкім жыццём. Цяпер давядзецца стварыць тое жыццё наноў.

БАР-ЭБРАЯ І ЛЮДЗІ

У вясёлых аповедах асірыйца Бар-Эбрая, вядомага яшчэ як Абуль-Фарадж, прачытаў, як у аднаго мусульманскага правіцеля спыталі: «Якіх межаў дасягнуў твой розум?». Правіцель адказаў: «Мой розум дасягнуў такіх межаў, што я не веру ніводнаму чалавеку і нікому не давяраю». Адказ правіцеля цяжка назваць вясёлым, але праўда ў ім, безумоўна, ёсць... Аднойчы распавядаў пра свае працоўныя планы гаспадару кафэ «Грунвальд» Аляксандру Астрашэўскаму. «Ты верыш людзям?» — здзівіўся Аляксандр. Я сумеўся і адказаў: «Не веру! Але ж часам, насуперак праўдзе, усё яшчэ хочацца верыць».

ФЕАФРАСТ І ПРЫСАБЕЧВАННЕ

Ёсць кнігі, якія пажадана мець ва ўласнай бібліятэцы, ці хоць быць іх тэкст у сваім прыватным камп'ютары. Але на гэтым жаданне мець не спатольваецца. Напрыклад: у мяне тыя выданні кнігі Феафраста «Характары», і тэкст у камп'ютары ёсць, але гэта ўсё рэчы агульнага карыстання, такія кнігі і тэксты ёсць шмат у каго, а гэта крыху трывожыць маю эгаістычную душу. Мне патрэбен свой персанальны Феафраст. Здаецца, што задача невырашальная. Ды рашэнне знаходзіцца, я пераназываю Феафраста, я прыдумваю яму мянушку Тэахвост. У выглядзе Тэахвоста вялікі грэк мне значна бліжэй.

МУР І ШАБІБ

Да мяне ў студыю завітаў арабскі прынц Шабіб. Ён сказаў, што мае пошукі ў жывапісе выбудоўваюцца на змешванні ідэй Пікаса і Батэра. Давялося прызнацца ў сваёй нелюбові да саладжавага Батэра і любові да брутальнага Мура, для якога ідэальнай формаю быў чэрап слана. Тут і высветлілася, што ў Шабіба было ажно дзве скульптуры Мура, але адну ён падараваў свайму лекару.

ІГНАТ І МАСКА

Ён заводзіць сабе на форумах некалькі псеўданімаў і спрабуе імітаваць думку народу. Маўляў, не адзін чалавек падтрымлівае ягоныя перакананні, а шмат. Толькі таленту ў Ігната — брак. З кожнага псеўданіма тырчаць вушы ўседлівага графамана. Ён прыкладае неверагодныя намаганні для напаўнення сваіх рабоў-віртуалаў характарамі і моўнымі асаблівасцямі, нават памылкі ў тэкстах робяцца запланаванa, але і такі ход не дапамагае, бо таленту ў Ігната — брак. Ён злуецца, мацюкаецца, п'е... Праз няштатныя сітуацыі спрабуе скочыць вышэй за галаву, але намаганні марныя, бо графаману наканавана быць адно графаманам. Ігната я не шкадую. Раней шкадаваў, бо верыў, што працаздольнасць, упартасць і аддanасць беларушчыне, раней ці пазней, а ператвораць графамана ў паэта. Колькасць напісанага мусіла зрабіць якасны скачок. Так і адбылося, толькі змены пайшлі не ў лепшы, а ў горшы бок. Маска віртуальнага ідыёта прырасла да твара Ігната. Не зняць, не змяніць, ні атадраць! Шкадаваць злосную і крывую маску не буду, а намаляваць і апісаць магу. Што і маем.

ВОВА І КОД НАЦЫІ

А восьмай раніцы сын прывёў да мяне ўнука Вову, таму ў парку я бегаў разам з ім. За сняданкам я вучыў шасцігадовага бяззубага Вову простаму вершу: «Мой родны кут, як ты мне мілы. Забыць цябе не маю сілы». Унук хутка запомніў і паўтарыў скарочаны варыянт: «Мой родны кут, забыць цябе не маю сілы». За гарбатаю ён ведаў і паўтараў верш цалкам: «Мой родны кут, як ты мне мілы. Забыць цябе не маю сілы». Звычайныя рэчы, здавалася б. Але на самай справе радкі Якуба Коласа надзвычайныя, бо ў іх захоўваецца код нацыі.

Адам ГЛОБУС.

«МЫ САМІ ЗАПУСКАЕМ КАТАСТРОФЫ ШТОДЗЁННА...»

Хочаце — верце...

Бразільскі прадказальнік Цісэліну загадзя прадбачыў тэракт 11 верасня 2001 года. Акрамя таго, на яго рахунку праўдзівыя прадказанні шэрагу іншых тэрактаў, прыродных і тэхнагенных катастроф, у якіх загінула 220 тысяч чалавек. Будучыя падзеі прыходзяць да Цісэліну ў снах. З 1973 года ён запісаў больш за 30 тысяч эпізодаў, якія ўбачыў у сне, і 90 працэнтаў з іх потым адбыліся ў рэальнасці. У 2007 годзе ён прадказаў землятрусы ў Турцыі, Пакістане, Еўропе, моцны тайфун на Філіпінскіх астравах. Што датычыцца гэтага года, адна з японскіх газет паведаміла, што паводле прадказанняў Цісэліну, 13 верасня ў адной з буйных азіяцкіх краін адбудзецца моцны землятрус і цунамі, ад якіх пацерпяць мільёны людзей.

Наколькі слушны гэты прагноз? Ці варта беларусам у бліжэйшы час чакаць сур'ёзных непрыемнасцяў прыроднага і тэхнагеннага характару? Свае меркаванні на гэты конт нам агучыў **астролаг Уладзімір ВАСЮК.**

АНАТОМІЯ КАТАСТРОФ

— Механізм з'яўлення большасці катастроф — як прыродных, так і тэхнагенных — уключае не толькі натуральныя прыродныя фактары, але і ўздзеянне наасферы (згодна з Вернадскім — наасфера гэта сфера розуму), — тлумачыць астролаг. — Катастрофы на нашай планеце здараліся і раней. Напрыклад, пасля адной з самых глабальных (у выніку сутыкнення з метэарытам) на Зямлі цалкам вымерлі дыназаўры і 80 працэнтаў жывёльнага свету. Прыродныя катастрофы адбываліся ва ўсе часы, аднак менавіта ў апошнія сто гадоў іх колькасць значна павялічылася. Гэта вынік «разумнай» дзейнасці чалавека. Мы назіраем прамую залежнасць: чым хутчэй развіваецца наш тэхнічны прагрэс — тым часцей здараюцца катастрофы.

Паводле слоў Уладзіміра, тлумачэнне гэтаму простае: энергія думкі, энергія жыцця асобна ўзятага homo sapiens — гэта малая велічыня. А вось калі разглядаць чалавецтва ў цэлым, як утваральны элемент наасферы, — гэтая сукупная энергія каласальная. Яна здольная ператвараць і зямную кару, і жывую прыроду.

Зямля, як планета, разам з Сонечнай сістэмай рухаецца вакол цэнтра нашай галактыкі. Пры гэтым на сваім шляху яна сустракае самыя розныя віды энергій (у старажытных тэкстах іх называлі «касмічным агнём»). Такім чынам, чалавечая думка (наасфера) узаемадзейнічае не толькі з энергіямі самой планеты, але і з «касмічным агнём». Якім дакладна (негатыўным ці пазітыўным) будзе гэтае ўзаемадзеянне, залежыць ад стану наасферы. А дакладней — ад якасці думкі асобнага чалавека і чалавецтва ў цэлым. Чым ярчэй яна афарбавана ў змрочныя колеры, тым больш разбуральным будзе памянёнае ўзаемадзеянне. Мы

МЫ «ЗАПУСКАЕМ» КАТАСТРОФЫ ШТОДЗЁННА — СВАІМ НЕГАТЫЎНЫМ НАСТРОЕМ, РАЗДРАЖНЕННЕМ, НЕЗАДАВОЛЕНАСЦЮ ЖЫЦЦЁМ.

«запускаем» катастрофы штодзённа — сваім негатыўным настроем, раздражненнем, незадаволенасцю жыццём.

— Наша цывілізацыя прагрэсуе ў галіне навуковых і тэхнічных дасягненняў, — працягвае Уладзімір, — аднак не развіваецца ў духоўным плане. Жыццё цела паляпшаецца, а духоўная кампанента значна адстае. Успрыманне чалавекам тонкіх духоўных энергій ускладняецца, у выніку атрымліваецца дысбаланс. У ідэале высокі ўзровень матэрыяльнай культуры павінен дапаўняцца адпаведным развіццём духоўнага пачатку ў чалавеку. А з-за перакосу ў бок матэрыяльнасці, з-за негатоўнасці чалавецтва ўспрымаць больш тонкія духоўныя энергіі ўзрастае УНУТРАНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НАПРУЖАННЯ (яго можна параўнаць з напружаннем у электрычнай сетцы). У дачыненні да аднаго чалавека гэта нязначная велічыня, а для сукупнасці 5—6 мільярдаў — вялізная. Патэнцыял унутранага напружання ў адных людзей узмацняе імкненне да «высокага» полюса (па аналогіі з батарэйкай да «плюса»), а ў іншых — абвастрае адчуванне безвыходнасці і марнасці існавання. Такія людзі цягнуцца да «мінуса».

Энергія ўнутранага напружання ўздзейнічае на наасферу, а яна ў сваю чаргу ўплывае на энергію жыцця планеты, што выліваецца ў тым ліку і ў катастрофы: неўраджаі, штормы, землятрусы, цунамі. Мы самі ініцыюем прыродныя катаклізмы.

— Калі такая сітуацыя будзе захоўвацца надалей, то гэта можа прывесці да глабальных катастрафічных наступстваў, — папярэдзіў суразмоўца. — Між іншым, па гэтай жа прычыне ў свой час загінула Атлантыда. Атланты імкнуліся з дапамогай тонкіх энергій кіраваць прыроднымі стыхіямі. Аднак у іх грамадстве таксама склаўся адмоўны патэнцыял унутранага напружання, што і абумовіла катастрофу, у выніку якой цывілізацыя перастала існаваць.

ЭНЕРГІЯ ЎНУТРАНАГА НАПРУЖАННЯ ЎЗДЗЕЙНІЧАЕ НА НААСФЕРУ, А ЯНА Ў СВАЮ ЧАРГУ ЎПЛЫВАЕ НА ЭНЕРГІЮ ЖЫЦЦЯ ПЛАНЕТЫ, ШТО І ВЫЛІВАЕЦЦА Ў КАТАСТРОФЫ: НЕЎРАДЖАІ, ШТОРМЫ, ЗЕМЛЯТРУСЫ, ЦУНАМІ. МЫ САМІ ІНІЦЫЮЕМ ПРЫРОДНЫЯ КАТАКЛІЗМЫ.

БАЛЮЧЫЯ КРОПКІ

Энергія нікуды не знікае — гэта адзін з асноўных касмічных законаў. Адмоўны патэнцыял унутранага напружання, які мы ўсе разам фарміруем, таксама павінен дзесьці праявіцца, увасобіцца ў канкрэтных падзеях. Як правіла, гэта здараецца ў КРОПКАХ НАЙМЕНШАГА СУПРАЦІЎЛЕННЯ. Такія геаграфічныя месцы дапамагае вызначыць астралогія.

— Звычайна праявы негатыўнай энергіі звязаны з зацыкленнямі, пэўным размяшчэннем нябесных целаў адносна адно аднаго, — тлумачыць Уладзімір ВАСЮК. — Зацыкленні вызначаюць канкрэтныя перыяды, калі рызыка здарэння катастроф максімальная. Што датычыцца 13 верасня, думаю, што прагноз Цісэліну можа спраўдзіцца, толькі я абазначыў бы час вераднога прыроднага бедства больш дакладна — гэта вечар 12-га (на 12 верасня 21 гадзіну 35 хвілін па Грынвічу прыпадзе кропка найменшага супрацiўлення). Можа пацярпець востраў Суматра, Тайвань, Інданэзія. Можа адбыцца падводны землятрус, які выклікае моцнае цунамі. Хоць я не думаю, што ахвяры будуць настолькі маштабнымі, як прарочыць Цісэліну. Гэты рэгіён чакаюць сур'ёзныя палітычныя патрасенні. Там адбудуцца падзеі, якія праз 2 дзесяцігоддзі прывядуць да эканамічнага заняпаду і галечы. У першую чаргу гэта датычыцца Тайваня, дзе існуе высокая верагоднасць дзяржаўнага перавароту.

У гэты ж час верагодна сур'ёзная аварыя на хімічным зводзе на поўначы Індыі, высокі скачок цэнаў на нафту на сусветным рынку, трэці этап грузіна-асяцінскага канфлікту.

Беларусі да канца года можна не хвалявацца наконт значных прыродных і тэхнагенных катастроф. Тым не менш Уладзімір ВАСЮК адзначыў, што ў кожнай краіне ёсць зоны павышанай рызыкі, дзе людзям трэба быць асабліва пільнымі і ўважлівымі. У Беларусі ў верасні гэта Салігорск, Мазыр і наваколле Бабруйска.

Калі зазірнуць крыху далей, на бліжэйшыя 100 гадоў, то самымі напружанымі і небяспечнымі, паводле прагнозаў астролага, будуць перыяды з 2018 па 2021 год, з 2060-а па 2062-і і з 2079-а па 2083-і. Гэта час, калі верагодныя вялікія войны, геапалітычныя працістаянні, прыродныя і тэхнагенныя катастрофы. У любым выпадку твар сучаснага свету будзе радыкальна змяняцца.

УСЁ Ў НАШЫХ РУКАХ

Калі мы самі правакуем катастрофы, то лагічным было б меркаваць, што мы можам і прадухіліць іх.

— Сапраўды, — пагадзіўся астролаг, — усё ў нашых руках. Каб мінімізаваць выплескі негатыўнай энергіі, якія праяўляюцца ў выглядзе катаклізмаў, людзям трэба змяняць мысленне, свядомасць, сваё стаўленне да навакольнага свету. Трэба перастаць успрымаць чалавека як цара прыроды і адчуць сябе нарэшце арганічнай часткай космасу. Неабходна вучыцца мысліць пазітыўна і ўсведамляць сваю непасрэдную адказнасць за ўсё, што адбываецца ў свеце.

Інга МІНДАЛЁВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.27	19.47	13.20
Віцебск —	6.15	19.39	13.24
Магілёў —	6.17	19.38	13.21
Гомель —	6.16	19.32	13.16
Гродна —	6.42	20.02	13.20
Брэст —	6.45	20.01	13.16

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Арсенія, Георгія, Пятра.*
К. *Беаты, Яўгеніі, Захара, Германа, Магнуса, Міхала, Яўгена.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА +28..+30°С	КІЕЎ +30..+32°С	РЫГА +22..+24°С
ВІЛЬНЮС +27..+29°С	МАСКВА +25..+27°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°С

Дзве даты

6 верасня

1753 год — нарадзіўся (г.п. Мір Карэліцкага раёна) Саламон Маймон, беларускі філосаф-асветнік. З 1777 года жыў у Германіі, дзе вывучаў філасофію, медыцыну, фізіку, матэматыку. Галоўная яго праца — «Вопыт трансцэндэнтальнай філасофіі», якая атрымала высокую ацэнку нямецкага філосафа І. Канта. Вучоны даследаваў тэарэтычныя праблемы логікі, этыкі, эстэтыкі, выступаў за рэфармаванне тагачасных дзяржаўных інстытутаў на прынцыпах свабоды, гуманізму і справядлівасці.



1522 год — 17 членаў экспедыцыі Ф. Магелана, якія засталіся жывымі, завяршылі першае кругасветнае падарожжа.

Цытата дня:

«Жанчыны любяць нас за нашы недахопы. Калі гэтых недахопаў вялікая колькасць, яны гатовы ўсё нам дараваць. Нават адсутнасць розуму».
Оскар Уайльд (1854—1900), англійскі пісьменнік.

Віншуем любую ўнучку **Кацю ПРОНЬКІНУ** з Калінкавічаў з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, шчасця і радасці ў жыцці, поспехаў у вучобе і надзейных сяброў.

Бабуля Аня, дзед Уладзімір, *в. Меляшковічы.*

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (30 жніўня). Па гарызанталі: Рэтраград. Спрыт. Гало. Урок. Стог. Ком. Тура. Вага. Туш. Тонік. Крама. Мат. Кош. Дула. Алей. Вал. Лінкор. Амега. Асілак. Улан. Паркан. Нота. Рада. Громаў. Сыр. Ігрэк. Ара. Матэматыка. **Па вертыкалі:** Шахматы. Адвал. Тракт. Амар. Лена. Такт. Даліна. Трумо. Лапа. Рыса. Шашкі. Сорам. Плуг. Нарды. Эра. Тэрор. Рокат. Ода. Тук. Ранг. Лато. Даміно. Консул. Лом. Легата. Паром. Край. Каўбойка.

Сканворд (2 верасня). Па гарызанталі: Серпанцін. Груда. Атака. Кораб. Марал. «Алеся». «Амок». Арбалет. Легата. Азан. Шапка. Гранка. Трапак. Кіт. Сага. Кашара. Ірад. Шаша. Мак. Каркас. Ягада. Апорт. Кап. Аверс. Авары. Амялушка. **Па вертыкалі:** Прасёлак. Студыя. Кобра. Асіна. Папар. Ролік. Агама. Аркада. Абат. Какава. Нерат. Пава. Алея. Опера. Індык. Рым. Амяла. Кактус. Ярка. Драга. Шар. Амазонка. Слота. Кірха. Кантата. Сцежка.

Сканворд (4 верасня). Па гарызанталі: Чардаш. Іронія. Асот. Збан. Вал. Каша. Ата. Рука. Яўка. Лак. Квант. Грамада. Паз. Шыла. Атол. Трэк. Бал. Трава. Тарнада. Сыгр. Рангун. Іран. Пуд. Грант. Сага. Абібок. Рагу. Метр. Бегемот. **Па вертыкалі:** Насарог. Іртыш. Уклад. Эрг. Карп. Лапа. Узда. Асада. Бард. Штаб. Казна. Спірт. Сава. Лунка. Бар. Ікона. Грог. Леў. Туга. Куб. Чан. Факс. Шарнір. Апатыт. Ара. Лондан. Жырафа. Трал. Антрацыт.

Усміхнёмся!

Каб ігральныя карты падабаліся і мужчынам і жанчынам, іх сталі выпускаць з голымі футбалістамі.

☺

Мужык прыходзіць да стаматолага:

— Доктар, мне здаецца, што я матылёк.

— Вам не да мяне, а да псіхіятра.

— Ды ведаю.

— Дык чаму вы да мяне прыйшлі?

— А ў вас святло гарэла.

☺

Сабраліся неяк крывасмокі, ваўкалакі і вампіры на могілках, пачалі спрачацца аб тым, хто лепш за ўсіх кроў п'е. Пастаялі паўгадзіны, паспрачаліся ды і разбегліся — камары даталі...

☺

Як захаваць сямейную ідылію:

— адвярніцеся ад тэлевізара;

— паслухайце, што яна кажа;

— паўтарыце апошнюю фразу;

— скажыце, што ў гэтым ёсць рацыянальнае зерне;

— павярніцеся да тэлевізара.

☺

Вучонымі-жанчынамі даказана, што 70 працэнтаў мужчын — сволачы, 20 — казлы і 40 — вычварэнцы. Ну, з лічбамі дзесьці наблытана, а так усё дакладна.

☺

— Пятро, ты пасля паўлітра працаваць зможаш?

— Змагу.

— А пасля літра?

— Змагу.

— А пасля двух?

— Працаваць не змагу, але буду кіраваць!

ПАНЯДЗЕЛАК

Адным з самых складаных для разумення сваёй сэнсавай нагрузкі дзён тыдня быў і застаецца ***панядзелак***. Сярод культуролагаў і гісторыкаў культуры існуюць розныя погляды на пытанне аб пачатку адліку дзён тыдня ў той адзінцы часу, якая завецца тыднем. У адным выпадку панядзелак лічыцца першым днём, г.зн. пачатковым момантам новага тыдня. З другога боку, гэты дзень успрымаецца другім днём тыдня. Аднак у любым выпадку — першы ён на тыдні ці першы пасля нядзелі — за ім устойліва замацавалася характарыстыка цяжкага, нядобрага, няўдалага дня.

● Магчыма, за вызначальнай роляй панядзелка як дня, які будуемадэлюе жыццё чалавека ці сям'і на бліжэйшы тыдзень, тоіцца той яго лёс, які сканцэнтраваны ва ўстоўлівым словазлучэнні «З панядзелка на ўвесь тыдзень — шчасце або няшчасце».

Негатыўнае стаўленне да гэтага дня з'явілася падставай для цэлага шэрагу забаронаў, якія датычацца гаспадарчай дзейнасці чалавека, яго паводзінаў у сям'і і дома:

● У панядзелак ніколі не пачыналі важныя, адказныя справы (пераход на новае месца працы, куплю-продаж і г.д.).

● Каб заўсёды быць з грашамі, стараліся не пазычаць іх у першы дзень тыдня: *«У панядзелак грошы пазычаць — увесь тыдзень трата».*

● Народныя лекары і знахары не раілі ў панядзелак класціся ў бальніцу, гаварылі, што тады хвароба можа працягнуцца доўгі час.

● Вельмі ўважлівай у панядзелак неабходна быць цяжарнай жанчыне. Ёй не раілі ў гэты дзень працаваць і мець фізічныя зносіны з мужам.

● Нашы продкі лічылі, што ноч паміж двума мужчынскімі днямі (панядзелак — аўторак) можа быць спрыяльнай для зачацця хлопчыка.

● Па тых самых меркаваннях у гэты дзень не саджалі пятушку на яйкі. Вопыт паказваў — вылупляцца адны пеўнікі.

● У панядзелак ніколі не сеялі лён, не садзілі капусту — з іх не будзе нічога ладнага.

● Аднак у сувязі з тым, што панядзелак — мужчынскі дзень, на маладзіку можна квасіць капусту.

● *«У панядзелак работы не пачынай і ў дарогу не выязджай», «У панядзелак нават цыган у дарогу не збіраецца»* — красамоўныя прыказкі, якія забаранялі выпраўляцца ў далёкі шлях менавіта ў панядзелак.

● **Гэты дзень лічыцца няўдалым для нараджэння чалавека, бо яго на жыцці будуць суправаджаць толькі гора з нястачай. Людзям, народжаным у панядзелак, цяжка даюцца вялікія справы, нягледзячы на тое, што характар у іх звычайна вельмі рашучы і ўпарты. Амаль што ўсё ў іх жыцці залежыць ад настрою. Калі такому чалавеку вы паспрабуеце «пачытаць мараль», то сустрэнецеся з непрааддольнай сцяной, а ў крайніх выпадках набудзеце сабе ворага. Народжаныя ў панядзелак любяць шмат размаўляць, але больш за ўсё любяць, каб іх слухалі і час ад часу хвалілі. Яны ніколі не пазычаюць нікому грошы, а на свае запазычанасці хутка забываюцца. Заўсёды заўважаюць слабыя бакі іншых людзей, аб чым не прамінуць іранічна сказаць пры вялікай колькасці народу. Народжаныя ў панядзелак ядуць шмат мяса, любяць кветкі. Тыя з іх, хто нарадзіўся бліжэй да вечара, — натуры больш мяккія і душэўныя.**

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ЦЯЛЬЦАМ ЧАС ЗМЯНІЦЬ ІМІДЖ, А ДЗЕВАМ АДМОВІЦЦА АД АМБІЦЫЙ

♈ ВАЕН. Прафесійная галіна запатрабуе пільнай увагі і непасрэднага ўдзелу. Дзеля таго, каб утрымліваць кантроль сітуацыі, вам спатрэбіцца развязлівасць і ўменне выконваць работу ў вызначаны тэрмін. У панядзелак пастараецеся ні з кім не сварыцца. Аўторак — спрыяльны дзень для максімальнай актыўнасці і рашучых дзеянняў.

♉ ЦЯЛЕЦ. Дзелавыя адносіны, якія складваліся нядрэнна, нечакана могуць перайсці ў іншую плоскасць. Асцерагайцеся службовых раманаў: яны могуць загубіць кар'еру. Не выключана, што вам давядзецца пачынаць наноў. Пажадана перагледзець свой стыль паводзінаў, магчыма — змяніць імідж. Панядзелак — адзін з самых плённых дзён тыдня, калі можна зрабіць значна больш, чым запланавана.

♊ БЛІЗНЯТЫ. На рабоце ўсё складваецца ўдала, у многіх справах вас чакае поспех і адчуванне асабістай незаменнасці. Важна правільна спланаваць справы на гэты тыдзень, каб не перарасходаваць сілы. Адчуўшы прыліў энергіі, не варта хапацца за некалькі спраў адразу — лепш спыніцца на чымсьці адным, найбольш значным для вас.

♋ РАК. Будзьце больш уважлівымі да цікавых супадзенняў і дробных дэталяў, бо менавіта ў іх і будуць утрымлівацца адказы на ўсе вашы пытанні. Панядзелак спрыяльны для атрымання тайных ведаў. У гэты дзень непажадана глядзецца ў люстэрка. Серада — дзень, поўны ілюзій: адкладзіце прынята важныя рашэнні. Другая палова тыдня спрыяльная для пачатку рамонту ці іншых сур'ёзных перамен у вашым доме.

♌ ЛЕЎ. У пачатку тыдня да вас можа падкрасціся работа: яна захопіць вас у палон, і вы трапіце ў вір першачарговых неадкладных спраў. Напружаны рытм тыдня можа паўплываць на працаздольнасць, а калі да абавязацельстваў, якія існуюць, дададуцца новыя, будзе цяжка з гэтым справіцца. У аўторак не ўцягвайцеся ў інтрыгі — гэта не дадасць душэўнай раўнавагі.

♍ ДЗЕВА. Сумленнай працай вы справядліва заваюеце ўвагу навакольных. Аўторак не лепшы дзень для прыняцця адказных рашэнняў, але спрыяльны для творчай працы. У серады вас могуць падтрымаць аднадумцы і начальства, з'явіцца магчымасць паказаць свае здольнасці. У пятніцу адмоўцеся ад асабістых амбіцый — гэта дазволіць захаваць час, сілы і нервы. Нядзелю лепш правесці дома, займаючыся бытавымі дробязямі.

♎ ШАЛІ. Фартуна на вашым баку і вы можаце спраўдзіць практычна з любой праблемай. Удача будзе спадарожнічаць у пачынаннях, якія звязаны з творчасцю. Папоўніце кола зносінаў прыемнымі і карыснымі для вас людзьмі. Перш чым прыняць сур'ёзнае рашэнне, пастарайцеся ўсё добра абдумаць. Панядзелак паспяховы для новых спраў і пачынанняў. У серады праявіце асцярожнасць і ўважлівасць.

♏ СКАРПІЁН. Праявяцца вашы рознабаковыя таленты: аднолькава добра будуць удавацца як бытавыя, так і прафесійныя справы. Пастарайцеся не забывацца пра некаторыя правілы і праявіце рашучасць у пераадольванні цяжкасцяў. Парадуйце блізкіх — іх удзячнасць будзе спрыяць вашаму добраму настрою. У пятніцу адкладзіце дробныя справы, якія раздражняюць, і займіцеся рашэннем больш важных праблем.

♐ СТРАЛЕЦ. Пажадана не займацца капаннем у сабе, каб ў выніку не зведаць пачуцця расчаравання вынікам. Серада — адзін з самых паспяховых дзён тыдня, калі ведаеце, чаго хочаце дабіцца. Для дасягнення максімальнай паспяховасці спатрэбяцца такія якасці, як засяроджанасць і ўпэўненасць у асабістых сілах. У чацвер лепш не пачынаць нічога новага, а ўсе важныя справы і сустрэчы перанесці на пятніцу.

♑ КАЗЯРОГ. Давядзецца адстойваць свой аўтарытэт і, магчыма, нават пацвярджаць кампетэнтнасць у пытаннях работы. У панядзелак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У аўторак можа парадаваць цікавая інфармацыя. Не адцягвайце ўвагі, рабіце сваю справу і дайце магчымасць іншым займацца сваімі пытаннямі. Зараз неабходна працаваць на бліжэйшую будучыню, рэалізацыю і засцвярджэнне новых ідэй і планаў.

♒ ВАДАЛЕЙ. З'явіцца магчымасць зрабіць многа добрых спраў і дабіцца значных поспехаў на рабоце, але гэта не нагода для зазнайства. Пры жаданні і засяроджанасці на галоўных пытаннях зможаце дасягнуць добрых вынікаў і рэалізаваць практычна ўсё, што намецілі. Самым неэфектыўным днём можа стаць панядзелак — не варта пачынаць нічога новага і пажадана захоўваць асцярожнасць ва ўсім.

♓ РЫБЫ. Нечаканыя сустрэчы і дзіўныя выпадкі пройдуць як у калейдаскопе і наўрад ці дадуць вам засумаваць. Лавіце ўдачу: выкарыстайце гэты час не толькі для забаў, але і па справе. Можаце пачуць нямала камплiментаў — многія будуць упэўнівацъ вас у тым, што вы — надзвычайная асоба. Вам па сілах арганізацыя цікавага і незвычайнага мерапрыемства. Не шкадуйце часу на стасункі і перамяшчэнні — усё будзе складвацца цудоўна.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі. Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 4882. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12